ТРЫШЧАН
TRISTAN
Białoruski romans rycerski z XVI wieku

Пераклад са старабеларускай мовы Алеся Бразгунова

Tłumaczenie ze starobiałoruskiego na „współczesny” białoruski
Aleś Brazgunow

ПАЧЫНАЕЦЦА АПОВЕСЦЬ З КНІГ СЕРБСКІХ ПРА РЫЦАРАЎ, А МЕНАВІТА: ПРА СЛАЎНАГА РЫЦАРА ТРЫШЧАНА, ПРА АНЦАЛОТА І ПРА БАВУ, І ПРА ІНШЫХ МНОГІХ ГОДНЫХ РЫЦАРАЎ

Жыў кароль па імені Клеўдас. Меў ён вялікую любоў да караля Апалона, і праз гэтую вялікую прыязнасць паміж сабою гасцявалі яны, бывала, падоўгу адзін у аднаго, прыязджаючы з усімі слугамі і двaром. Аднаго разу прыехаў кароль Апалон з усім двaром да караля Клеўдаса, і жыў у яго каля году. І была ў караля Апалона каралева, вельмі прыгожая жанчына.

А сын караля Клеўдаса быў вельмі добры юнак і годны рыцар. І моцна пакахаў ён каралеву, Апалонаву жонку, і не мог ужо трываць болей, і прызнаўся ёй у моцным сваім каханні. Каралева ж не магла на тое згадзіцца, і мовіла: “Як табе не сорамна казаць мне пра гэта?”

Зразумеўшы, што свайго не даб’ецца, вырашыў хлапец пачакаць, пакуль паедзе кароль Апалон ад караля Клеўдаса ў сваё каралеўства. А як надышоў той час, узяў сабе Клеўдасаў сын у таварыства годных юнакоў і, падрыхтаваўшыся належным чынам, прытаіліся яны пры дарозе, што ішла праз дуброву. Калі ж пад’ехаў кароль Апалон да таго месца, дзе яны чакалі напагатове, то напалі на караля і цяжка яго паранілі ды перабілі ўсю ягоную дружыну. Праз тыя раны не мог кароль Апалон быць жывы, і так мовіў сваёй каралеве: “Як і казаў я табе заўчора, так і сталася – прыйшла па мяне гэтая лютая смерць”. Каралева ж з вялікага смутку і жалосці мовіла: “Ох, мой Божа! Не ведаю, як тое зло магло стацца!”.

А сын караля Клеўдаса, вярнуўшыся на палац, зайшоўся ў адзін вялікі пакой, куды адвялі каралеву, прагнучы здзейсніць з ёю сваё хаценне. Каралева ж бачыла, як шмат ён прычыніў ёй шкоды, і сказала: “О ліхі, злы чалавеча! Мой гаспадар прыехаў да твайго двара дзеля твае добрае славы, а ты прычыніў яму смерць ды яшчэ й мяне хочаш пасароміць. Але не бываць таму!”. Сказаўшы гэтак, адступілася ад яго каралева і скочыла з акна высачэзнага палаца, і забілася насмерць.

Даведаўшыся пра тое, сказаў юнак: “Я сам праз неабачлівасць сваю загубіў такую чароўную на ўвесь свет каралеву!” І плакаў; і загадаў пахаваць каралеву. Затым паслаў агледзець раны караля Апалона. І паведамілі яму, што кароль не жыцьме; тады загадаў пакінуць караля ў спакоі.

Па смерці караля Апалона загадаў Клеўдасаў сын укінуць ягонае цела ў раку ды ўтапіць. Так і ўчынілі. А быў у караля Апалона хорт, які нідзе і ніколі не пакідаў гаспадара. Рынуўся той хорт плавам за панам сваім у раку, шукаючы яго; а знайшоўшы ў глыбокім віры, схапіў пашчай за руку ды выцягнуў цела зубамі на бераг. Затым, выграбшы яму, паклаў у яе пана свайго і прысыпаў жвірам, каб не ўчуў які звер, і сеў на магіле, цікуючы, што дзеецца навокал.

Аж паехаў у ловы кароль Клеўдас і, ездзячы ўзрэччам, шмат упаляваў рознага звера. Надарылася ж, што вяртаючыся ў горад, праязджаў ён ля таго Апалонавага харта. А той, пачуўшы людзей, пачаў моцна скуголіць. І кароль, убачыўшы харта, паслаў слугаў глянуць, што там такое.

Тыя ж, паехаўшы і зразумеўшы, што да чаго, вярнуліся і мовілі каралю: “Здаецца, там нядаўна пахавалі чалавека: хорт стаіць на магіле і нікуды не зыходзіць”. А кароль быў дужа мудры: паехаў пераканацца на свае вочы. “Гэта хорт караля Апалона, майго найбольшага сябра”,– сказаў кароль і загадаў раскапаць магілу, каб зірнуць на нябожчыка. Бачачы, што гэта напраўду Апалон, моцна заплакаў кароль Клеўдас, усклікаючы:

“Авохці ж мне! Найбольшы мой сябра не жыве! Пахаваю ж яго з пашанай, як належыць такому каралю”.

Плачучы, скочыў Клеўдас з каня, каб самому панесці цела караля Апалона ў горад, што быў неўздалёку. Увабраўшы Апалона ў каралеўскія шаты, паклаў яго Клеўдас у касцёле. А потым, хочучы знайсці забойцу караля Апалона, загадаў паўсюдна абвесціць, што вялікімі дарамі асыпле таго, хто паведаміць нешта пэўнае; калі ж хто, ведаючы, не захоча сказаць праўды, той пазбудзе жыцця.

Па выйсці каралеўскага загаду і кажа Апалонава служанка Клеўдасу: “Васпане кароль, ведаю, якою смерцю памёр кароль Апалон і магу табе ўсё распавесці. Па слове тваім ласкава прашу ў цябе дару”. – “Што ні папросіш, усё атрымаеш”,– паабяцаў кароль. Дзяўчына ж распавяла каралю ўсё па парадку: як сын ягоны закахаўся ў каралеву, жонку Апалона, і не мог без яе жыць; і як стаіўся з таварышамі ў дуброве і забіў мужа яе, караля Апалона; і як усю дружыну Апалонаву перабіў; і як з тугі па мужу наклала каралева на сябе рукі; і што потым сталася – пра ўсё расказала.

“Сын мой і мяне загубіў, і Апалона”,– сказаў на тое Клеўдас. Потымі паслаў кароль па Апалонавага сына і загадаў слугам апекавацца ім, аж дасягне гадоў. А затым паслаў па свайго сына і, як той ужо падыходзіў, зыркнуў на яго ў вялікім гневе і сказаў: “Ліхі чалавеча! Загубіў ты аднаго з самых годных рыцараў і найбольшага сябра майго дому, а мне прычыніў вялікую няславу. То вось жа й табе адплата – адкажы за ўчыненае табою зло”.

Зразумеўшы нядобры намер караля, узмаліўся сын: “Васпане, злітуйся з мяне!”. Ды не ўзрушыўся кароль міласэрнасцю: загадаў раскласці вогнішча і ўкінуць туды свайго сына. А дзяўчына, якая пра ўсё расказала каралю, укленчыўшы, усклікнула: “Васпане кароль! Трымай сваё слова, як мне абяцаўся!” – “Кажы, дзяўчына!” – мовіў кароль. “Прашу ў цябе твайго сына”. – “Ён твой, але спачатку мае прыняць смерць”,– сказаў кароль ды загадаў кінуць сына ў агонь, і той памёр. І кажа тады кароль дзяўчыне: “Цяпер можаш яго забраць і занесці, куды твая воля!” Бачачы тую неміласэрнасць, узяла яго дзяўчына, каб пахаваць.

Спынімся тут і вернемся да таго Апалонавага дзіцяці. Імя яму было Кандыеш, і было яно пад пільнай апекай караля Клеўдаса да таго часу, пакуль не вырасла ў рыцара вялікае годнасці. За сваю адвагу стаў гэты рыцар гаспадаром Карнавалі і Еліонаса, і ўсе перад ім дрыжэлі.

Кароль Клеўдас выдаў за Кандыеша дачку сваю Крэзілу, і жылі яны між сабою ў вялікай любові і ласцы. І нараджалі дзяцей: старэйшы стаў каралём Карнавалі, а малодшы – Еліонаса, астатнія ж рушылі па свеце рыцарскім звычаем. І так былі па краях свету распладзіліся, што і не памяталі, хто з іх каму родны або сваяк.

Карнавальскае каралеўства перайшло да караля Пеліша, а ён меў двух сыноў: аднаго імем Марк, бо нарадзіўся ў месяцы марцы, а другога Пэрлу. Паміраючы, каранаваў кароль Пеліш сына свайго Марка на Карнавальскае каралеўства.

Кароль Марк аддаў сваю сястру Эліабелу за караля Меліядуша, слаўнага ў Еліонасе. Каралева Эліабела была вельмі прыгожая, і жылі кароль з каралевай між сабою ў вялікай любові і вельмі хораша. Хаця і шмат гадоў пражыла з ім каралева, а дзяцей ад караля не мела, аж потым па многіх гадах зачала ва ўлонні сваім. І каралеўства Еліонаскае ўзвесялілася, жадаючы мець нашчадкаў караля Меліядуша.

Аднойчы паехаў кароль Меліядуш з мноствам рыцараў у ловы, і даехаў да ракі, пры якой памёр нейкі славуты рыцар. Сталася так, што прыехала туды і адна дзяўчына, якая шмат гадоў была закаханая ў караля,– кахала яго больш як сябе – і сказала: “Нямала кажуць пра тваю славу. Калі б ты быў ласкавы, прывяла б я цябе ў такое месца, дзе пры вячэры ты ўбачыў бы дзіва, якога даўно не бачыў”. Будучы вельмі годным рыцарам, захацеў кароль пабачыць тое дзіва. “Я завяду цябе туды”,– сказала дзяўчына; а кароль ускочыў на каня і мовіў: “Сядай, я паеду з табой”.

І так ехалі яны да вечара, і ехалі праз дубровы, а потым ноч надышла вельмі ясная. І ўгледзелі яны цудны замак на гары, і выбегла стуль мноства людзей, і з вялікай радасцю прынялі яны ад караля каня і зброю. (А быў гэта горад тае дзяўчыны.) Дзяўчына ж павяла караля ў вельмі прыгожы пакой; і як толькі кароль апынуўся ў спачывальні, перамяніліся сэрца ягонае й розум, бо ён быў дзівосным чынам зачараваны, і не была яму наўме ні ягоная каралева, ні Еліонас, ні каралеўства ягонае, ні слугі – толькі гэтая дзяўчына, якая заманіла яго ў той горад.

Рыцары, бачачы, што караля няма ўжо колькі дзён, выправіліся на пошукі, але не маглі ні знайсці яго, ні вестку пра яго якую займець.

Тады каралева Эліабела, узяўшы з сабою служанку, сама паехала шукаць якое весткі пра караля Меліядуша. І заехалі яны ў вялікія дубровы, і доўга блукалі, шукаючы па ўсіх баках, аж напаткалі Мерліна-прарока.

Мерлін прывітаў каралеву, яна таксама пачэсна адказала яму на прывітанне: “Добры чалавеча! Калі чуў ты што або вестку якую маеш пра майго пана, караля Меліядуша, што згінуў без вестак, – дзеля Бога, скажы, ці жывы ён?” – “Васпані, скажу табе праўду: ён жывы-здаровы і ў такім добрым настроі, што ніколі раней такі вясёлы не бываў. Але ты ўжо яго не пабачыш”. Сказаў тое Мерлін, і знік.

Моцна зажурылася каралева, пачала яна тужыць і плакаць, праклінаючы дзень свайго нараджэння і тую гадзіну, у якую нарадзілася. І каб хто тое пабачыў, – не быў бы настолькі ён жорсткі сэрцам,

каб не заплакаць, на яе гледзячы. Агарнула каралеву туга і, не могучы ехаць далей, ссела яна з каня.

І праз усё тое прыбізіўся час параджэння, і пачала каралева маліць Бога, мовячы: “Госпадзе Божа, адпусці грахі мае і прымі ў ласцы душу маю!” – “Васпані, што з табою?” – спыталася служанка. “Тут ужо мне канец! Толькі б мяне Бог аслабаніў ад вагітнасці, каб магла я спарадзіць. А нада мною няхай станецца воля Яго святое літасці”,– адказала каралева. “Васпані, ці можаш ты ўсесці на каня? Я падмагу табе, і мы паедзем пашукаем дзе агню”,– сказала служанка. “Не быць таму – тут мне канец! Прасі Бога за мяне”,– адказала служанцы каралева. Служанка ж заплакала ўголас, і не ведала ў роспачы, што ўчыніць; і ўсю тую ноч пакутавала праз тое, што ейная пані зносіла моцны боль.

А раніцою на досвітку спарадзіла каралева годнага рыцара; сама ж была ўжо блізкая смерці. І сказала служанцы, якая трымала дзіця: “Дай мне маё дзіця”. І падала ёй. Угледзеўшы такое пекнае дзіця, што ніколі не бачыла на свае вочы, мовіла каралева: “Сыне мой, дужа хацелася мне цябе ўбачыць. І вось гляджу на цябе, з ласкі Божае найпякнейшае дзіця, што раней нідзе і ніколі не бывала народжана жанчынай, ды пекнасць твая нічога добрага мне не варожыць – толькі смерць ад вялікае пакуты, якую пры нараджэнні тваім маю. Прыйшла я маркотная ў гэтае месца і ў смутку цябе спарадзіла, ды гэты смутак мне ў радасць абярнуўся праз тваё нараджэнне. Прыходзіць ужо мне канец. Ты ў смутку нарадзіўся, і няхай імя табе будзе Смутак. Хай бы Пан Бог жыццё тваё на радасць і шчасце змяніў і гэты твой смутак звёў”. Сказаўшы тое, падала каралева дзіця служанцы, а сама аддала Богу душу. Вось так нарадзіўся годны рыцар Трышчан, пра дзівосныя ўчынкі, годнае рыцарства і цудныя справы якога – і як везла яго служанка – хачу я вам распавесці.

Служанка, бачачы пані сваю нежывую, пачала галасіць і драпаць сабе твар, і чутно было яе вельмі далёка. На той голас з’явіліся два рыцары (а былі яны крэўнымі сваякамі караля Меліядуша) і, гледзячы на дзяўчыну і загорнутае ў каралевін плашч дзіця ды саму памерлую каралеву, сказалі: “Калі загінуў кароль Меліядуш і каралева таксама нежывая, заб’ем мы гэтае дзіця ды будзем гаспадарамі Еліонаса”. Пачуўшы тое, падышла да іх дзяўчына ды кажа: “Рыцары, не грашыце перад Богам душою і розумам, не забівайце гэтага дзіцяці! Я ж вам клянуся вераю і душою, што занясу дзіця ў іншую зямлю, адкуль пра яго ніколі й весткі не пачуеце”.

Пакінулі тыя рыцары дзіця на дзяўчыну, паднялі мёртвую каралеву і панеслі яе ў горад. А людзі пачалі пытацца: “Каралева ж была цяжарная, дзе ж падзелася дзіця?” Рыцары ж казалі, што пра дзіця нічога не ведаюць, чым, аднак, не маглі адхрысціцца ад роспытаў.

Аж прыйшоў Мерлін-прарок і сказаў ім: “Вы знайшлі каралеву і дзіця, і хацелі дзіця загубіць, але ж выпрасіла ў вас яго дзяўчына. А тое хацелі вы ўчыніць, каб гэтая зямля перайшла да вас”. І яшчэ сказаў Мерлін: “Панове, я скажу, дзе падзеўся кароль ваш Меліядуш, які забыўся і сам на сябе, і на сваё каралеўства, і на ўсіх вас, слугаў сваіх”. І пачалі людзі прасіць Мерліна: “Просім цябе, прарок, скажы нам, дзе кароль наш Меліядуш!” – “Праз тры дні яго ўбачыце”,– адказаў Мерлін.

Угледзеў тут Мерлін аднаго хлопчыка па імені Гаварнар, які быў з Сулешскага каралеўства: ён, баючыся бацькі і брата, уцёк з дому; хлопчык гэты быў вельмі добры і разумны. “Пане Гаварнару, вазьмі да сябе каралевіча: ахоўвай яго і навучай мудрасці і рыцарству, бо ён мецьме і годнасць і рыцарства, хоць ты, магчыма, і не захочаш ім апекавацца”,– звярнуўся да яго Мерлін. “Не ведаю, хто ты, але з радасцю вазьму хлопчыка ў сваю навуку і апеку. Я з ахвотаю буду яго ахоўваць і як мага ім апекавацца”,– адказаў Гаварнар. “Тады даручаю яго табе”,– прамовіў Мерлін.

Потым рушылі яны разам, і назаўтра прыехалі да ракі, назва якой – Брыкіня. Калі б якая жанчына напілася з тае ракі, – не вынасіла б дзіцяці да патрэбнага часу. Ля ракі стаяў мураваны слуп, на ім здавён-даўна былі высечаныя такія словы: “Пры гэтай вадзе збяруцца тры найвялікшыя рыцары”. Паказаў Мерлін на той надпіс і спытаўся ў Гаварнара: “Што гэта?” – “Я прачытаў надпіс, але што гэта за рыцары, не ведаю”,– адказаў Гаварнар. Мовіў тады Мерлін: “Гэта найвялікшыя ў свеце рыцары Галец, Анцалот і Трышчан, якія будуць высокія сваёй адвагай і рыцарствам, бо спазнае свет іх вялікую годнасць і вялікія справы. Адзін з іх будзе каралевічам усяго каралеўства. Ды сцеражыся, каб не загінуў пад тваёй апекай”. – “Пад маёй апекай, дакуль змагу, не загіне”,– сказаў Гаварнар.

Потым паехаў Мерлін адтуль і прыехаў да дзяўчыны, што перахоўвала дзіця, якое ўжо ахрысціла і назвала імем, дадзеным каралевай. “Нясі дзіця ў горад,– загадаў Мерлін дзяўчыне,– бо не гадзіцца яго тут трымаць, а ў горадзе можа знайсці свайго бацьку ”. І панесла дзяўчына дзіця ў Еліонас.

А Мерлін паехаў разам з панамі туды, дзе адна паненка трымала зачараванага караля Меліядуша. Там злавілі яны тую паненку і сказалі: “Мы цябе заб’ем, як не прызнаешся, дзе кароль Меліядуш!” Яна ж усяляк хітравала, каб не аддаваць караля, бо моцна кахала яго – больш, як саму сябе. І дапытваліся ў яе з пагрозамі, і нарэшце сказала: “Хадзем, аддам вам вашага пана, караля Меліядуша”. Усе дужа ўсцешыліся, і з вялікай радасцю прыйшлі ў Еліонас, дзе ўсёй грамадою ўчынілі вялікі пір. Затым прыехала ў Еліонас дзяўчына з дзіцем і аддала тое дзіця каралю, бацьку ягонаму. А кароль быў у вялікай тузе па каралеве, і таму, калі ўбачыў дзіця, усцешыўся, бо думаў, што разам з жонкаю загінула і дзіця.

“Усім нам сёння радасць! – сказалі паны, убачыўшы Трышчана; а потым дадалі пра Мерліна: – Гэты прарок нямала прынёс табе дабра”. – “Тое дабро, што зрабіў для вас, зрабіў я больш для іншых, як для вас. А цяпер кажу вам – апякуйцеся гэтым дзіцем, бо народжана яно на вялікае дабро чалавецтву і на славу гэтаму свету”,– адказаў Мерлін.

Слухаючы, моцна здзівіўся кароль. Потым, адвёўшы Мерліна набок, прасіў яго прызнацца, хто ён. “Табе магу прызнацца, але ты мяне нікому не выдавай”,– прасіў Мерлін. Кароль прысягнуў. Мерлін жа сказаў: “Я – Мерлін-прарок, прыйшоў вызваліць цябе з няволі, у якой, зачараванага, трымала цябе тая паненка. Зрабіў я гэта дзеля цябе, бо люблю твайго сына.” – “Пане Мерліне, скажы ж, што ты прадбачыш наконт майго сына?” – “Між трох рыцараў ён будзе найвялікшы і самы жывучы рыцар. Многія мецьмуць у ім патрэбу. Ты ж не давай яго ў апеку нікому, акрамя Гаварнара з Галіюша – гэта вельмі годны і верны чалавек, ён будзе добра апекавацца Трышчанам”,– адказаў Мерлін. “Хай будзе, як ты хочаш”,– пагадзіўся кароль.

Потым пайшоў Мерлін стуль прэч, і ні на якія просьбы не пажадаў больш там заставацца. Кароль жа пасля ўсяго адправіўся да сына і дзяўчыны. “Ці ўжо дзіця ахрышчанае?” – спытаўся кароль. “Ужо”,– адказала дзяўчына. “Як жа яму імя?” – спытаў кароль. “Пане, завуць яго Трышчан: такое імя дала яму, паміраючы, маці”,– адказала дзяўчына. Тады паклікаў кароль Гаварнара і загадаў: “Вазьмі сына майго на сваё навучанне і беражы яго, і апекуйся ім так верна і мудра, як бы граху не ведаючы. Прыстаў да яго мамку, як тое годна для панскага сына”.

Спынімся тут і распавядзем пра караля Марка Карнавальскага.

Кароль Марк меў малодшага брата па імені Пэрла, годнага рыцара. У той час, калі нарадзіўся Трышчан, з’явіліся ў Карнавалі пасланцы з Арляндэі – патрабаваць даніны, якую павінны былі ім карнавальцы за сем гадоў.

Як паведамілі каралю Марку пра пасланцоў, дужа ён засмуціўся. Зразумеў брат ягоны Пэрла, што кароль спужаўся. А ў гасцёўні было мноства людзей. “Падыдзіце ўсе бліжэй і слухайце,– сказаў Пэрла. – Не бойся, кароль Марк, не давай даніны, збудзься яе з мячом у полі, бо калі памрэш ад мяча,– з гонарам памрэш”. – “Гэтую даніну давалі мы й раней, і цяпер я не магу яе збыцца”,– адказаў кароль. “Як раней па-дурному рабілі, гэтак і ты хочаш рабіць”,– сказаў на тое Пэрла.

Кароль ведаў, што ягоны брат вельмі годны і смелы рыцар, любімы добрымі людзьмі, і задумаў забіць яго, каб не пераняў Пэрла часам улады ды не панаваў потым доўга у Карнавалі.

Выправіліся яны неяк разам у ловы. І стаміліся было, і прыехалі да нейкае ракі. Спачатку напіўся кароль; а калі ўжо і Пэрла нахіліўся, каб напіцца, тады кароль Марк выхапіў меч і з сілай рубануў ім свайму брату па галаве – Пэрла сканаў на месцы.

Па-здрадніцку забіў кароль брата свайго Пэрлу моцным ударам па галаве. Адно сталася, і Мерлін адразу даў ведаць пра тое годнаму рыцару Анцалоту. Потым, ужо пазней, сказаў Анцалот каралю Марку ў вочы: “Ты па-здрадніцку забіў брата свайго, годнага рыцара”.

Спынімся тут і вернемся да Трышчана, якога ўзяў Гаварнар пад апеку ад караля Меліядуша.

Кароль Меліядуш па смерці каралевы Эліабелы доўгі час быў не жаніўся. Потым пабраўся з каралеўнай з Малое Зямлі. Гэтая пані была даволі прыгожай. Калі яна з’явілася пры двары, на той час Трышчану было сем гадоў. І быў ён такі пекны, што не было яму раўні на ўсім свеце, хіба толькі Анцалот.

Быў у Трышчанавай мачыхі сын. Бачачы Трышчанаву прыгажосць і хуткае сталенне, збаялася мачыха, што ён адыме ўладу ў ейнага сына, якому быў адно год. І, надумаўшы, пастанавіла: “Хоць і самой мне памерці, а мушу Трышчана загубіць”. І не магла тое ўчыніць ніякім іншым чынам, як з дапамогай атруты.

Замяшала яна атруту ў пітво ды паставіла ў срэбранай пляшыцы ў галавах ложка. Неўзабаве служанка, што няньчыла каралевіча, увайшла ў спачывальню; а дзіця пачало плакаць. Угледзеўшы ў пляшыцы светлае віно, узяла служанка ды напаіла ім дзіця; а як толькі напаіла, дзіця і сканала.

Бачачы тое, заплакала служанка і загаласіла. Збеглася на той крык мноства людзей, і ўбачылі яны, што дзіця нежывое. “Ты заслужыла смерць, бо загубіла каралевіча!”,– усклікнулі яны. На той шум з’явілася і каралева, ды, бачачы свайго сына нежывога, упала непрытомная. Калі ж прыйшла да памяці, сказала той дзяўчыне: “Ці ж я прычыніла табе якое зло, што ты загубіла майго сына?” – “Не я загубіла яго, а той, хто пакінуў гэтую атруту”,– адказала дзяўчына.

Служанку схапілі і прывялі да караля. А кароль быў у вялікай тузе, і сказаў дзяўчыне: “Ты вінаватая”. – “Вінаваты той, хто прыгатаваў гэтую атруту”,– адказала дзяўчына. “Адпусціце яе – яна тае атруты не гатавала,– мовіў кароль. – Аднак жа хтосьці злы, ненавідзячы гэтае дзіця, учыніў тое”.

Гаварнар жа, які быў вельмі разважны, сказаў: “Пане, ведай: тая атрута была прыгатаваная для цябе або для твайго сына. Цяпер ты павінен быць асцярожны й абачлівы. Трышчана, які пад маёй апекай, пакінь мне – далібог, буду як мага яго апекаваць”. Зразумеў кароль, што тая атрута прыгатаваная для кагосьці з іх, і таму трымаў тайную раду з панамі, якім бы чынам знайсці таго, хто ўчыніў такое. “Вам з Трышчанам трэба быць асцярожнымі”,– параілі яму паны.

Каралева, загубіўшы сваім злым учынкам і неабачлівасцю роднага сына, маркоцілася, і радая была б сама памерці, і думала ў сэрцы

сваім: “Адно ўласнага сына загубіла, а чаго хацела – таго не ўчыніла”. І пачала шчыраваць у сваіх намерах штодня.

А Гаварнар, які быў разважны, штодзень заўважаючы яе пагляды і чуючы размовы, пачаў здагадвацца, што яна шукае смерці Трышчану і што для яго рыхтавала тую атруту. І сказаў тады Гаварнар Трышчану: “Калі пазбягацьмеш мачыхі, то прычакаеш смерці. Таму шануй яе і дагаджай ёй, але асцерагайся піць і есці з ейных рук. Толькі тое, што я давацьму – тое еж і пі”. – “Я выканаю ўсе твае прыказанні”,– адказаў яму Трышчан.

І было неяк улетку: сядзеў кароль у спачывальні ў адзіноце, і захацелася яму піць. У гэты час зайшоўся да яго Трышчан. “Сыне, прынясі мне папіць”,– папрасіў яго кароль. Той расчыніў шафу, у якой знаходзіліся добрыя напоі, і знайшоў там кубак чыстае атруты ды, узяўшы яго, паднёс каралю. Аж тут зайшла да караля каралева. Убачыла яна ў каралеўскай руцэ кубак і ўскрыкнула: “Пане, дзеля Бога, не пі гэтага пітва!” – “Пані, што ж тут?” – спытаўся кароль. Яна ж не наважылася яму прызнацца, што гэта атрута, і сказала: “Не добра табе гэтага піць”. – “Навошта ж ты гэта захоўваеш?” – пацікавіўся кароль. Тая змоўкла, а кароль доўга разважаў і гневаўся.

Тут падышоў Трышчан і з вялікай пакорай укленчыў перад каралём, просячы ў яго аднае ласкі. Кароль любіў Трышчана больш, як самога сябе, але нават і не думаў, што Трышчан прасіцьме за каралеву, таму адказаў: “Не прасі, а вазьмі сам; нічога табе мною не забаронена”.

Пачуўшы такі адказ, Трышчан вельмі ўдзячна і пакорліва падзякаваў бацьку і мовіў: “Пане, ты аддаў у мае рукі жыццё каралевы. Пакорліва цябе прашу – забудзься пра гнеў, што трымаеш на яе. Не хацеў бы я ўбачыць, як паміраць мая мачыха і пані праз тое, што сталася”. Кароль быў вельмі мудры, але ні ад каго не зведаў ён здрады, толькі ад каралевы, таму і не хацеў ёй прабачаць. “Сыне, хто цябе гэтаму навучыў?” – спытаўся ён у Трышчана. “Бог сведка – ні з кім я не раіўся. Але справядлівасць і сама натура мая прывялі мяне да таго: не да твару мне, каб загінула пані мая, калі я магу захаваць ёй жыццё”,– адказаў Трышчан.

Тады загадаў кароль жонцы: “Адпі з гэтага кубка!” – “Не буду!”– адмовіла тая. “Ты прымеш смерць за тое, што хацела загубіць Трышчана або мяне,– прамовіў кароль. – Кажы хутчэй, для каго прыгатавала гэту атруту!“ – “Не для цябе”,– адказала каралева. “То для каго ж? – спытаў кароль. – Ты годная пагібелі!” Каралева ж кінулася ў плач: “Кароль, дзеля Бога, будзь літасцівы да мяне!” – “Кажы хутчэй! – прыкрыкнуў кароль і схапіўся за меч. – Кажы, бо цяпер жа памрэш!” Зразумеўшы, што сапраўды можа памерці, прызналася каралева: “Я прыгатавала гэта для Трышчана”. – “Прысягаю: ты сама прыгатавала сабе смерць, бо Трышчан ні ў чым перад табою не вінаваты! ”– мовіў на тое кароль і загадаў кінуць каралеву ў вязніцу. Потым склікаў ён паноў, паклаў перад імі тую пляшыцу ды мовіў: “Прысягаю: як не пажадаеце судзіць па праўдзе, то прымеце смерць”. – “Яна заслугоўвае смерці, а інакш і быць не можа, бо хацела загубіць твайго сына”,– пагадзіліся паны. “Я датрымаюся вашага прысуду”,– запэўніў іх кароль. Як дачуліся пані пра той прысуд, пачалі ўголас плакаць і шкадаваць, што іхняя каралева памрэ, але ўголас не казалі нічога.

“Сыне мой Трышчане,– сказаў кароль,– ты зычыў ёй толькі дабро, яна ж табе – зло і здраду, ды хацела цябе загубіць. А сталася з ёю горш, чым яна заслужыла. Хай будзе так, як хочаш ты – няхай будзе вызваленая табою”. Трышчан пакорліва падзякаваў бацьку за тое і збавіў мачыху ад смерці. І хвалілі ў Еліонасе Трышчана ўсе добрыя людзі. “Калі Трышчан пасталее – і тады не страціць ён сваёй вялікае годнасці”,– казалі яны.

Каралева засталася жыць у каралеўскіх пакоях, але кароль больш яе не кахаў, толькі ненавідзеў усім сэрцам сваім.

Затым, па нейкім часе, паехаў кароль Меліядуш з годнай дружынаю ў ловы. А з ім, каб вучыцца ловам, паехалі і Трышчан з Гаварнарам. І як ехалі яны дуброваю, з’явіліся раптам два рыцары пры зброі і ў панцырах ды запыталіся: “Хто тут кароль?” – “Вось кароль з сынам”,– адказаў адзін з паноў. “Што гэта ты кажаш! – запярэчыў Гаварнар. – Няма тут каралеўскага сына – кароль пакінуў яго дома”. Тады пад’ехалі тыя рыцары бліжэй і сказалі каралю: “Ты асабіста не ўчыніў нам нічога злога, але хтосьці з твайго двара пагражае нам пагібеллю; таму, як зможам, мы загубім яго”.

Тут выхапілі яны мячы, і ніхто з паноў не паспеў абараніць караля ад смяротнае раны ў галаву. Абодвух тых рыцараў забілі следам (а яны былі з племені князя з Нората, якое было большае за карнавальскае). “Вы загінеце ад людзей з двара караля Меліядуша”,– сказала ім аднойчы нейкая варажбітка. Наконт гэтае справы мелі яны раду з каралём Маркам, бо той баяўся Трышчана: мог, пасталеўшы, выгнаць яго з каралеўскага пасаду, як было прадказала варажбітка. Прадказала яна таксама, што станецца потым: калі Трышчан дасягнуў патрэбнага веку, прыйшоў ён з дружынаю і забіў князя з Нората, і вынішчыў горад ягоны так, што каменя на камені не пакінуў.

Як убачылі баяры караля Меліядуша нежывога, то й не ведалі, што ім рабіць. “Ніводны гаспадар не ахоўваецца так блага, як наш”,– казалі паміж сабою. Трышчан таксама моцна плакаў з усімі сваімі людзьмі. І паклалі насілкі на два кані, і павезлі караля. А як былі ўжо пад горадам, учынілі месцічы вялікае галашэнне і жалобу па каралю; і пахавалі Меліядуша пачэсна, як і належыць такому вялікаму пану.

Калі пра тое даведаўся кароль Марк, упаў ён у вялікі роздум. І прыйшоў да яго адзін юнак, які

дзякуючы Мерліну ведаў больш за іншых людзей: ён ведаў пра ўсе, што мае стацца, і таму кароль любіў яго больш, чым каго. “Сам падумай,– мовіў ён каралю,– твой сястрынец Трышчан хоча прычыніць табе вялікую крыўду”. – “Як жа можа стацца, каб Трышчану ўдалося стаць такім рыцарам?” – здзівіўся кароль. “Мае так стацца, што не будзе на свеце рыцара, большага за яго”,– адказаў юнак каралю, і той прыціх.

Гаварнар, які быў вельмі разважны, заўважаў, што мачыха і надалей ненавідзіць Трышчана, бо хоча, каб гэтая зямля дасталася ёй, і, адвёўшы набок, сказаў яму: “Мой любы сябра і сыне, люта ненавідзіць цябе твая мачыха і хоча загубіць. Выпраўляймася ўпотай у Францыю, да караля Перамонта,– там навучышся адвазе і станеш знакамітым чалавекам. А калі кожны ўбачыць тваю годнасць, станеш рыцарам: тады зможаш вярнуцца на сваю бацькаўшчыну, у Еліёнас, і ніхто ўжо не пасмее сказаць табе што-кольвек насуперак”. – “Настаўнік мой, куды загадаеш, туды й паеду, бо ні ў адным чалавеку не бачу такой прыязнасці, як у табе”,– пагадзіўся Трышчан. “Падрыхтуймася ж ды едзьма заўтра на світанні”. Гэтак дамовіліся яны з Трышчанам.

Падрыхтаваўшыся належным чынам ды узяўшы з сабой дастаткова золата і срэбра, выправіліся яны ў прызначаны дзень у Францыю, да караля Перамонта. Гаварнар загадаў Трышчану не адкрывацца, хто ён і адкуль. “З радасцю паслухаюся цябе”,– пагадзіўся Трышчан. А як прыехалі да караля Перамонта, прывеціў яго кароль ласкава і загадаў адвесці яму харошы пакой.

Трышчан рос і харашэў. А ўжо праз пару дзён – аж усе з яго дзівіліся – граў у шахматы й варцабы лепш за астатніх, і ў любой ягонай годнасці не было яму раўні; і ніхто не мог так спраўна ўсядлаць каня, як ён. Калі ж споўнілася яму дванаццаць гадоў, ужо быў ён годны й разважны ў кожным сваім учынку. Паны й панны, і кожны чалавек дзівіліся з яго. Любая пані ці панна была б радая, каб Трышчан пакахаў яе. Трышчан жа пачэсна служыў пры двары караля Перамонта, і кароль іншых панічоў свайго двара ставіў за нішто перад ім. Але не ведаў ніхто, хто ён і адкуль.

А была ў таго караля дачка, вельмі прыгожая дзяўчына, і яна пакахала Трышчана. “Не бачыла вока людское такога цуднага дзіцяці, як Трышчан”,– разважала яна. Калі страчала дзе Трышчана, думкі ейныя і вочы былі пры ім. Пакахала яго, як саму сябе, і не магла даўмецца, як дамагчыся ласкі ягонай і кахання ды споўніць з ім свой намер, і гэтак разважала: “Калі намігну яму, ён на тое не папусціцца: замалады, не паквапіцца на такое каханне. Вось калі б ён прысягнуў мяне пакахаць, то я пачакала б, покуль прыйдзе той час: лепш дачакацца яго, як быць найвялікшаю каралеваю найвялікшага каралеўства. Але ж, баюся, не схоча праз маладосць сваю, і праз бацьку майго не адважыцца тое ўчыніць”.

І вось каторага дня адпачывала яна ў пакоі і загадала паклікаць да сябе Гаварнара. “Пане Гаварнару,– пачала каралеўна,– люблю я твайго Трышчана больш, як сябе. Прашу цябе: скіруй яго на тое, каб пакахаў мяне. А як не захоча таго зрабіць, прычыню яму вялікае няшчасце”. Пачуўшы тое, засмуціўся Гаварнар і не ведаў, што парадзіць, а следам падумаў: “Калі б Трышчан учыніў такое, і даведаўся б кароль – пакараў бы яго бязлітасна”. Каралеўне ж адказаў так: “Добра, літасцівая каралеўна, зраблю гэта для вашмосці: скажу яму, каб выканаў тваю волю. Але ж ён яшчэ замалады: калі тое станецца не так хутка, не трымай на яго гневу”. Каралеўна вельмі шляхетна падзякавала Гаварнару. Затым Гаварнар пайшоў да сябе і, засмучаны, разважыў так: “Калі Трышчан гэта ўчыніць, то дрэнна, а не ўчыніць – таксама дабра не будзе”.

“Што мяркуеш рабіць? – спытаўся Гаварнар у Трышчана. – Каралеўна цябе моцна кахае, і калі ты адмовішся яе кахаць, накладзе на сябе рукі”. – “Калі яна пакахала мяне празмерным каханнем, то хай жа не чакае ад мяне таго ж. Няхай ейная празмернасць застанецца пры ёй, бо я не хочу здрадзіць свайму пану за тую ласку і пачэснасць, якую ён мне аказвае, не ведаючы, хто я і адкуль”,– адказаў на тое Трышчан. Пачуўшы тое ад Трышчана, моцна здзівіўся Гаварнар, што ў такім маладым веку бачыць такую пачэснасць, бо на той час Трышчану было трынаццаць гадоў. Тады Гаварнар пачаў пытацца з большай настойлівасцю: “Чаму ж табе не даспадобы каханне з такой прыгожай дзяўчынай?” – “Ейнай прыгажосць не давядзе мяне да здрады. А калі б я і папусціўся на тое, у чым ты даеш мне параду, то табе ж давялося б мяне і адваджваць ад гэтага”,– адказаў Трышчан.

Назаўтра паклікала каралеўна Гаварнара і спыталася: “Ці даведаўся ты ў Трышчана?” – “Трышчан кахае вас так, як прынята пры двары, бо не жадае рабіць тое, што было б здрадай твайму бацьку”,– адказаў ёй Гаварнар. “То Трышчан зусім мяне адвергнуў?” – прамовіла каралеўна; і пайшла яна прэч у вялікім суме, праклінаючы дзень, у які нарадзілася. Пайшла яна ў спачывальню і там моцна плакала.

Сядзела аднойчы каралеўна ў спачывальні ў роздуме над сваім каханнем да Трышчана. А ў той спачывальні, дзе яна знаходзілася, было цёмна. Трышчан праходзіў міма таго пакоя, не ведаючы, што там каралеўна. Тая ж, убачыўшы яго, выскачыла з пакоя ды абхапіла яго рукамі за шыю, і пачала цалаваць ды лашчыць. А той, баючыся, каб хаця хто іх не заўважыў, адштурхоўваў каралеўну абедзьвюма рукамі. Зразумеўшы, што не даможацца, чаго хацела, каралеўна моцна закрычала. Пачулі той крык каралеўскія рыцары (у караля нават і думкі не прамільгнула, што

крычыць ягоная дачка), збегліся і спыніліся: трымае каралеўна Трышчана за шыю і скардзіцца ім: “Панове, Трышчан хацеў мяне згвалтаваць!” Яны ж схапілі Трышчана і павялі да караля, якому расказалі пра ўсё, што бачылі й чулі ад панны. Моцна засмуціўся кароль і сказаў: “Я выказваю да цябе павагу, і бачаць тое людзі; ты ж чыніш мне ганьбу, а сабе – смерць”. І загадаў кінуць Трышчана ў вязніцу.

Гаварнар жа ў той час быў у сябе; а як даведаўся, што Трышчан у вязніцы, моцна з таго засмуціўся. “Я прапаў, нішто мне не ў радасць, і не ведаю нават, што са мной будзе”,– падумаў ён і вырашыў пайсці да караля. Усе, каго страчаў на шляху сваім, сарамацілі яго, кажучы: “Гэтак ты вывучыў Трышчана? Ён цяпер паддаўся благому”. Але Гаварнар ішоў далей, а як прыйшоў да караля, укленчыў перад ім, кажучы: “Пане, дзеля Бога злітуйся і выслухай мяне!” – “Кажы!” – загадаў кароль. “Пане, хай будзе пачэсна захавана тое, што хачу вам паведаміць з вока на вока”,– папрасіў Гаварнар. Кароль зайшоў у адзін з пакояў; Гаварнар рушыў следам і расказаў пра ўсё па парадку: як каралеўна закахалася ў Трышчана, што сказала яму, пасылаючы да Трышчана, як Трышчан ёй адмовіў.

Кароль выслухаў, але не навярнулася сэрца ягонае да Трышчана: ён яшчэ не цалкам давяраў Гаварнару ў гэтай справе. “Хачу як мага хутчэй разабрацца з гэтым: калі ўсё акажацца праўдай, тады прабачу Трышчана, а калі выявіцца вінаваты – абыдуся з ім як з вінаватым”. З тым і пайшоў Гаварнар ад караля. А кароль загадаў паклікаць сваю дачку. “Дачка мая любая,– мовіў кароль,– што думаеш пра Трышчана? Я хачу прычыніць яму зло і папомсціцца за тваё няшчасце”. І каралеўна не здолела нічога іншага сказаць, як толькі: “Васпане, гэта справядліва: хай кожны атрымае па справах сваіх”. – “Дачка, калі ты захочаш, то будзеш яму жонкай, а калі не – ён памрэ”,– сказаў кароль. Дзяўчына ж пачала бегаць вачыма туды-сюды, і зразумеў кароль, што яна – не вораг Трышчану.

І загадаў кароль прывесці Трышчана і Міліенца, дзядзькавіча каралеўны, які незадоўга да таго забіў чалавека; і калі прывялі іх, узяў меч і сказаў: “Дачка, ты бачыш гэтых двух юнакоў, якія павінны прыняць смерць, але аднаго з іх я хачу вызваліць: адпусці, якога захочаш, на каго будзе воля твая, а другі няхай прыме смерць”.

Каралеўна не ведала, што й рабіць; і падумала сабе: “Калі адпушчу Трышчана – каралю будзе шкада Міліенца, калі ж адпушчу Міліенца – тады прыняць смерць майму каханаму Трышчану”. І прыціхла. А кароль здагадаўся, што яна кахае Трышчана, ды яшчэ больш прыстрашвае дачку, кажучы: “Дачка, вазьмі таго, на каго будзе твая воля!” Каралеўна ж, баючыся бацькі, сказала: “Адпусці брата майго Міліенца!” – “Тады прыме смерць Трышчан!” – усклікнуў кароль і ўхапіў Трышчана за макаўку; і ўзмахнуў мячом, кажучы: “Зараз буду сячы!”

Гледзячы на гэта, не стрывала дзяўчына ды й кажа бацьку: “Васпане ойча, адпусці Трышчана, а з Міліенцам рабі, што хочаш!” – “Ты выбрала Міліенца,– адказаў на тое кароль,– а Трышчан мае прыняць смерць!” – “Пане, каюся: кахаю Трышчана, а з Міліенцам рабі, што хочаш!” – “Ты выбрала Міліенца, а Трышчан, які вельмі вінаваты, мае прыняць смерць”,– паўтарыў кароль і замахнуўся мячом, быццам хочучы сцяць Трышчану галаву. Тады яна падскочыла і захінула Трышчана рукою: “Пане, не забівай Трышчана, а забі мяне!” – “Інакш і быць не можа,– не пагаджаўся кароль,– толькі Трышчана мушу загубіць!” Тады каралеўна сказала: “Пане, дай мне меч – хай я сама заб’ю яго!” Кароль даў меч, яна ж, глянуўшы на Трышчана, сказала: “Пане, або адпусці Трышчана, або я сама сябе заб’ю гэтым мячом!” – “Ці ж ты гэтак кахаеш Трышчана?” – спытаўся кароль. “Люблю яго больш, як саму сябе,– адказала дачка. – Калі ж ты яго заб’еш, я таксама сябе заб’ю!” Тады мовіў кароль: “Дачка, бяры Трышчана!” А затым сказаў Трышчану: “Ты ўжо апраўданы!”

Трышчан з вялікай пакорай падзякаваў каралю і каралеўне ды пайшоў на вялікі палац. Гаварнар жа, угледзеўшы Трышчана, быў вельмі ўсцешаны і спытаўся: “Чаму кароль цябе адпусціў?” І Трышчан распавёў яму ўсё па парадку, як што адбывалася. “Калі ж ты не вінаваты, бі каралю чалом,– параіў Гаварнар,– каб адпусціў цябе: бо калі не зробіш таго, чаго хоча панна, глядзі, каб хаця не спрычыніла яна табе нічога благога”. Тады Трышчан спытаўся: “Настаўнік, як мяркуеш, куды нам найлепш падацца?” – “Найлепш, мяркую, выправіцца да двара твайго дзядзькі, караля Марка. Як захочаш, то ніхто цябе не пазнае, бо ты дужа падрос з таго часу, як мы пакінулі Еліонас. Зможаш служыць у свайго дзядзькі, пакуль не надыдзе час твайго пасвячэння на рыцара. А як захочаш пасвяціцца, кароль падпярэжа цябе ўласнай рукою”,– адказаў яму Гаварнар. “Хай будзе па слове тваім”,– пагадзіўся Трышчан.

Назаўтра прыйшоў Трышчан да караля, ударыў чалом і сказаў: “Хачу адправіцца ў сваю зямлю!” Ён пакорліва падзякаваў каралю і добрым людзям за ласку, і кароль таксама падзякаваў яму за верную службу і абяцаў сваю прыязнасць.

Як убачыла каралеўна, што Трышчан з’язджае, то ўпала ў вялікую маркоту; і паслала Трышчану праз свайго слугу іншаходніка і выжла. Трышчан паабяцаў слузе дар, які ні папросіць. “Пане,– сказаў слуга,– хачу, каб ты апярэзаў мяне, як станеш рыцарам”. І другім разам паслала каралеўна да Трышчана, просячы: “Пане, аддай мне свой меч, каб я з ім палюбілася”. Трышчан паслаў ёй меч, яна ж прамовіла – “Лепш мне памерці ад Трышчанавага мяча, чымся быць найвялікшаю каралеваю!” – і закалолася.

З Францыі Трышчан з Гаварнарам выправіліся да караля Марка. І біў яму Гаварнар чалом, кажучы: “Міласцівы кароль, гэты пан прыехаў служыць табе, каб ты пасвяціў яго ўласнай рукою на рыцара”. Кароль з радасцю прыняў Трышчана і абяцаўся пасвяціць яго на рыцара калі той сам пажадае. Але ж не пазнаў Трышчана. І Трышчан служыў шляхетна і з вялікім майстэрствам, і кожны, хто яго бачыў, дзівіўся, які гэта годны пан.

Потым захацеў Трышчан пасвяціцца, і загадаў кароль падрыхтаваць усё, неабходнае рыцару. І падрыхтавалі ўсё як належыць. Цэлую ноч быў Трышчан у царкве, а назаўтра пасвяціў яго кароль на рыцара. І было там шмат добрых людзей; і кожны, хто бачыў Трышчана, казаў: “Не бачылі мы больш годнага рыцара!”.

І калі быў Трышчан на тым фэсце, прыбылі з Арляндэі да караля Марка чацвёра рыцараў і пачалі казаць яму без паклону: “Кароль, паслаў нас да цябе годны рыцар Амурат з Арляндэі, кажучы табе: “Дай даніну, якую твае продкі давалі маім з Карнавалі ў Арляндэю, і каб была падрыхтаваная за дзесяць дзён”. Як дасце, заключым з вамі мір; а як не схочаш даваць, ведай – праз колькі дзён не застанецца тут і пядзі непарушанай зямлі”. Пачуў кароль Марк тыя словы і спалохаўся; і не ведаў, што адказаць.

Тады, выступіўшы наперад, стаў Трышчан перад каралём і даў паслам такі адказ: “Ідзеце сюды, вы, якія такое слаўнае пасольства прынеслі! Перадайце вашаму пану: паколькі нашыя продкі давалі вашаму каралеўству даніну праз уласнае глупства, хай пан ваш, кароль Арляндэйскі, калі хоча мець даніну, прыйдзе і возьме яе мячом у полі, бо іншым чынам не возьме. Я ж гатовы адабраць гэтую даніну ўласнай рукою”. “Ці ж і ты гэтак мяркуеш?” – спыталіся паслы ў караля Марка. “Калі ён згодны прыняць бой ў імя свабоды Карнавалі,– адказаў той,– то гэтак жа мяркую і я”. – “Хто ж ты?” – спыталіся тады ў Трышчана паслы. “Я – іншаземец, а імя мне Трышчан”. – “Прабач,– запярэчылі паслы,– але Амурат не прыме твайго выкліку на бітву, калі ты чалавек не шляхетнага роду”. – “Праз тое бітва не адкладзецца,– супакоіў іх Трышчан. – Хай Амурат каралевіч, але ж і я – сын караля Меліядуша Еліонаскага, а каралю Марку даводжуся пляменнікам. Дасюль я хаваў сваё імя, але цяпер ужо не магу таіцца”.

Паслы як хутчэй вярнуліся і перадалі каралю Амурату адказ Марка. “Хто ён, які прыняў бітву?” – спытаўся Амурат. “Сын караля Меліядуша, пляменнік караля Марка. Ён – новапасвечаны рыцар, і ніколі раней не страчалі мы такога цудоўнага рыцара, бо ён сам прыняў бітву, без угавору”,– адказалі паслы. “Ён яшчэ каяцьмецца: новы рыцар новую смерць прыняць хоча,– прамовіў Амурат. – Ці ж дамовіліся вы, дзе той бітве быць?” – “Не”,– адказалі паслы. – “Паедзьце ж туды зноў і дамоўцеся: не хочу адкладваць гэтае справы”,– загадаў Амурат. І напрасіўся да іх рыцар Гарнот: “Я складу вам кампанію: хацеў бы паглядзець на таго рыцара, якога ўсе так хваляць”.

Паехалі паслы морам і сушай, і прыбылі ў Карнаваль да караля Марка, і перадалі яму словы караля Амурата. “Няхай будзе тая бітва на выспе Самсоне: толькі яны самі, кожны ў сваёй лодцы, адправяцца туды; і кожны сам сабе будзе за мараплава”,– прапанаваў кароль Марк. І прызначылі бітву праз два тыдні.

Вярнуліся паслы да Амурата і сказалі яму, што бітва прызначаная на выспе Самсоне. “Добра,– прамовіў той і спытаўся ў Гарнота: – Ці ж ты бачыў таго рыцара?” – “Бачыў,– адказаў Гарнот,– і калі б ты прыслухаўся да маёй парады, то не ўвязваўся б у гэтую бітву, і заключыў бы між вамі мір. Бо калі вас двох зыдзецца ў той бітве, вялікі смутак будзе: як станецца што з табою, будзе вялікая шкода для Арляндэі, а калі з ім што станецца, будзе вялікая шкода ўсяму свету – бо Трышчан не з тых, хто адседжваецца дома. За ўсё сваё жыццё не страчаў я лепшага рыцара. А як дасягне ён патрэбнага веку, мецьме вялікую годнасць”. – “Міру не будзе, пакуль не вазьму гатовай даніны”,– адказаў Амурат і пачаў рыхтавацца да бітвы.

Кароль Марк, Трышчан і ўсе карнавальскія рыцары, панны й паны, ходзячы ў царкву, маліліся Богу, каб дапамог ім і збавіў ад Амурата. Трышчан падрыхтаваўся належным чынам і назаўтра, праслухаўшы мшу, увайшоў у гасцёўню ў панцыры і пры поўнай зброі; і прайшліся паўз яго ўсе паны. “Сыне мой любы, чаму ты ад мяне таіўся? Каб ведаў, што гэта ты, то хай бы ўсю Карнаваль захапілі – не дазволіў бы табе біцца, бо калі з табою што здарыцца, ніколі ўжо не зведаю радасці“,– сказаў яму кароль Марк. “Пане, не бойся: мо’ не міне і нас Бог у ласцы сваёй. Маю надзею, што ён нас пашануе і спашле сваю дапамогу“,– адказаў Трышчан.

Потым прыйшла вестка, што Амурат ужо на выспе Самсоне. “Дайце мне гелм“,– папрасіў Трышчан. І падалі яму харошы гелм, і сам кароль павязаў яму і падправіў усю зброю, і агледзеў, і спраўдзіў яе; прывялі яму таксама харошага каня. Трышчан ступіў у ладдзю і ўжо неўзабаве быў на выспе.

Глядзеў на яго Амурат і дзівіўся, як гэта ён адважыўся на бітву з ім. Прыстаўшы тым часам да берага, Трышчан адштурхнуў сваю ладдзю на ваду. “Навошта адштурхнуў ты ладдзю?“ – спытаўся Амурат. “Толькі адзін з нас ад’едзе ў тваёй ладдзі, а другі застанецца тут”,– адказаў Трышчан. Зразумеў Амурат, што словы гэтыя сведчаць пра мужнасць, і пашкадаваў ужо, што спытаўся, бо мудры адказ даў яму Трышчан. І мовіў Амурат: “Пакіньма гэтую бітву, бо не хачу цябе забіваць: жадаў бы мець у табе таварыша і любіць цябе, як брата”. – “Я пакіну бітву, калі адмовішся ад карнавальскай даніны. А не хочаш,

то біся са мною",– адказаў яму Трышчан. Амурат жа прамовіў: "Дзеля гэтага я й прыйшоў!".

Бітва Трышчана з Амуратам І ўскочылі абодва на коней, і стукнуліся так моцна, што калі б не засланіла іх надзейная зброя – абодва б памерлі. І паламалі дзіды, і пападалі абодва з коней на зямлю, і следам паўскаквалі на ногі. Трышчан быў паранены ў сцягно атручаным гротам, а Амурат гротам без атруты. І схапіліся яны за мячы, і доўга і моцна рубаліся, ударяючы адзін аднаго, і параніліся ў многіх месцах. І зразумелі, што абодва годныя рыцары. Амурат уважаў сябе найвялікшым на свеце рыцарам; калі ж убачыў Трышчанава рыцарства, то перастрашыўся. І прытаміліся абодва, і не суджана было іначай, як аднаму з іх застацца на полі, а таму кожны стараўся наносіць удары. І ўсе, хто бачыў іхнюю бітву, былі ў вялікім здзіўленні. І адступіліся рыцары адзін ад аднаго, пахіліўшыся на тарчы. "Калі Трышчан зноў выкажа такую моц, я не стрываю ягоных удараў",– думаў Амурат, бо бачыў у Трышчане найвялікшага рыцара. Калі адпачнулі, падхапіўся Трышчан і што сілы пачаў рубаць зверху, закрываючыся тарчай і мячом, але Амурат не меў ужо моцы для бітвы. Зразумеўшы тое, ўзлаваўся Трышчан і што моцы рубануў яго паверх гелма; і рассек яму гелм і галаву аж да мозгу; і застаўся ў Амуратавай галаве аскепак ягонага мяча. Адчуў Амурат, што паранены смяротнаю ранаю, і адшпурнуў тарчу і меч, і кінуўся да ладдзі; а як дапоўз да вялікае ладдзі і сваёй дружыны, што чакала яго, у вялікім смутку стрэлі яго слугі й паклалі ў ладдзю. "Плывіце хутчэй!" – загадаў Амурат. І адплылі ад таго берага з плачам; а карнавальцы, гледзячы на тое, крычэлі ўслед: "Благой вам дарогі – вось вам даніна!". І сказалі кароль Марк і іншыя карнавальцы: "Пашанаваў нас Бог і даў нам Трышчанаву годнасць!".

Мноства людзей кінулася да Трышчана, як угледзелі, што на выспе ён застаўся адзін. І ўбачылі, што Трышчан моцна паранены й аслаб ад зыходу крыві (бо страціў ён многа крыві і праз тое не мог стаяць на нагах). Ды не так шкодзілі яму іншыя раны, як тая, што ў сцягне, куды быў паранены атручаным гротам.

І павезлі Трышчана да берага. І падступіўся кароль, і, прыняўшы Трышчана, пачаў цалаваць яго й лашчыць. "Як пачуваешся?" – спытаўся. "Я моцна паранены, але ж, дасць Бог, ачуняю," – адказаў Трышчан. І спачатку павёў кароль яго ў царкву, каб узнесці Богу хвалу, а потым з вялікай радасцю ў палац на пір, бо збавіў Трышчан народ ад няволі.

Потым Трышчан пайшоў дадому, і так моцна захварэў з атручанай раны, што ледзь трываў боль. Прыйшлі лекары, прыклалі найлепшых масцяў, і неўзабаве Трышчан ачуняў ад усіх ран, акрамя тае, што была атрутнай – гэтай лекары злячыць не маглі. Што ні прыкладвалі яны да тае раны – нішто не дапамагала; і не ведалі, што рабіць з ранай, праз якую трываў Трышчан вялікія пакуты. Аднае начы моцна пакутаваў Трышчан ад тае раны, і ніхто да яго не мог падступіцца, толькі Гаварнар: ён ніколі й нікуды не адлучаўся ад Трышчана і плакаў, бачачы пана свайго пры смерці, бо не было таго чалавека, які бачыў Трышчана раней і пазнаў бы цяпер. І моцна заплакаў кароль, і ўсе добрыя людзі таксама плакалі так, нібы паміраў іхні сын або брат: "О Трышчане, добры і пачэсны рыцару, цудоўная маладосць! Як жа ж дорага купіў ты свабоду Карнавалі! Мы застаемся ў радасці, а ты паміраеш лютаю смерцю!".

Трышчан ляжаў на сваёй пасцелі, і была пры ім адна дзяўчына, што прыйшла паглядзець, наколькі ён нядужы; і пачала яна вельмі жалосна плакаць: "О Трышчане, дзіўлюся я з цябе – чаму не клапоцішся сам пра сябе? Ты ж бы мог знайсці сабе якое лекаванне і ў іншай зямлі! Ты ж ведаеш – па ўсёй Карнавалі не знойдзеш добрага лекара!" – "Я ж не магу ні сам асядлаць каня, ні стрываць, каб мяне неслі ў насілках", – сказаў Трышчан. "І я не магу табе дапамагчы: навучыць цябе той, хто стварыў неба і зямлю," – адказала дзяўчына.

І кажа тады Трышчан Гаварнару: "Аднясі мяне ў палац, з якога добра відаць мора". Доўга глядзеў Трышчан на мора, і нарэшце папрасіў Гаварнара: "Пакліч да мяне караля Марка". – "Сыне, для чаго ты мяне паклікаў?" – прыйшоўшы, спытаўся кароль. "Прашу цябе, пане,– дай мне адну рэч, якая табе не шмат каштавацьме," – папрасіў Трышчан. "Хаця б тая рэч і шмат каштавала, але і тады выканаю тваю волю. Няма таго, чаго б не зрабіў я дзеля цябе," – адказаў кароль Марк.

Трышчан з пакорай падзячыў яму за тое. "У гэтай зямлі, пане, лекара мне не знайсці. Я нямала ператрываў і цяпер добра разумею, што смерць мая блізка. Хачу паехаць па свеце, у іншыя землі. Падрыхтуй мне добрае судна і пакладзі ў яго ўсё, што можа спатрэбіцца: стравы і пітво, і лёгкі ветразь – каб адзін чалавек мог з ім управіцца – ды пакрый яго дарагім сукном ад дажджу і ветру. Хачу я пусціцца па моры туды, куды прынясе мяне фартуна – а раптам і знайду лекара, што вылекуе мне рану, ад якой паміраю. Калі ж не, то я ўжо не жылец". – "Сыне, як жа ты паплывеш такі нямоглы?" – спытаўся кароль. "Хаця і памру там, аднак жа і тут памру. А будзе на тое Боская воля, то мора і вецер прынясуць мяне да фартуны. Як толькі падрыхтуюць судна, занясі мяне ў яго і дай мне маю арфу, а яшчэ лютню, каб на час падарожжа была ў мяне музыка, што аблегчыць маю тугу і хваробу", – адказаў Трышчан.

Тужліва заплакаў кароль Марк, тое пачуўшы, і доўга праз слёзы не мог адказаць Трышчану; а супакоіўшыся, спытаўся: "Сыне мой Трышчане, ці ж ты назаўсёды хочаш мяне пакінуць?" – "Пане, цяпер не можа быць іначай,– адказаў той. – Абяцаю табе: як толькі знайду лекара і акрыяю, адразу ж вярнуся ў Карнаваль". Зразумеў кароль,

што іначай і быць не можа, і загадаў падрыхтаваць судна так, як прасіў Трышчан. І змясцілі на тым судне дастаткова таго, пра што казаў Трышчан. Калі ж усё было падрыхтавана, загадаў кароль завесці нядужага Трышчана на судна. Гледзячы на гэта, вельмі жалосна заплакалі карнавальцы; таксама і кароль разам з сваімі вяльможамі плакаў несупынна. Як убачыў тое Трышчан, моцная туга агарнула яму душу, і, напяўшы ветразі, як мага шпарчэй адплыў ён ад берага. І быў ім спадарожны вецер, і плылі яны хутка, але ж не ведалі, куды плывуць.

І гэтак плылі праз два тыдні. І прынесла фартуна Трышчана да аднаго горада ў Арляндэі, дзе жыў кароль Ленвіз, жонкай якога была сястра караля Амурата, забітага Трышчанам. А яшчэ была ў караля дачка па імені Іжота. Гэтая дзяўчына добра зналася на леках для ранаў, і не было тае раны, якой яна не злячыла б. Апынуўшыся на ўзбярэжжы пры замку, усцешыўся Трышчан: узяў арфу, настроіў і пачаў граць так чароўна, як толькі мог.

Убачыў і пачуў тое з палаца кароль Ленвіз і падышоў бліжэй; і доўга слухаў. Было яму надзвычай дзіўна бачыць і пакрытае лілеямі ды багата ўпрыгожанае судна, і чыёсьці чароўнае і тужлівае гранне. Паклікаў ён да сябе каралеву, якая таксама паглядала на судна, слухала арфу і вельмі дзівілася. “Прашу цябе, пойдзем ды глянем на той цуд,” – сказала яна каралю. І пайшлі яны разам надол, да мора, і слухалі арфу, покуль Трышчан не скончыў. І адно спыніўшыся, пачаў ён плакаць і крычаць ад болю, які трываў.

Падышлі кароль з каралеваю да судна і, убачыўшы Трышчана, прывіталі яго. Трышчан таксама іх прывітаў ды спытаўся ў караля (не ведаючы, што гэта кароль): “Скажы, пане, што гэта за зямля, да якой мы прысталі?” – “Вы ў Арляндэі”, – паведаміў кароль. Як пачуў тое Трышчан, яшчэ больш, чым раней, занядужаў ад раны; бо спужаўся: калі яго пазнаюць, то загіне за ўчыненае Амурату.

“Прашу цябе, рыцару, скажы мне, скуль ты?” – спытаўся ў Трышчана кароль. “Пане, я з горада Еліонаса, з багатае зямлі,– пачаў Трышчан.– Прыплыў я сюды ў немачы ад раны, бо не мог знайсці лекара. Такі боль і пакуты я ператрываў, што, каб мог, з радасцю ўжо даўно б памёр. Але ж, калі не дапускае пан Бог маёй смерці, мушу трываць. А па мне лепш смерць, як такое жыццё”.

Пачуўшы такую Трышчанаву гаворку, зліталаўся з яго кароль і паверыў, што ён кажа праўду. “Ці ты рыцар?” – пацікавіўся кароль. “Так,” – адказаў Трышчан. “Не турбуйся, рыцару: ты патрапіў у такое месца, дзе, дасць Бог, выздаравееш: маю я дачку, што лепш за якога лекара кожнай ране прыдумае лекаванне. Ведаю, што яна будзе радая паклапаціцца пра цябе дзеля Бога і сваёй шляхетнасці,” – сказаў яму кароль. Трышчан жа з вялікай павагай і пакорай падзячыў каралю.

Затым кароль з каралевай пайшлі ў палац. І падрыхтавалі Трышчану пакой у адной са спачывальняў, і па каралеўскім загадзе занеслі яго наверх у той пакой і там пакінулі. А потым кароль паслаў па дачку сваю Іжоту; і калі тая прыйшла, сказаў ёй: “Любая дачка, хадзем са мною – агледзь таго рыцара-госця, які дужа хворы ад раны. Парупся пра яго дзеля Бога й мяне і добрае славы, каб хутчэй акрыяў”. – “Васпане, я радая выканаць твой загад і старацьмуся з усіх сілаў”, – адказала Іжота і пайшла да Трышчана.

Агледзеўшы рану, прыклала яна нейкія прыдатныя да таго зёлкі. Здрыгануўся Трышчан усім сэрцам ад трыванага болю, а каралеўна, не заўважыўшы і нават не падумаўшы, што ў ране можа быць атрута, пачала суцяшаць яго, кажучы: “Не бойся, рыцару! Як будзе на тое Божая воля, я хутка пастаўлю цябе на ногі”. – “О Божа, каб жа ж так магло стацца! Каб жа ж быў здаровы, не прасіў бы Бога,” – мовіў Трышчан.

Больш за дзесяць дзён прыкладала дзяўчына зёлкі, на якіх зналася, а Трышчану ўсё горшала. І пачала Іжота праклінаць сябе, кажучы: “Не ведаю, што й рабіць, што маю да гэтае раны прыкласці”. І зноў пачала аглядаць рану. І прыйшло ёй на розум, што рана атручаная, і падумала сама сабе: “Як акажацца, што рана не атрутная, мушу яго пакінуць, бо не здолею памагчы”. Загадала яна вынесці Трышчана на сонца, і пачала ўважлівей аглядаць рану, а рана ад сонца пачала запякацца. “Пане, цяпер я разумею, чаму твая рана не гаілася і чаму ты не знайшоў лекаў: жалеза, якім ты паранены, было атручанае; і ніхто пра тое не падумаў. Але ж цяпер, калі я тое ўразумела, ты, з Божай дапамогай, акрыяеш”,– сказала Іжота.

Усцешыўся з таго Трышчан. Дзяўчына ж пачала выцягваць з раны атруту і зноў прыкладаць лекі. Праз колькі дзён адчуў Трышчан палёгку (а быў ён ужо толькі скура ды косці), а праз два месяцы быў зусім здаровы: такі ж харошы й лёгкі, як і да хваробы. І прыйшло яму на розум, што трэба як найхутчэй ехаць у Карнаваль, бо баяўся, што яго пазнаюць. І здумеўся Трышчан.

У тыя дні прыехалі тры рыцары ад Круглага Стала караля Артыюша, якіх звалі Гарнот, Кажын і Бандэмагуль. Былі гэта рыцары вялікае годнасці і славы. Кажын, у адрозненне ад іншых двух рыцараў, адносіўся да ніжэйшага рыцарства, але быў ганарлівы і гаваркі. А прыбылі яны ў Арляндэю дзеля паненкі, якая хацела выйсці замуж і дзеля гэтага загадала склікаць рыцарскі турнай. І з’ехалася нямала іншых годных рыцараў: той з іх, які пакажа ў турнаі найбольшую адвагу, і атрымае паненку; калі ж не захоча пабрацца з ёю, дзяўчына павінна даць яму такі вялікі дарунак, які будзе варты колькіх дзесяткаў рыцараў. Дзеля гэтага і прыбылі ў Арляндэю тры згаданыя рыцары.

Кароль Ленвіз іх ведаў, быў ім рады і цешыўся за іх. І сядзелі ўсе пры стале, і калі ўбачылі рыцары Трышчана, ніхто яго не пазнаў; адзін Гарнот бачыў Трышчана раней, але з таго часу Трышчан пазбавіўся немачы, а таму і Гарнот яго не прызнаў. І не было між тых рыцараў такога ж цудоўнага, як Трышчан. Трышчан жа пазнаў Гарнота і адразу прыгадаў, як той прыходзіў у Карнаваль з пасламі караля Амурата, і таму пачаў асцерагацца, каб хто яго часам не пазнаў. А рыцары ўважліва прыглядаліся да яго, бо здавалася ім, што гэта іншаземец; і пыталіся пра яго ў караля, а той распавёў ім усё па-парадку: дзеля чаго прыбыў Трышчан з Еліонаса; што няма на свеце чалавека, які б, бачачы ў такой немачы, не пашкадаваў бы яго; "але літасцю Божай і стараннямі дачкі мае Іжоты ён акрыяў". І шмат гаварылі рыцары пра Трышчана, пільна ўглядаючыся яму ў твар. Тады Гарнот падышоў да Трышчана і, адвёўшы набок, спытаўся: "Прашу цябе, рыцару, скажы мне, калі хочаш, хто ты і адкуль?" – "Я іншаземец,– адказаў Трышчан. – Больш ад мяне ты ні пра што не даведаешся. Прашу цябе, не трымай на мяне зла". З тым Гарнот і пакінуў Трышчана.

"Хачу і я паехаць у той турнай,– сказаў кароль. – Але, каб мяне там не пазналі, прашу вас: не выдавайце мяне, калі хто спытаецца". А потым звярнуўся да Трышчана: "Рыцару, як пачуваешся?" – "Добра, праз ласку Божую,– адказаў той і спытаў: – Чаму ты ў мяне пытаешся пра гэта?" – "Калі маеш патрэбу ў зброі і кані, я дам; дам і юнакоў, якія будуць табе прыслужваць," – сказаў кароль. "Пане, я яшчэ не набраў былой моцы, і доўга біцца не змагу. Аднак жа, калі вы надумаеце паехаць у турнай, за вашую ласку я памагу вам несці зброю, бо не ведае чалавек, што і дзе яму прыдасца", – мовіў Трышчан. "Хай будзе, як ты кажаш,– пагадзіўся кароль. – Але мне дужа хочацца, каб ты паехаў са мной". Трышчан паабяцаўся.

А назаўтра паехалі ў турнай. І стрэў іх Гаваон, пляменнік караля Артыюша. А разам з ім быў адзін юнак, які насіў ягоную тарчу, і быў гэта юнак, які падараваў Трышчану іншаходніка і выжла ад дачкі караля Перамонта. Убачыўшы Трышчана, ён пазнаў яго, падбег і кінуўся цалаваць яму ногі. Трышчан жа спалохаўся, што юнак яго выдасць, і сказаў: "Я маю пайсці, не кажы пра мяне ніводнай жывой душы". – "Пане, не хвалюйся пра тое. Але прашу цябе – дай мне з тваёй ласкі адзін дар". – "З ахвотай, калі толькі маю рэч, пра якую ты просіш",– мовіў Трышчан. "Пане, вялікая ласка твая, ці ж памятаеш, што мне абяцаўся? Тое і дай". – "Не памятаю," – адказаў Трышчан. "Калі я дарыў табе іншаходніка і выжла ад дачкі караля Перамонта, ты абяцаў пасвяціць мяне на рыцара. Таму, пане, мне і хацелася б, каб заўтра ты мяне пасвяціў". – "Як абяцаў, так і будзе,– сказаў Трышчан, і потым спытаўся: – А хто ж той рыцар, зброю якога ты носіш?" – "Гэта пан Гаваон, пляменнік караля Артыюша,– мовіў юнак. – Ён абяцаўся пасвяціў мяне на рыцара адразу як захочу, але ж паколькі сустрэў вашэця – хочу стаць рыцарам ад тваёй рукі". – "Як сабе хочаш. Прашу цябе, пайдзі зноў да пана Гаваона і занясі яму дзіду і зброі, колькі падымеш, за ягонае кашталянства, шляхетнасць і рыцарства, а таксама за тваю годнасць",– сказаў яму Трышчан. "Хай станецца, пане, так, як ты хочаш",– пагадзіўся юнак. Узяў ён зброю і паехаў да Гаваона. "Што гэта за рыцар, якому ты так прыветна пакланіўся?" – спытаўся той. "Гэта нейкі іншаземец, але ж вельмі адважны",– адказаў юнак. "Як жа яго зваць?" – пацікавіўся Гаваон. "Пане,– адказаў юнак,– цяпер пра тое ты не даведаешся". І Гаваон пакінуў тую справу ў спакоі.

Прыехаў з малою дружынай і кароль Ленвіз, але яго ніхто не пазнаў (і Гаваон таксама, бо і да таго ніколі не бачыў Ленвіза). "Ці ты не ведаеш, што гэта за рыцар, які едзе асобна?" – спытаўся кароль у Трышчана. "Гэта Гаваон, пляменнік караля Артыюша",– адказаў той. "Я чуў пра яго,– сказаў кароль,– ён прыслужвае жанчынам і дзяўчатам". І паехалі яны ў кампаніі, але кароль не прызнаўся Гаваону, хто ён такі.

Ужо пад вечар стрэліся яны з рыцарам, што насіў чорную тарчу без адзнакі; а пры ім было два зброяносцы. Рыцар ехаў вельмі стройна і шляхетна, і меў пры сабе два мячы. І калі ён пад'ехаў бліжэй, сказаў Гаваон каралю Ленвізу: "Ці бачыце вы таго годнага рыцара?" – "Ці ты яго добра ведаеш?" – пацікавіўся Ленвіз. "Ні адзін годны рыцар не павінен насіць два мячы, хіба калі мае бітву з двума рыцарамі,– паведаміў Гаваон. – Па тым і пазнаюцца годныя рыцары: за сваю вялікую смеласць носяць яны па два мячы".

"Здаецца мне, што гэты рыцар узяўся за вялікую справу,– разважыў кароль. – Скажы, калі б знайшоўся рыцар, які змог бы яго перамагчы, што б ён меўся рабіць потым?" – "Пане,– адказаў Гаваон,– калі б знайшоўся такі рыцар, ды яшчэ і не з Ландрэша, зазнаў бы ён ганьбу, бо на цэлы год пазбавіўся б права на нашэнне зброі. А калі б яго перамог рыцар з Ландрэша, або які іншы вялікі рыцар, ён адкінуў бы адзін меч, а другі пакінуў бы пры сабе. Бо ж найбольшыя рыцары – з Ландрэша". Выслухаўшы яго, сказаў кароль: "Ужо ж я сабе не прабачыў бы, не пабыўшы ў гэтым турнаі і не пабачыўшы такога годнага рыцара". У тую ноч спыніўся Ленвіз непадалёк – за дзесяць міляў – ад турнаю, у нейкім замку.

Назаўтра пасвяціў Трышчан таго юнака на рыцара. Быў Трышчан адважны й вялікі ў годнасці сваёй. І быў пры тым вельмі годны рыцар ад Акруглага Стала. Трышчан выпадкова забіў яго сваёй рукою, але ж не ведаў, што той быў на баку Паламідажа, які моцна кахаў чароўную Іжоту. А звалі таго рыцара Бербеш.

Назаўтра раніцою з'явіўся кароль у турнай. Трышчан, пасвяціўшы згаданага юнака ў рыцары, даў яму каня і зброю, і паехалі яны разам у турнай, што меўся адбыцца на ўзмор'і ля замка. І было на турнаі шмат народу.

Прыехалі туды і два каралі: адзін – кароль Яніш з Локвы, а другі – кароль Артыюш з Ландрэша, з якім было сто рыцараў. Служыў ён прынчыпу Галіёту і валодаў Заходнімі Выспамі. У тым жа годзе, калі адбываўся гэты турнай у Арляндэі, Анцалот быў пасвечаны ў рыцары.

Калі ж сышліся ўсе з абодвух бакоў і ўзнялі адзін на аднаго дзіды, пачалася цесная й лютая бітва; і падалі рыцары з коней на зямлю. Ад Акруглага Стала было дзесяць рыцараў, якія ўсе разам біліся з каралём Янішам з Локвы. І ўчынілі яны вялікі цуд – узялі верх над многімі рыцарамі. Гарнот і Іван, сын караля Урыяна, а таксама Гаваон, Гееш і Бандэмагуль, Дондыэль, Сагрэмар і Гвіраш паказалі вялікую рыцарскую годнасць. Апынуўшыся на рысталішчы, яны хутка ўчынілі вялікі цуд, і ніхто не мог процістаць ім або ўтрымаць поле. Усіх бы яны перамаглі, каб не было там годнага рыцара з двума мячамі і чорнаю тарчай. Ён наляцеў з другога боку рысталішча, і ўчыніў вялікае дзіва (хто не бачыў, не даў бы таму веры): пачаў зрываць з рыцараў гелмы і скідваць іх з коней на зямлю; усе, хто бачыў тое, пагаджаліся, што ён перамог у турнаі. І ўсе перастрашыліся з ягонага рыцарства, і ніхто не мог яму процістаць. Гаваону нанеслі дзве раны, у Гарнота было тры, тое ж і ў Івана. Астатнія рыцары таксама мелі цяжкія раны і былі выбітыя з сядла.

Калі зразумеў Кароль Ста Рыцараў, што ён пераможаны,– так зажурыўся, што ледзь не ступіў з глуздоў, бо ўсім сэрцам кахаў ён прыгожую Іжоту і баяўся, каб яна хаця не даведалася пра гэткую ганьбу. І задумаўся, якім бы чынам папомсціцца. Дзеля гэтага паслаў ён па ўсіх старонах прасіць рыцараў зноў з'ехацца у турнай праз дзесяць дзён, бо спадзяваўся прыехаць туды больш падрыхтаваны і пры лепшай, як раней, зброі. Калі ж быў абвешчаны турнай і кожны пра тое пачуў, раз'ехаліся ўсе – і кароль Ленвіз таксама, – каб падрыхтавацца да новага турнаю.

Як убачыў Згоцкі кароль, што рыцар з чорнаю тарчай перамог у турнаі,– дужа яго палюбіў.

Прыехаў у Арляндэю Паламідаж і прысвяціў той турнай Іжоце. Трышчану ж увесь час было цяжка на сэрцы, і думаў ён, як яму паквітацца з тым рыцарам з чорнаю тарчай і двума мячамі. І адважыўся ён выступіць супраць Паламідажа. І глядзеў на яго злосна, бо лічыў, што Паламідаж чыніць рыцарам вялікую ганьбу. Гневаўся ж Трышчан і трымаў на Паламідажа зло, бо бачыў у ім так пекнага і ва ўсім годнага рыцара, і меркаваў, што Паламідаж хоча атрымаць Іжоту і што тая кахае яго ўсім сэрцам.

І пачалі Трышчан з Паламідажам варагаваць між сабою і нелюбіцца. А Іжота і не ведала і не здагадвалася, што яны абодва ў яе закаханыя. Мела яна служанку па імені Брагіня, прыгожую і разумную дзяўчыну – тая здагадалася, што абодва рыцары кахаюць Іжоту, і аднойчы сказала Іжоце знячэўку: "Васпані, прымі гэта за жарт: калі б цябе кахалі тыя два рыцары, каго з іх пакахала б ты – Паламідажа альбо нашага рыцара? Бо яны абодва цябе кахаюць". – "Я ім кахання забараніць не магу, калі маё сэрца да іх не пераменіцца. А калі б на тое пайшло, прыняла б прапанову Паламідажа, бо ён большы рыцар. Калі б наш рыцар быў такі ладны й такога ж роду, які відзён у Паламідажу, ён быў бы найбольшы і найцудоўнейшы рыцар",– засмяяўшыся, адказала Іжота.

Пачулі тое, седзячы ў адным пакоі, Паламідаж з Трышчанам. А калі яны выйшлі на двор, Трышчан пайшоў прагуляцца на ўзмор'е. І прыйшло яму на розум, што пакутуе ён ад кахання да Іжоты. "Я не дайду дасканаласці, вартае пекнай Іжоты, калі не саб'ю Паламідажавай пыхі. Паламідаж – годны рыцар, а мне такім не стаць без добрага каня, без добрае зброі і вялікіх цяжкасцяў і высілкаў",– разважаў Трышчан. З гэткім цяжарам на сэрцы і рушыў ён у турнай.

Пастанавіўшы паехаць у турнай, спытаўся кароль у Трышчана: "Ці не хочаш паехаць у турнай у маёй кампаніі?" – "Яшчэ я, васпане, не пачуваюся ў моцы",– адказаў той. Кароль паверыў і пакінуў яго ў спакоі. А насамрэч Трышчан, жадаючы паехаць у турнай, таму так адказаў, што не хацеў, каб яго пазналі. На трэці дзень з малою дружынай паехаў кароль у турнай, а Трышчан застаўся ў вялікай маркоце, бо не ведаў, як выканаць задуманае.

І як быў ён у тым здуменні, прыйшла Брагіня, якая моцна яго любіла, і спыталася: "Пане, пра што думаеш?" – "Панна, каб жа ж мне ведаць напэўна, што ты дапаможаш мне ў тым роздуме, з радасцю расказаў бы",– мовіў Трышчан. "Чым змагу, успамагу",– адказала дзяўчына. "Панна, я паехаў бы ў той турнай, каб меў каня і зброю",– сказаў Трышчан. "То чаму ж ты не ехаў разам з каралём?" – пацікавілася Брагіня. "Хацеў бы паехаць употай,– мовіў Трышчан,– каб ніхто мяне не пазнаў". – "Таму ты й застаўся?" – спыталася дзяўчына. "Толькі праз гэта". – "Не тужы праз каня і зброі, з тым затрымкі не будзе – каб табе ды не пабыць у турнаі".

Вельмі ласкава падзякаваў ёй Трышчан, а затым сказаў: "Мая любая панна, паклапаціся пра мяне, я не хачу затрымлівацца". Брагіня знайшла добрага каня і панцыр без чужое пазначкі, і прывяла двух сваіх братоў, каб прыслужвалі яму. Ад'язджаючы, папрасіў Трышчан Брагіню нікому пра яго не казаць. І паехаў пакрыёма, і заспеў у турнаі многіх рыцараў з розных старон.

Калі ж з'явіўся Трышчан у турнаі, усе, хто на тым добра знаўся, хвалілі яго, што гожа сядзіць на кані. Трышчан стаў збоку насупраць рыцараў, чакаючы, што будзе дзеецца.

Тут з вялікай пышнасцю прыехаў Паламідаж з той самай зброяй і пад тым самым сцягам, што і раней. Убачыўшы яго, паглядзеў Гаваон на вялікіх рыцараў і мовіў: "Цяпер маеце на што паглядзець – як павядзецца добраму рыцару. І няхай кожны сцеражэцца ягонага ўдару". – "Яшчэ не страчаў я на свеце яму раўні",– сказаў на тое Гарнот.

Паламідаж пачаў вырабляць такія цуды, што не было на турнаі рыцара, які б яго не збаяўся. І збіў Паламідаж многіх рыцараў, і потым праехаўся па турнаі налева і направа, чынячы вялікі цуд. І не знайшлося рыцара, які б адважыўся яго дачакацца. Каралю Ленвізу і Каралю Ста Рыцараў, якія годна і па-рыцарску баранілі поле, давялося, у рэшце рэшт, хаця і без вялікай ахвоты, уступіць поле Паламідажу. Той спыніўся, гэтым ушанаваны, а ўсе пачалі ўсклікаць: "Рыцар з чорнаю тарчай і двума мячамі другі раз перамог у турнаі!".

Пачуўшы і ўбачыўшы тое, падумаў Трышчан – "Гэта Паламідаж", – бо пазнаў яго па сцягу – і сказаў: "Дайце мне гелм: хацеў бы і я спаткацца на полі з годным рыцарам". Тут усе рыцары кінуліся да яго, і кожны працягваў Трышчану свой гелм. Калі ж ён уздзеў гелм, яны начапілі на яго панцыр і праверылі яго трываласць так, як прынята пры бітве з іншым рыцарам. Ухапіў Трышчан дзіду і пайшоў на Паламідажа. Калі ж яны ўбачылі адзін аднаго, сказаў Трышчан: "Рыцару, я па цябе!". А Паламідаж пайшоў насустрач і сказаў: "Едзь сюды, то паглядзім!".

Бітва Трышчана з Паламідажам Кінуліся яны адзін на аднаго і так моцна стукнуліся, што зламаў Паламідаж Трышчанаву дзіду; а Трышчан так моцна стукнуў Паламідажа, што той упаў на зямлю разам з канём, моцна выцяўся і не ведаў, што мае чыніць. І дзівіўся Паламідаж, што з ім сталася. Асядлаў ён каня і вырашыў ехаць у лагер, і нават не азірнуўся па баках.

А Трышчан, які моцна гневаўся на Паламідажа, бачачы, што той уцякае, паехаў за ім следам. Мала было Трышчану, што падзеннем нанёс Паламідажу вялікую ганьбу: надумаўся Трышчан абысціся з ім так, каб ніколі больш не адважыўся Паламідаж паказвацца Іжоце на вочы. Дагнаўшы Паламідажа, крыкнуў голасна: "Рыцар, вярніся – пабачым, хто з нас больш варты рыцарскага імя і хто больш годны кахаць пекную Іжоту!". Пачуўшы тыя словы, здагадаўся Паламідаж, што гэта Трышчан, і моцна спужаўся, бо, пакуль не зведаў ягонага ўдару, не мог паверыць, што Трышчан акажацца такі годны. Вярнуўся Паламідаж да Трышчана; узяў ён меч і зразумеў, што не зможа пакінуць поле бітвы без раны. Трышчан падскочыў і ўхапіў меч, і пачалася між імі лютая сеча. Трышчан падступіўся і моцна рубануў Паламідажа па гелме: той не ўтрымаўся ў сядле і зваліўся, разбіты, на зямлю; і доўга ляжаў, не разумеючы, ці то дзень, ці то ноч. Убачыўшы тое, усцешыўся Трышчан, што яму добра абышлося: бачыў, што выканаў свой намер – тое, чаго жадаў найбольш. Пасля перамогі над годным рыцарам Паламідажам, якога ён моцна ненавідзеў і якому прычыніў такую ганьбу, паехаў Трышчан з таго турнаю дадому.

Ехаў пан Трышчан дубровaю, і сустрэў адну дзяўчыну з двума слугамі. Здагадалася яна, што Трышчан быў у турнаі, бо ўбачыла, што панцыр ягоны пагнуты ад моцных удараў. Спыніўшыся, вельмі любасна прывіталася яна з Трышчанам, Трышчан таксама шляхетна прывітаўся з ёю. "Пане, ці вы едзеце з турнаю?" – спыталася дзяўчына. "Пра што ты ў мяне пытаешся?" – спытаўся Трышчан. "Пане, хацела б я, каб ты распавёў, хто перамог у турнаі",– папрасіла дзяўчына. "Панна, калі табе так няўцерп, то распавяду,– пагадзіўся Трышчан. – У гэтым турнаі перамагла адна пекная панна, якую сёння бачыў я на ўласныя вочы". Доўга стаяла дзеўчына ў здуменні, а потым кажа: "Рыцару, дзівосы нейкія ты мне гаворыш. Назаві мне, прашу цябе, імя тае панны, каб і я магла яго назваць, калі хто спытаецца ў мяне". – "Цяпер імя таго ты ад мяне не даведаешся",– адказаў Трышчан.

"Прашу цябе, пане, здымі гелм з галавы, каб я паглядзела на аблічча тваё і ўшанавала цябе, бо я – пасланніца караля Артыюша",– мовіла дзяўчына. Тады зняў Трышчан гелм з галавы і кажа: "Панна, глядзі сабе на мяне дасхочу". – "Бачу, пане, што ты вельмі задаволены. Цяпер буду хваліцца, што бачыла найлепшага з усіх рыцараў. Але прашу цябе, пане,– назаві мне сваё імя". – "Цяпер майго імя ты не даведаешся, бо яго нельга называць",– адказаў Трышчан. "Каб даведацца тваё імя, праехала я шмат зямель. Шкада ж мне сваёй працы, калі вас пабачыла, а імя вашага не даведалася",– мовіла дзяўчына. "Ведай сапраўды,– сказаў Трышчан, што я не той, каго ты шукаеш". – "Скажы мне, дзеля Бога, ці гэта не ты ўзяў Балячую Варту і выкараніў благі звычай, што існаваў у тым горадзе, дзе шмат добрых людзей памерла праз несправядлівасці таго праклятага звычаю?" – спыталася дзяўчына. "Панна, я напраўду не быў у тым горадзе і не ведаю пра яго. Скажы мне, панна, ці ўзятая Балячая Варта?" – пацікавіўся Трышчан. "Бачыла я, як той рыцар (а пры ім было некалькі годных рыцараў) захапіў той горад. І ніхто не зрабіў столькі сваёю рукой, як той рыцар", – адказала дзяўчына. "Скажы ж мне, панна,– ці ты бачыла яго пры зброі?" – "Я адно бачыла, што ён такі ж пекны і ў тым самым веку, што і ты. Таму вырашыла, што ён рыцар. Але хіба што я ў тым памылілася". Пагаварыўшы так, яны раз'ехаліся.

Трышчан паехаў да Брагіні, якая шмат у чым яму памагла. Дзяўчына ж ад'ехала ад Трышчана вельмі сумная, бо нічога пра яго не даведалася. З'явілася яна у турнай і, стрэўшы Паламідажа, пад'ехала да яго. А той плача горкімі слязьмі і праклінае дзень свайго нараджэння і той час, калі асядлаў каня. Дужа шкадавала дзяўчына, што

не застала турнаю, які больш за ўсё хацела пабачыць.

Пад'ехаўшы, прывітала дзяўчына Паламідажа – а яна не ведала, хто ён – і застала яго ў вялікай тузе праз тое, што сталася; і праклінаў Паламідаж дзень свайго нараджэння і час, у які асядлаў каня. Падступіўшыся, спытала дзяўчына: "Рыцару, хай Бог спашле табе суцяшэнне!" – "Хай спашле Бог і табе сваю ласку! – адказаў Паламідаж. – Панна, скажы дзеля Бога, ці не страчала ты рыцара ў светлай зброі?" – "Стрэла, пане, і размаўляла з ім пра некаторыя рэчы,– адказала дзяўчына.– Ён паехаў дубровaю адзін". – "Калі ты, гаворачы з ім, пра штосьці даведалася, дзеля Бога, скажы мне!" – "Не-не, бо я раней таго рыцара не бачыла; я нават не змагла даведацца ягонага імя, але ён не ад Акруглага Стала, не з двара караля Артыюша",– адказала дзяўчына. "Ці ты кажаш праўду?" – спытаў Паламідаж. "Так",– пацвердзіла дзяўчына. "Ох, мой Божа, я зняслаўлены і засмучаны яшчэ больш, як раней",– мовіўшы тое, зажурыўся Паламідаж і горка заплакаў. Адшпурнуў ён гелм і абодва мячы, а тарчу сваю кінуў на дарозе; затым сеў няўзброены на каня ды паехаў з плачам і ў вялікай журбе.

На тое гледзячы, шкадавала яго дзяўчына: "Дзеля Бога, рыцару, скажы мне, з чаго ты гэтак зажурыўся?" І расказаў ёй Паламідаж пра ўсё па парадку: "Пашанаваў мяне Бог у першым турнаі. А ў другім, калі ў той пашане быў я вышэй за іншых, з'явіўся адзін рыцар. Спачатку ён моцна і жорстка збіў мяне дзідаю, затым мячом і, нарэшце, прычыніў мне вялікую няславу перад такой колькасцю народу і перад такімі годнымі людзьмі. Пасля гэтага я цэлы год не змагу насіць зброі; бо калі б насіў,– думаў бы, як яму адпомсціць. Я прапаў – лепш памерці, як гэтак жыць". – "Пане, назаві мне сваё імя",– папрасіла дзяўчына. "Я Паламідаж",– адказаў той і, сказаўшы, спешна паехаў прэч.

Дзяўчына ж пайшла сваім шляхам – шукаць таго, хто ўзяў Балячую Варту; а быў гэта Анцалот з Локвы, які вандраваў па каралеўствах, выглядаючы сабе раўні і рыцарства. На яго пошукі быў выпраўлены таксама і Гаваон, які ехаў усюды, дзе чуў пра рыцарскія соймы. Вяртаючыся з турнаю, сустрэла дзяўчына пана Гаваона, які вельмі спяшаўся. Яны прывіталіся. "Прашу цябе, панна, скажы мне хоць што пра таго рыцара, які кагадзе адсюль з'ехаў і носіць белы знак ды зброю без чужога знака",– папрасіў Гаваон. "Скажу, калі скажаш мне пра таго, каго я шукаю". – "Каго ж ты шукаеш?" –"Шукаю вестак пра рыцара, які здабыў Балячую Варту". – "Мяркую, гэта той, каго ты сустрэла. Я таксама пра яго пытаюся",– сказаў Гаваон. "Не, гэта не ён,– запярэчыла дзяўчына,– бо ён там ніколі не быў, але паставаю і адвагаю падобны да таго рыцара". – "Калі так, паеду я з гэтае зямлі назад у Ландрэш: мо' пачую што пра таго, дзеля каго шмат пастараўся",– вырашыў Гаваон. "І я паеду з табою",– пастанавіла дзяўчына.

І паехалі яны разам, і прыехалі да таго месца, дзе Паламідаж выкінуў зброю. Гаваон пазнаў яе і сказаў: "Гэта зброя вельмі годнага рыцара". Ён падняў тарчу і павесіў яе на дрэва. "Каб ты толькі ведаў, як тужыў і плакаў той, хто пакінуў гэтую зброю, то нямала здзівіўся б",– сказала дзяўчына і распавяла Гаваону пра ўсё, што бачыла і чула ад Паламідажа. "Ці ведаеш, як ён завецца?" – спытаўся Гаваон. "Ён не пажадаў назвацца",– адказала дзяўчына. "Хацеў бы я даведацца пра яго ўсю праўду, каб распавесці пра тое каралю Артыюшу, ды й пры іншых каралеўскіх дварах таксама",– мовіў Гаваон. Потым селі яны на вялікі карабель і паехалі да караля Артыюша.

Спынімся тут і вернемся да пана Трышчана. Пакінуўшы дзяўчыну, Трышчан паехаў хутчэй. І прыбыў у горад, дадому, да Іжоты і Брагіні, і прыйшоў да іх уначы, хаваючыся. І стрэла яго Брагіня, якая хацела пачуць праўду пра турнай; і калі ўгледзела яго, падышла, прывіталася і спытала: "Мой добры і пачэсны пане, як табе павялося ў тваёй справе? Раскажы мне пра турнай, хто здабыў у ім гонар?" – "Любая мая панна, не магу цяпер табе нічога казаць",– адмовіў Трышчан. "Пане, скажы ж мне пра Паламідажа: ці не ён перамог у турнаі?" – папрасіла Брагіня. "Не магу табе нічога пра яго сказаць, хаця добра ведаю, што ён з тых годных рыцараў, слава пра якіх шырыцца па свеце. Але цяпер сталася так, што не здабыў ён гонару ў тым турнаі",– адказаў Трышчан. Яна ж, усміхнуўшыся, спытала: "А як табе, наш рыцар, павялося?" – "Я зрабіў, што хацеў. Прашу, не пытайся ў мяне пра большае",– адказаў Трышчан. На гэтым Брагіня пакінула яго ў спакоі, бо здагадалася, што не хочацца яму расказаць ні пра сваю няўдачу, ні пра свой поспех.

Падрыхтавала яму Брагіня добрую пасцелю, і паклаўся Трышчан спаць, бо быў моцна пабіты й апухлы ад удараў. Адпачнуў ён, колькі схацеў, назаўтра ўбачыў, што цела пасінела і ацякло ад мноства удараў. І пайшла людская пагалоска пра рыцара, які быў у турнаі ў светлым панцыры. Трышчан жа пазбягаў тых размоваў, бо не хацеў, каб пра яго даведаліся.

На трэці дзень вярнуўся кароль Ленвіз з дружынаю да свайго двара, а з ім прыехалі вялікія рыцары Гарнот, пан Бандэмагуль і Ован. І ні пра што не гаварылі яны, адно пра турнай і белага рыцара, ды яшчэ пра Паламідажа. І ўсе здзіўляліся, што белы рыцар згінуў без вестак. "Здаецца мне, гэта рыцар, які здабыў Балячую Варту, бо той рыцар заўсёды хаваўся",– сказаў Бандэмагуль Гарноту.

"Скажыце, што гэта за рыцар, пра якога вы гаворыце?" – спытаўся кароль. "Пане, мы гаворым

пра таго, каго мой бацька, кароль Артыюш, нядаўна пасвяціў на рыцара. Ён выявіў уласнай рукою такое рыцарства, якога людзі не бачылі й не чулі. Ды нікому няведама ні імя гэтага рыцара, ні хто ён такі",– адказаў Гарнот. "Калі ён перамог у бітве, а імя сваё трымае пад сакрэтам і не хоча, каб пра яго даведаліся, гэта вельмі годны рыцар",– сказаў кароль. І кожнае каралеўскае слова Трышчан успрыняў на сябе.

Брагіня была вельмі разумная і разважлівая дзяўчына, і ўспрыняла тыя словы да сэрца, і прыйшло ёй на розум: "А што калі гэта рыцар, якому я дала каня, зброю і тарчу?" І давай распытваць аднаго і другога пра белага рыцара, і даведалася напэўна, што гэта Трышчан быў уганараваны ў турнаі. Дужа з таго ўсцешылася дзяўчына і разважыла, дзе б ёй даведацца, як таго рыцара клічуць і скуль ён.

У той жа вечар прыйшла Брагіня да караля Ленвіза і мовіла: "Спадар кароль, пачуй жа, як таго і хацеў, пра белага рыцара, які перамог у турнаі". – "Дзяўчына, я вельмі хочу пра тое даведацца, бо на ўласныя вочы бачыў вялікую годнасць таго рыцара",– адказаў кароль. "Не турбуйся,– сказала Брагіня,– я навяду цябе на правільны шлях". – "Як скажаш праўду, буду табе вельмі ўдзячны".

Назаўтра ж сказала Брагіня каралю: "Ідзі за мною ў палац". Кароль пайшоў, і яна паказала на зброю і тарчу ды спытала: "Ці пазнаеш, калі бачыў яе ў тым турнаі?" – "Сапраўды, гэтая зброя і гэтая тарча былі на рыцары, які перамог у турнаі. Але ж, дзеля Бога, скажы мне, дзяўчына, калі што ведаеш пра яго!" – усклікнуў кароль. "Пане, калі ты ўсцешаны з гэтага, не буду трымаць ад цябе ў тайне: быў гэта рыцар, які цяпер у тваім доме, якога прыняў ты параненага і хворага і якога ацаліла твая дачка",– мовіла Брагіня.

Пачуўшы тое, здзівіўся кароль і не паверыў, каб Трышчан мог выявіць такую годнасць, і пачаў дапытвацца ў Брагіні: "Як жа ты даведалася, што гэта ён?" Яна ж распавяла яму пра ўсё па парадку: як дала Трышчану каня і зброю, і як ён да яе вярнуўся. Паклікаў тады кароль да сябе людзей, што былі з ім на турнаі, і спытаўся: "Ці вы пазнаяце гэтую зброю і тарчу?" – "Сапраўды, гэтая зброя перамагла ў турнаі",– адказалі тыя.

І ўсцешыўся кароль, а потым пайшоў да Трышчана і сказаў яму: "Годны мой рыцару, маю на цябе крыўду, што, да твайго гонару, ты столькі ад мяне таіўся. Калі жадаеш, скажы мне сваё імя". Пачуўшы тое, моцна спалохаўся Трышчан, што будзе апазнаны, бо ведаў – тут для яго рыхтуецца найвялікшае зло. Таму адказаў каралю: "Пане, ты для мяне зрабіў так шмат, што нікому не павінен я столькі, як табе. Да канца жыцця буду дзякаваць табе сваімі паслугамі, калі будзе якая патрэба ўва мне". – "Я не патрабую цяпер нічога, адно хочу, каб ты назваў мне сваё імя",– мовіў кароль. "Пане мой, цяпер не магу табе назвацца",– адказаў яму Трышчан. "Скажы ж мне хаця, у тым турнаі ці не ты насіў светлы панцыр, які дала табе Брагіня?" – спытаўся кароль. "На мне быў светлы панцыр, але шкада, што вы пра тое даведаліся",– сказаў Трышчан. "Рыцару, не шкадуй пра тое і паведамі пра свой учынак, якім ты аказаў мне вялікі гонар, бо з майго дому рыцар перамог у турнаі. За такое тваё рыцарства, за прыязнасць і годнасць абяцаю табе сваю каралеўскую прыязнасць",– мовіў кароль. Трышчан з вялікай пашанай падзякаваў каралю.

Пасля гэтага Трышчанава рыцарства было прызнанае і ў Арляндэі. Быў ён уганараваны каралём і ўсімі добрымі людзьмі. І не было пры ўсім каралеўскім двары панны або пані, якая не радая была б пакахаць яго ўсім сэрцам, калі б ён таго захацеў. Усе думалі, што яго тайна кахае Іжота, але тая мела цнатлівае сэрца, а кароль быў бы рады, каб Іжота пакахала Трышчана, а Трышчан – Іжоту і ўзяў яе за сябе. Ведаў кароль, што не знайсці дачцэ лепшага, як Трышчан, рыцара, і дужа шкадаваў, што не ведае ягонага імя; але ж не мог кароль надакучаць Трышчану роспытамі.

Аднаго дня мыўся Трышчан у сваім пакоі ў ванне, і прыслужвалі яму Іжота і мноства іншых дзяўчын; і кожная мела за вялікі гонар, што прыслужвала яму.

Прахаджваючыся там, нейкі чалавек па імені Кушын падышоў да Трышчанавага ложка і ўзяў ягоны меч. Выняўшы з похваў, пачаў ён разглядаць той меч, і ўбачыў, што добры й востры. І не мог ён здаволіцца, гледзячы на меч, таму прынёс яго да каралевы. Тая ж пачала разглядаць меч ды ўбачыла на ім шчарбіну. "Скажы, чый гэта меч?" – спыталася яна ў Кушына, і той сказаў. "Нясі яго за мною!" – загадала каралева. Кушын панёс, і ўвайшоў следам за каралевай у ейныя пакоі. А каралева выняла з куфэрка мечны абломак ды прыклала яго да Трышчанавага мяча. Той акурат падышоў, і зразумела каралева, што гэта меч, якім забілі ейнага брата Амурата. Пляснула яна сабе па твары і ўсклікнула: "Ох, мой Божа! Мой вораг, які забіў брата майго, караля Амурата, годнага рыцара, у нашым доме! Гэта Трышчан, таму ён і таіўся. А гэта – меч, які спрычыніў усім нам жалобу і прынізіў, і зганьбіў усю Арляндэю!"

Моцна ўгневалася каралева і, схапіўшы меч, кінулася да Трышчана. А прыбегшы, замахнулася на яго, каб пасекчы, але Трышчан схаваўся ў кадушку. "Трышчане! – усклікнула каралева – Ты загінеш ад гэтага ж мяча, якім забіў брата майго, караля Амурата! Цяпер жа памрэш ад мае рукі!" Трышчан ніколечкі не спалохаўся, а ягоны слуга падступіўся да каралевы і мовіў: "Пані, асцеражыся, не забівай рыцара: не гадзіцца табе, такой каранаванай пані каралеве, скрываваць свае рукі рыцаравай крывёю. Калі ён вінаваты, пакінь гэтую помсту каралю: ён зробіць, што палічыць слушным і патрэбным, каб адпомсціць за тваю

жалобу”. Пані ж не ўнімалася і хацела ўжо рубануць Трышчана, але хлопец не даў – схапіў яе за руку. Іжота ж, забыўшыся на прыстойнасць (бо пакутавала ад кахання да Трышчана), міласціва абараніла яго рукою. “Дачка мая, любая Іжота, што ты робіш?! – здзівілася каралева. – Гэта ж Трышчан, які забіў дзядзьку твайго Амурата!”

На той крык з’явіўся кароль: “Пані, з чаго ты гэтак угневалася?”. – “Спадару, як тут не гневацца? – мовіла каралева. – Знайшла я свайго найбольшага ворага, Трышчана, які забіў брата майго Амурата: таму ён і таіўся пры нашым двары. Або ты яго забі, або я сама. Вось гэта – меч, якім ён забіў Амурата, няхай жа і сам памрэ ад гэтага мяча!” Выслухаў яе кароль і здумеўся, бо ён быў разважны. “Супакойся, пані, пакінь гэтую помсту мне – я абыдуся з ім, як патрабуе справядлівасць, ты не пашкадуеш. – Забраў тут кароль ад яе меч і дадаў: – А цяпер выйдзі”. І каралева пайшла.

Кароль жа пачаў дапытвацца ў Трышчана: “Любы дружа, ці ты забіў Амурата?” – “Не магу больш таіцца, я забіў яго. Ніхто не мае права мяне ганьбаваць, бо так выпадала: або я заб’ю яго, або ён мяне – іначай і быць не магло”,– адказаў Трышчан. “Ты нябожчык,– мовіў кароль. – Апранайся і прыходзь да мяне ў вялікі палац”. І пакінулі з Трышчанам, покуль збярэцца, трох пахолкаў.

Трышчан хораша і годна ўвабраўся і ў вялікім смутку – найбольш праз тое, што не меў пры сабе свайго мяча – пайшоў у вялікі палац. Палац быў поўны годных людзей, паноў і паняў. Убачыўшы Трышчана, пачалі яны вельмі ўважліва разглядаць яго, бо быў прыгожы, вялікае годнасці й рыцарства. І дзівіліся ўсе з ягонай незвычайнай прыгажосці й цудоўнай знаходлівасці, якія выказваў ён сваёй рашучасцю й ветлівасцю. “Калі б памёр Трышчан, найпрыгажэйшы між рыцараў свету, – сказалі панны Іжоце,– усім людзям было б таго шкада”. І ўсе годныя людзі і рыцары казалі: “Бог сведка – няма больш на свеце такога рыцара. Было б вялікім грахом забіць яго праз таго, які ўжо не вернецца”. Затым прыйшла каралева і пачала назаляць мужу плачам, кажучы: “Пане, гэта мой вораг! Адпомсці яму, пакуль ён у тваёй уладзе! Як адпусціш яго – не будзе больш па тваёй волі”.

Кароль любіў каралеву і не ведаў, як тут абысціся. Ён доўга маўчаў, нічога не кажучы; нарэшце прамовіў, каб пачулі ўсе: “Трышчане, ты вельмі вінаваты перада мною. Але я, калі нават ніхто і не ўхваліць майго ўчынку, адпускаю цябе з мірам – выбаўляю ад смерці, якую ты меўся прыняць. Па-першае, я пусціў цябе ў свой дом нямоглага і беднага, вярнуў табе здароўе; па-другое, ты – рыцар, якому я ў свеце не ведаю раўні; па-трэцяе, ты забіў майго швагра Амурата не падступна, а згодна з рыцарскім звычаем – з трох гэтых прычынаў выбаўляю цябе ад смерці. Але зрабі, як я параю: калі ж так сталася, то як мага хутчэй уцякай з маёй зямлі й нідзе не спыняйся, каб я цябе нідзе не знайшоў, бо тады ўжо напэўна павінен буду забіць, калі здолею”.

Выслухаўшы, Трышчан вельмі годна падзячыў найперш Богу і каралю ды атрымаў ад караля і ўсіх прысутных людзей прабачэнне. Даўшы каня і зброю, адпусціў яго кароль з пашанай; а Брагіня дала двух сваіх братоў, каб прыслужвалі. І была Брагіня ў вялікай тузе, але не паказвала таго перад каралевай, бо тая гневалася на Трышчана, што кароль выбавіў яго ад смерці. “Гэта добра, што Трышчан вольны ад смерці за таго, які ўжо не вернецца”,– казалі Іжота і іншыя дзяўчыны. І паехаў Трышчан з таварышамі да прыстані, а людзі гаварылі пра яго і дзівіліся з ягонае годнасці і шляхетнасці.

І паплылі яны на судне, і быў ім спадарожны вецер, які хутка прыгнаў карабель у Карнаваль. Трышчан быў таму дужа рады і ад сэрца ўзнёс Богу хвалу. Адпачнуўшы там дзень і распытаўшы пра караля Марка і ягоных паноў, паехаў назаўтра Трышчан туды, дзе, як яму сказалі, быў кароль Марк.

І калі прыехаў Трышчан да двара караля Марка, з вялікай любасцю прывітаў яго кароль. І ўчынілі кароль і паны такі вялікі пір, нібыта прыйшоў да іх Айцец нябесны. І палюбілі паны Трышчана, як сваё сэрца. Кароль распытваў Трышчана, як яму павялося з таго часу, калі ён, нямоглы, адплыў за мора. Трышчан распавёў усё па парадку: як прынесла яго фартуна ў Арляндэю; як прыняў яго кароль да свайго двара і аказаў вялікую прыязнасць; як даручыў лячыць дачцэ сваёй Іжоце, якая лепш за любога лекара зналася на ацаленні ранаў; зноў распавёў пра ейную прыгажосць; як яго апазналі па мячы; як выбавіў яго кароль ад смерці і адпусціў з вялікай пашанаю. Але змоўчаў Трышчан перад каралём Маркам, як выбіў з сядла Паламідажа і перамог на турнаі. Стаўся Трышчан у народа Карнавалі ў такой вялікай пашане, як сам кароль Марк. Дзякуючы яму зрабілася вольнае Карнавальскае каралеўства, і многія краіны яго баяліся.

Жыла ў тыя часы дзяўчына, дачка аднаго князя, найпрыгажэйшая ва ўсёй Карнавалі. Пабраўся з ёй кагадзе рыцар Сегурадаж з Ландрэша – за яе прыгажосць, бо была яна, нібы кветка ружы. І так моцна закахаўся ў яе кароль Марк, што не было на свеце таго, чаго б не дзеля яе ўчыніў, адно каб яна па ахвоце яму аддалася.

Тая дзяўчына часта прыходзіла да каралеўскага двара на гульні. І вось аднойчы з’явілася яна на фэст, і кароль быў вельмі рады яе пабачыць. Заўважыўшы тую дзяўчыну, пачаў Трышчан яе ўважліва разглядаць, бо перад ім была найпрыгажэйшая пасля Іжоты панна; і запала яна Трышчану на сэрца, і выяўляў ён вялікую асцярожнасць, каб хаця хто пра тое не здагадаўся. Калі ж дзяўчына пабачыла Трышчана, найпрыгажэйшага і найвялікшага рыцара, прыйшло ёй

на розум: калі б пакахаў яе, то большага яна й не хацела б; бо ведала дзяўчына Трышчанавы годнасці і ўсімі думкамі сваімі была пры ім. Каб жа ж магла яна без ганьбы для сябе яго пакахаць! Ні на кім не спыняла пагляду, адно на Трышчану, і забывалася пры ім на астатніх людзей; а Трышчан забыўся на Іжоту. І паглядалі адно на аднаго з вялікай любасцю, і кожны здагадаўся, што іншы меў наўме. Калі пачало вечарэць, папрасіла дзяўчына ў караля прабачэня, шляхетна падступілася да Трышчана і разважна сказала: "Пане, калі хочаш, я твая!" – "Маеш да мяне вялікую ласку, пані,– адказаў Трышчан. – З вялікай ахвотай прымаю цябе, бо я твой рыцар".

Толькі гэта сказалі паміж сабою. Дзяўчына пайшла дамоў, несучы ў сэрцы сваім вобраз Трышчана, а прыйшоўшы, паслала хлапца, якому ва ўсім давярала, да Трышчана, пераказваючы: "Ідзі да Трышчана і скажы пакрыёма – хай прыйдзе да мяне на змярканні ды пагаворыць са мною. Хай прыходзіць пры поўнай зброі, бо не ведае чалавек, дзе яму што прыдасца. Прыязджайце абодва да затокі на ўзмор'і". – "Усё зраблю так, як ты хочаш",– адказаў хлопец.

Прыйшоў ён да Трышчана і, адвёўшы набок, перадаў яму просьбу сваёй пані. "Я рады зрабіць, як яна хоча. Ты ж не адыходзь нідзе з двара, паедзем разам,– сказаў Трышчан і, паклікаўшы слугу, загадаў: – На першым змярканні трымай майго каня асядланага і зброю напагатове, ды не кажы нікому".

І бачыў кароль Марк, як Трышчан размаўляў сам-насам з хлапцом. Зайшоў ён тады ў пакой да паноў і загадаў адтуль усім выйсці. "Пра што размаўляў ты з Трышчанам, маім сястрынцам?" – спытаўся кароль у хлапца. "Пане, не магу сказаць, адпусці мяне,– папрасіў Магуш. – Адно скажу, што твой сястрынец – ні сцюдзёна, ні горача". – "Я хачу, каб ты мне расказаў, хаця б і проці сваёй волі",– загадаў кароль. "Не гадзіцца мне выдаваць таямніцы – я стаў бы здраднікам",– адказаў хлапец. "Мусіш расказаць, інакш цяпер жа памрэш!" – прыгразіўся кароль. Дужа спалохаўся хлапец, і мовіў: "Спадару, я табе скажу, але ты, дзеля Бога, не кажы больш нікому". Кароль прысягнуў. І сказаў хлапец каралю, што пані паслала яго да Трышчана і што той збіраецца да яе паехаць.

Пачуўшы тое, кароль быў нямала засмучаны, бо сам хацеў авалодаць дзяўчынай, але тая яму адмовіла і ніякім чынам не выказвала да яго прыхільнасці. Сеў кароль у здуменні, і так разважыў: "Выпадае на тое, што яна адмовіла мне, такому вялікаму пану,– а я ж мог прычыніць ёй і зло, і дабро! – ды аддалася таму, хто не дасць ёй нічога і не такі годны рыцар, як я? Дапраўды, яна бязглуздая жанчына, і з таго мецьме вялікі клопат". Але не выдаў кароль Магушу сваіх думак – ён палічыў сябе лепшым, як Трышчан, рыцарам. І доўга думаў кароль, аж нарэшце сказаў Магушу: "Дзіўлюся я з тваёй пані, што так хутка закахалася ў Трышчана, ён жа яшчэ дзіця! Ведаю ж я рыцара, лепшага за Трышчана – таго, хто прагне ейнага кахання. У вялікім панстве сваім ён роўны мне, яна ж яму адмовіла".

"Пане, ведаеце, так часта бывае між мужчынам і жанчынай, – сказаў Магуш. – Іншы выбера сабе меншую і прыгажэйшую, а мог бы мець у два разы лепшую. Таксама і жанчына не хоча часам годнага рыцара або вялікага пана". – "Я і сам нямала дамагаўся яе, але і мне яна адмовіла,– мовіў кароль. – І за ейную бязглуздасць прычыню ёй смерць ды знішчу ейны дом!"

Пачуўшы тое, спужаўся Магуш, бо ведаў караля як найздрадлівейшага чалавека. І прыдумаў ён, каб кароль паехаў замест Трышчана, тады б аддалася яму панна па ўласнай волі. (А для пані лепшай была б смерць, чым гэта: потым Трышчан прычыніў бы каралю што ліхое.) "Пра што мысліш?" – спытаўся кароль у Магуша, і той адказаў, што думаў.

Зразумеўшы, што сваю пані Магуш зычыць яму больш, як Трышчану, дужа ўсцешаны быў кароль: "Ты мог бы зрабіць мне нямала дабра, бо я маю тваю пані на мыслі. Калі яна хаця раз прыйме мяне ў сябе, потым заўсёды будзе радая прыймаць". – "Пане, з радасцю зраблю ўсё, што змагу. Але што думаеш наконт Трышчана? Я абяцаўся пайсці з ім, а калі яму схлушу, мне не паздаровіцца",– сказаў Магуш. "Пра тое не турбуйся. Я вазьму з сабою панцырнага пахолка і пачакаю ля прыдарожнай студні, паўз якую вы паедзеце, і так пачастую там Трышчана, што забудзецца ён на любошчы з тваёй паняй. А ўладзіўшы справу, паеду з табою, і ты правядзеш мяне да пані замест Трышчана. І мецьмеш за тое вялікую выгоду". – "Я рады выканаць тваю волю. Але, дзеля Бога, скажы мне, як ты збіраешся паквітацца з Трышчанам, вельмі годным і моцным рыцарам? Дзеля Бога, не пускайся ў такую прыгоду, бо ён паедзе пры зброі",– сказаў Магуш. "Відаць, ты мяркуеш, што Трышчан мяцнейшы за мяне? – спытаўся кароль. – Не бойся, я адно прычыню яму ганьбу". І выйшлі кароль з Магушам з пакоя. Потым, ўбачыўшы Магуша, мовіць яму Трышчан: "Я гатовы паехаць". – "Яшчэ не час",– адказаў Магуш.

Тым часам кароль паклікаў слугу: "Падрыхтуй мне да змяркання каня і зброю, ды не кажы нікому". Узброіўшыся і сеўшы на каня, паехаў ён з пахолкам да прызначанага месца, а слуга панёс ягоную тарчут і дзіду. І калі даехалі да мора, кароль зсеў з каня і сказаў: "Тут пачакаем таго, каго запрасілі". Адпачываючы там, убачылі яны, што едзе Трышчан з слугою і Магушам.

Тады ўскочыў кароль на каня, а слузе загадаў: "Падай мне тарчу і дзіду!" – "Што збіраешся рабіць, пане?" – спытаўся слуга. "Едзе той, каго я ненавіджу. Няма мне суцяшэння, пакуль не ўкарачу яму жыцця!" – "Пане, прабач, ды здаецца мне,

што гэта няслушны ўчынак,– сказаў слуга. – Паколькі Трышчан у тваім доме, ты можаш і пры іншых абставінах зняславіць яго ды зрабіць з ім усё, што захочаш. Падступствам ты яму не папомсціш. Калі ён перад табой вінаваты, не кідайся ў такую прыгоду, сабе на смерць або на жыццё". – "Ну то глядзі ж!" – усклікнуў кароль.

І калі Трышчан быў зусім блізка, закрычаў кароль: "Рыцару Трышчане, сцеражыся мяне!" Здзівіўся Трышчан, убачыўшы рыцара, які яго чакае, ды ўхапіўся за тарчу і дзіду.

Бітва караля Марка з Трышчанам І сутыкнуліся яны моцна: кароль паламаў дзіду на часткі, Трышчан жа пацэліў яму ў самыя грудзі. Моцна пабіты, зваліўся кароль на зямлю, а Трышчан паехаў далей.

Дужа засмуціўся кароль, убачыўшы сябе пабітым, і прагнуў больш смерці, чым жыцця. А слуга скочыў з каня і сказаў яму: "Спадару, ці ты выжывеш?" – "А што з майго жыцця, калі не пазбудуся цяпер сораму да самае смерці і жалю свайму канца не бачу? Дай мне каня ды едзьма дадому,– мовіў кароль. – А куды ж паехаў Трышчан?" – "Не ведаю, праехаў міма",– адказаў хлапец. "Будзе яшчэ горш, калі ён мяне пазнаў". – "Як мог ён цябе апазнаць? – спытаўся юнак. – Ты ж у панцыры, а ноч цёмная". Кароль ехаў і думаў: "От мой Божа, каб не абярог мяне панцыр, – быў бы я цяпер нябожчык!" Убачыўшы, што адбылося паміж каралём і Трышчанам, Магуш з аднаго боку ўсцешыўся, а з другога – засмуціўся.

Назаўтра сядзеў кароль Марк у вялікім палацы, поўным усялякіх аздобаў, з сваімі панамі, панямі й паннамі за сталом. Аж увайшоў паспешна, але годна, у палац нейкі рыцар. Прывітаў ён караля ды ўсіх паноў і рыцараў, і сказаў каралю Марку: "Дай мне з ласкі сваёй адзін дар, якога я папрашу. Я – рыцар, з'явіўся ад Акруглага Стала: калі мне адмовіш – не мецьмеш добрае славы". Кароль паабяцаў яму дар і спытаўся: "Як ты завешся?" – "Імя мне Блерыж, я сваяк караля Бана Баноцкага,– адказаў рыцар. – Па рыцарстве мяне не многія ведаюць, бо я нядаўна стаў рыцарам. Ты абяцаў мне дар, які папрашу". – "Сапраўды, абяцаў, хаця магу з таго мець немалую шкоду",– сказаў кароль. "Дай ты мне пані або панну, якую я захочу",– папрасіў рыцар. "То вялікая справа,– мовіў кароль, – але так і будзе".

Рыцар яшчэ раз падзякаваў каралю і падышоў туды, дзе сядзеў рыцар Сегурадаж, а з ім – яго пані. Пакланіўся ёй Блерыж, узяў за руку, паставіў перад сабою і сказаў Сегурадажу: "Рыцар, не мець табе гэтае пані, пакуль не здабудзеш яе мячом!" Падскочыў да яго Сегурадаж і кажа: "Блерыж, калі не здабудзеш мячом, то не мецьмеш яе!" Тут Сегурадаж узброіўся, сеў на каня ды паехаў за Блерыжам, а дагнаўшы, крыкнуў яму: "Блерыж! Сцеражыся мяне, або аддай пані!"

Бітва Сегурадажа з Блерыжам І ўдарылі яны адзін аднаго так моцна, што паламалі дзіды. Сегурадаж, паранены ў рэбры, зваліўся на зямлю і так моцна пабіўся, што быў у цяжкім стане. А Блерыж паехаў з паняю; яна ж горка плакала па сваім пану.

Сядзеў кароль Марк з панамі пры сваім шатры ў цяньку, аж едуць два падарожныя рыцары. "Мне было б прыемна пачуць ад іх пра караля Артыюша і пра рыцара, што здабыў Балячую Варту",– сказаў кароль. Аўдрэт – новапасвечаны рыцар, пляменнік караля Марка і Трышчанаў сястрэнец, маці якога была аддадзена за караля Амурата ў Арляндэю з першай данінай – зайздросціў Трышчану ў ягонай годнасці. "Загадай, і я паеду ды прывяду іх – хай пагавораць з табой",– мовіў ён каралю. "Язджай жа хутчэй – распытай пра справы ў іхніх краях",– загадаў кароль. І Аўдрэт, няўзброены, паехаў.

Тым часам пад'ехала да караля адна дзяўчына ды пачала прыглядацца да людзей, нічога не кажучы і не вітаючы караля. Рыцары ж пачалі пасміхацца з ейнай дурноты і пераглядацца між сабой. "Дзяўчына, хопіць ужо на нас глядзець, нічога не кажучы! Што ты пра нас думаеш?" – спытаў кароль. "Пане, нічога благога я не думаю, толькі добрае,– адказала дзяўчына. – Хачу пабачыць аднаго рыцара". – "Як жа ён завецца?" – пацікавіўся кароль. "Трышчан",– адказала дзяўчына. Тады кароль загадаў паклікаць Трышчана; а той гуляў у шахматы. Калі ж ён прыйшоў, накінулася на яго дзяўчына: "Трышчане, злы і благі рыцар, страшнейшы за ўсіх! Што ты носіш зброю, а нягоднасці сваёй не заўважаеш?! Дзіўлюся я, як гэта ты можаш мець стасункі з годнымі людзьмі – ты ж няварты быць між рыцараў! Калі б ведалі яны пра цябе, такога злюку,– сорамам гарэлі б, бо ты ўсіх няславіш. Кажу табе гэта перад каралём Маркам і перад годнымі людзьмі – няхай ведаюць, што ты нягоднік! Вось, я сказала табе, дзеля чаго прыйшла". Трышчан стаў, як укапаны, і не ведаў, што й адказаць. "Прашу цябе, дзяўчына, скажы, у чым гэта Трышчан так завінаваціўся?" – спытаўся кароль. "Не хочу, каб ён зазнаваўся",– адказала тая і, сказаўшы, паехала прэч.

Прысаромлены, доўга думаў Трышчан над сказаным. У вялікай злосці пайшоў ён дадому і пачаў спешна ўздзяваць панцыр. Тут прыйшоў Гаварнар і спытаўся: "Навошта ўздзяеш панцыр?" І распавёў яму Трышчан усё па парадку пра сказанае дзяўчынай у прысутнасці мноства годных людзей. "Хачу ведаць, за што яна мяне згнюсіла і ў чым гэта я нягоднік. А зброю бяру не праз дзяўчыну: не ведае чалавек, што і дзе яму спатрэбіцца",– мовіў Трышчан. "Хацеў бы і я паехаць з табою",– сказаў Гаварнар. "Едзь",– пагадзіўся Трышчан. І паехалі яны як хутчэй за дзяўчынаю.

Ужо ў полі сустрэў іх Аўдрэт, які вяртаўся ад рыцараў. Дагнаўшы тых рыцараў, ён прывітаў іх і

спытаў: “Панове, скуль едзеце?” – “З двара караля Артыюша. Ездзім, шукаючы розных прыгодаў, бо мы падарожныя рыцары”,– адказалі тыя. “Ці ведама вам, што тутэйшым каралём з’яўляецца Марк? – спытаўся Аўдрэт. – Ён паслаў мяне, каб вы, у імя вашага гонару, ехалі да яго”. – “Мы б і радыя паслухацца каралеўскае волі, але маем іншыя патрэбы. Таму просім цябе: выбаў нас ад гэтага як мага больш прыстойна”,– адказалі рыцары Аўдрэту. “Калі не паслухаецеся, тым самым прычыніце спадару каралю ганьбу – нібыта ён для вас нішто. Праз тое вам можа стацца немалое зло”,– папярэдзіў Аўдрэт. “Пустое кажаш, мы туды не паедзем”,– адказалі рыцары. “Тады я завяду вас проці вашае волі, як самі не хочаце ехаць”,– сказаў Аўдрэт і ўхапіў за ўздэчку каня аднаго з рыцараў, які зваўся Сагрэмар. Бачачы, што Аўдрэт такі зухаваты – хоча павесці гвалтам, рассмяяўся Сагрэмар і мовіў: “Рыцару, здаецца мне, што ты дураваты, калі хочаш павесці мяне гвалтам!” – “Няхай сабе й так, пабачым!”– адказаў Аўдрэт. Выхапіў Сагрэмар меч і стукнуў плазам Аўдрэта па галаве, ды так моцна, што той зваліўся на зямлю і страціў прытомнасць, а з рота ў яго пацякла кроў.

Ачомаўшыся, устаў Аўдрэт, як у сне, і ледзь узлез на каня; і, праехаўшы трохі, стрэў ён Трышчана. Убачыўшы акрываўленага Аўдрэта, вельмі ж засмуціўся Трышчан, бо любіў Аўдрэта больш, чым Аўдрэт яго. “Хто цябе так пабіў?” – спытаўся Трышчан. Аўдрэт расказаў усю праўду. “А ты не дужа далікатны, калі вырашыў павесці гвалтам адразу двух рыцараў!” – заўважыў яму Гаварнар. Трышчан жа сказаў: “Мне дужа шкада твае ганьбы. Скажы мне, куды яны паехалі?” – “Я таксама паеду з табою”,– сказаў Аўдрэт.

Пачуўшы тое, сказаў Гаварнар Трышчану: “Ці ж ты разумны чалавек, калі хочаш біцца з двума рыцарамі з Ландрэшскага каралеўства?! Ты думаеш, што яны як карнавальскія рыцары? Прашу цябе, пакінь гэтую справу ў спакоі, бо яны вялікія і годныя рыцары – усюды па чужых краях шукаюць сабе промыслу, дзе толькі пачуюць пра рыцара. Дзеля Бога, не паддавайся на помсту!” – “Настаўнік, калі яны такія выбітныя, то й лепш: яны не біцьмуцца са мною ўдвох – што было б вялікай ганьбаю,– а па адным. Дасць Бог, не зведаю ганьбы!” – адказаў на тое Трышчан. “Воля твая”,– сказаў Гаварнар.

Трышчан дагнаў тых рыцараў і ўсклікнуў: “Рыцары, сцеражыцеся!” Тыя спыніліся. “Хацеў бы я з ім пазнацца бліжэй”,– сказаў Сагрэмар, а Дондыэль мовіў: “Няхай я буду з ім біцца!”

Бітва Трышчана з Дондыэлем Павярнуліся Трышчан і Дондыэль адзін да аднаго і сутыкнуліся так моцна, што Дондыэль разам з канём паваліўся на зямлю і ад таго падзення моцна пабіўся. І ўбачыў Сагрэмар, што Дондыэль пераможаны. “Калі здолею, то цяпер жа адпомшчу табе за яго!” – крыкнуў ён Трышчану.

Бітва Трышчана з Сагрэмарам І кінуўся Сагрэмар на Трышчана так спешна, як толькі конь мог скочыць. Ударыўшы, параніў яго Трышчан у левы бок, і паваліўся той разам з канём на зямлю.

Перамогшы абодвух рыцараў, сказаў Трышчан Аўдрэту: “Ты ўжо адпомшчаны і можаш ехаць да караля. Перадай яму: гэтыя рыцары не схацелі вяртацца. Але пра нашу бітву не кажы, бо няма патрэбы”. – “Хай будзе, як ты кажаш”,– пагадзіўся Аўдрэт. І дзівіўся ён з Трышчана, што той біўся з двума рыцарамі, бо не думаў, што Трышчан акажацца такім рыцарам.

Убачыўшы, што пераможаны, спытаўся Сагрэмар у Трышчана: “Скажы, дзеля Бога прашу цябе, з якое ты зямлі?” – “З Карнавалі”,– адказаў Трышчан. “Не магу паверыць”,– здзівіўся Сагрэмар. “Можаш не верыць мне, але ўсё так, як я сказаў”,– мовіў Трышчан. Пачуўшы тое, пачаў Сагрэмар моцна гараваць і плакаць. “З чаго ты гэтак гаруеш?” – спытаўся Трышчан. “Не так шкада мне, што я пабіты, як шкада мне, што пабіў мяне рыцар з нейкае Карнавалі, дзе адвеку не было годнага рыцара. Таму клянуся перад Богам не насіць зброі да таго часу, пакуль не ўбачу іншых рыцараў Акруглага Стала, пасаромленых благімі рыцарамі з Карнавалі”,– адказаў Сагрэмар і адкінуў прэч ад сябе тарчу, дзіду і ўсю сваю зброю; і ў вялікай тузе пачаў ён аплакваць сваё няшчасце і ганьбу. Здзівіўся з таго Трышчан і спытаўся: “Чаму ж ты не хочаш насіць зброі? Праз тое, што я вас перамог?” – “Скажу табе, чаму: калі б я паехаў да Акруглага Стала, і там даведаліся б пра нашую ганьбу – што я пераможаны нейкім паспалітым рыцарам з Карнавалі – рыцары б дакаралі мяне, што я не годны да нашэння зброі, бо ў Карнавалі жывуць самыя ўбогія рыцары. Таму лепш я сам выкіну зброю і сам сябе папікацьму, чым папікацьмуць мяне”,– адказаў Сагрэмар. Здзівіўся Трышчан з тых словаў. І гаварыў бы ён з Сагрэмарам яшчэ, але вечарэла, і Трышчан паспяшаўся за дзяўчынай.

Пакінуўшы рыцараў, паехаў ён шпарчэй за дзяўчынай. І стрэў аднаго хлапца. “Ці не бачыў ты дзяўчыны, што ехала на іншаходніку? – спытаўся ў яго Трышчан. – Не ведаю, мае яна дружыну ці не, але бачыў яе пры двары адну”. – “Бачыў я, што ехала яна з нейкім рыцарам і пахолкам, а з імі была дужа пекная і высакародная пані”,– мовіў хлапец. Усцешыўся Трышчан, пачуўшы тыя словы, і сказаў: “Гэта тая пані, якую павезлі з каралеўскага двара. Цяпер я атрымаю, што хочу!” І кінуўся даганяць тую пані і Блерыжа, які яе вёз; і ўгледзеў іх блізу нейкага горада ўжо тады, як яны заязджалі ў браму.

Зразумеў Трышчан, што не дагоніць іх ля горада і што ў тым горадзе яны хочуць заначаваць. “Настаўнік, каго хацелі, мы знайшлі – тую дзяўчыну, што мяне ганіла; тую пані, праз якую ненавідзіць мяне мой дзядзька; таго рыцара, які яе вязе. Але застала нас ноч. Калі б я дагнаў іх у полі,

то рыцар або адпусціў бы тую паню, або мне давялося б з ім біцца, пакуль не змог бы яго мячом. А цяпер і не ведаю, што маем рабіць",– сказаў Трышчан Гаварнару. "Ці ты хочаш біцца з тым рыцарам? – спытаўся Гаварнар. – Клянуся перад Богам: калі будзеш біцца з кожным рыцарам, які прыязджае ў Карнаваль, то мецьмеш шмат непрыемнасцяў! Ты ж ведаеш, што той рыцар перад табою не вінаваты і што ты не зможаш з ім біцца, калі ён не захоча!" На што адказаў Трышчан так: "Настаўнік, яшчэ як магу! Ты ж не раз чуў – маюць рыцары той звычай, што адзін другога могуць выклікаць на бой. Яны не лічаць тое за ганьбу: прынята, што вандроўныя і выбранецкія рыцары маюць паводзіцца менавіта так ды ўступаць у двубоі з рознымі рыцарамі, каб шырылася слава пра іхнюю годнасць. Таму я магу выклікаць яго на бой, і тым аказаць яму пашану. Настаўнік, як не буду біцца з годнымі рыцарамі, то не мецьму і славутасці, роўнай маёй годнасці. Калі ты супраць, значыцца, ты мяне не любіш!" Выслухаў яго Гаварнар і сказаў: "Як хочаш біцца з Блерыжам, я не супраць. Але прашу – будзь высакародны". – "Добра кажаш!" – пагадзіўся Трышчан.

Тае начы начаваў Трышчан у аднае старое ўласніцы-ўдавы. Мела яна маладога й адважнага сына. У той вечар хлапец уважліва прыглядаўся да Трышчана. "Пане, не крыўдуй на тое, што хочу сказаць". – "Кажы, што хочаш",– мовіў Трышчан. "Ці быў ты ў Арляндэі?" – "Чаму ты пра гэта пытаешся?" – пацікавіўся Трышчан. "Здаецца мне, што ты той самы рыцар, які быў у Арляндэі пераможцам у двух турнаях і рыцарству якога дзівілася ўся тая зямля", – адказаў хлопец. "Браце, нямала ёсць падобных з твару людзей. Я быў бы рады, каб так аказалася",– сказаў Трышчан.

Назаўтра, адбыўшы імшу, увабраўся Трышчан у панцыр ды паехаў за рыцарам. Дагнаўшы яго на полі, усклікнуў Трышчан: "Рыцару, сцеражыся мяне!" Блерыж абярнуўся і ўхапіў у рукі тарчу і дзіду (а тарча і дзіда ў яго былі вельмі добрыя).

Трышчанава бітва з Блерыжам І наляцелі адзін на аднаго – паказаць сваё рыцарства. І так моцна сышліся, што абодва з коньмі пападалі на зямлю. Пачалі яны сячыся мячамі па гелмах і зразумелі, што не перамагчы ім адзін аднаго – як двум ільвам, што ганяюцца па полі. І хутка абодва былі паранены, і пакарабацілі моцнымі ўдарамі адзін аднаму панцыры. Абодва разумелі, што аднаму з іх давядзецца прыняць ад другога ганьбу або смерць; абодвум патрэбны быў пярэдых. Блерыж адышоўся і паклаў тарчу і меч, каб адпачыць. "Гэта ні хто іншы, як Анцалот з Локвы!" – здзіўлёны, падумаў ён. А Трышчан таксама адпачываў. "Рыцар, я ведаю, што першы між годных рыцараў,– звярнуўся да яго Блерыж. – Прашу цябе, назаві мне сваё імя. Не кажу табе свайго дзеля таго, каб спачатку ты хоць нешта сказаў, а таксама каб ведаць мне, каго я перамог, або хто мяне перамог". – "Калі ты хочаш ведаць маё імя, то я – Трышчан з Еліонаса, сын караля Меліядуша",– адказаў Трышчан. Пачуўшы гэта, сказаў Блерыж: "У імя Гасподняе, я не хочу біцца з табою, бо чуў пра цябе шмат добрага. Я прызнаю перад табою сваю паразу: лічы, што ты перамог у гэтай бітве". І аддаў Трышчану меч.

"О пане, я не заслужыў такое пашаны. І тым больш яе не заслугоўваю, што таксама маю патрэбу адпачыць,– сказаў Трышчан. – Калі ты хочаш спыніць бітву, я буду рады. Але ты павінен аддаць тую пані, бо ехаў я ні па каго іншага, як па яе". – "Пане, не магу я гэтага зрабіць, бо табе ж вядома, што я дзідаю здабыў яе. Але, калі хочаш, зробім так: няхай сама вырашае, з кім пайсці – таму і будзе яна належыць",– сказаў Блерыж. "Добра",– пагадзіўся Трышчан. Паставілі яны паню між сабой і сказалі ёй: "Гэтая бітва адбылася праз цябе. Палюбі каго схочаш – хай спыніцца бітва". Яна ж падзякавала ім і адказала: "Трышчане, я была вельмі рада цябе бачыць і кахаць. Але, паколькі ты такі ліхі, што дазволіў нейкаму чужому рыцару павесці мяне з двара твайго дзядзькі, ніколі больш не пакахаю цябе!" І, павярнуўшыся, пайшла да Блерыжа.

Убачыўшы гэта, моцна зажурыўся Трышчан. Калі б ён аказаўся пераможаны, не быў бы такі сумны, бо ўсім сэрцам кахаў тую паню. І ад вялікае тугі не мог Трышчан вымавіць ні слова; і пайшоў да каня, і паехаў да двара караля Марка.

Давялося каралю Марку пачуць ад Аўдрэта, што Трышчан перамог абодвух тых рыцараў. Дужа спалохаўся кароль, што дойдзе Трышчан да вялікае славы, а ўпадабаўшы яе, адбярэ ў яго ўладанні. І сказаў, каб усе пачулі: "Любы мой сястрынец, нямала я чуў пра цябе такога, чаму не магу даць веры. Таму – не падумай благога – прысягні, што раскажаш мне ўсё і не ўтайніш нічога, пра што я ў цябе пытацьмуся. А табе з таго ганьбы не будзе".

Не хацеў Трышчан, каб дзядзька у ім зняверыўся, ды й Гаварнар раіў як мага ва ўсім яму дагаджаць. "Пане, я гатовы расказаць пра ўсё, з чаго не будзе мне ганьбы",– адказаў каралю. "Прысягні ж",– мовіў кароль. Трышчан прысягнуў.– "Прашу цябе, раскажы мне ўсё па парадку пра сваё рыцарства і што з табою сталася ад таго часу, як я пасвяціў цябе на рыцара". – "Як твая воля, а мне тое не цяжка",– адказаў Трышчан і распавёў каралю пра ўсё па парадку. І дайшоў да таго, што чыніў у Арляндэі, і слухалі яго з вялікім здзіўленнем: усе стаялі, як забыўшыся. І распавёў ім пра ўсё да выпадку з Блерыжам.

Кароль і Аўдрэт былі ў немалым смутку, астатнія ж усцешыліся. "Пане, больш за гэта не ўчыніў я нічога. Але, пане, забудзься на ўсё – яно для мяне нішто",– сказаў Трышчан. "Не, ні ў якім выпадку на гэта мне не забыцца! А ты, дасць Бог, станеш найвялікшым рыцарам у свеце. Ад гэтага часу я маю вялікую надзею і задаволены табою

больш, як раней",– мовіў кароль. А паны сказалі: "Цяпер, Карнаваль, не бойся, пакуль Трышчан з намі і пры добрым здароўі". І яшчэ мовіў кароль: "Дай яму Бог здароўя!"

Ды нікому не сказаў кароль, чаму быў у вялікай маркоце. Пачаў ён баяцца Трышчана. І не было ў свеце нічога, чаго б яму хацелася; толькі аднаго хацеў кароль – каб якім падманным чынам забіць Трышчана ды каб не даведаліся пра тое людзі. І здумеўся кароль, як тут парадзіць: "Бо не магу ж я ва ўсім яму дагаджаць! Як дам маху – тады я прапаў. Не было яго наогул на свеце – і я ніколі б і нікога не збаяўся". І гэтак ён маркоціўся, і прыйшла яму на розум думка, чым сябе супакоіць і як пазбыцца Трышчана.

Аднойчы прыдворныя, што апынуліся побач, сказалі каралю: "Міласцівы кароль, ты робіш неразумна, што не маеш жонкі!" – "Пане, сапраўды, ты павінен жаніцца,– падтрымаў іх Трышчан. – Больш паважалі б Карнаваль акаляючыя суседзі". – "Сястрынец мой, калі ты захочаш, я мецьму жонку,– адказаў яму кароль. – Ніхто не можа мяне ажаніць, толькі ты, і тое ад цябе залежыць: як захочаш, то знойдзеш мне прыгожую і годную жонку, якая падабалася б мне". – "Калі ад мяне залежыць, будзеш яе мець, хаця б і збыцца мне за тое жыцця,– адказаў Трышчан і прасцёр руку ў бок царквы, якую заўважыў наўздалёку. – Няхай дапаможа мне Бог і ягоная моц!"

"Мне здаецца, што яна ўжо побач са мною. Я назаву табе тую, якую хацеў бы мець,– сказаў кароль. – Памятаеш, ты расказваў мне пра адну дзяўчыну і прыўзносіў яе, што няма ў свеце раўні ейнай прыгажосці? Няхай жа яна будзе мне жонкай, і ніякая іншая. Гэта – арляндэйская каралеўна, пекная Іжота. Не марудзь жа, прывязі яе да мяне. І вазьмі, што табе будзе патрэбна – як мноства прыдворных, так і ўсяго, што вам спатрэбіцца".

Пачуўшы тое слова, здагадаўся Трышчан, што ненавідзіць яго дзядзька і пасылае ў Арляндэю на верную смерць. Хаця й варажыла яму з таго толькі няшчасце, Трышчан пастанавіў зрабіць так, як паабяцаў дзядзьку. Кароль жа сказаў: "Любы мой сястрынец, прысягні ж, што чэсна выканаеш маю просьбу". – "Пане, калі нават мне давядзецца памерці, ты ўсё адно яе мецьмеш",– адказаў Трышчан. Кароль падзякаваў і мовіў: "Рыхтуйцеся ж, ды загадзя парайцеся, як вам належна ўчыніць тую справу. Але не мецьме сэрца маё супакою, пакуль ты не вернешся і не будзе ў маім доме Іжоты!".

Трышчан і рады быў адгаварыцца ад падарожжа (бо разумеў, што пасылае яго кароль туды, дзе жывуць найгоршыя ворагі), і каяўся, што пагадзіўся, але ж не адмовіўся. Выбраў ён сорак маладых паноў, каб ехалі з ім. Яны ж былі ў вялікай маркоце, бо не спадзяваліся тае ганьбы – пабываць у найбольшага ворага. Аднак жа, хацелі-не-хацелі, а мусілі выпраўляцца ў дарогу.

Судна было падрыхтавана, падрыхтаваліся й яны. Моцна плакаў Гаварнар, кажучы Трышчану: "Цяпер ведаеш, як ненавідзіць цябе твой дзядзька! Гэтае падарожжа задумаў ён не так дзеля Іжоты, як дзеля тваёй смерці!" – "Настаўнік, не бойся,– адказаў на тое Трышчан. – Хаця і задумаў ён злое, але як дагаджу яму і ў адным, і ў другім, ён будзе вымушаны і жадаць мне дабра, і чыніць дабро". – "Дай табе Бог дабра!" – усклікнуў Гаварнар.

У вялікай раскошы, усяго маючы дастаткова і шмат, выправіўся пан Трышчан са сваёй дружынаю на судне ў мора. Плывучы, ладзілі яны гульні й забавы, як гэта бывае паміж рыцараў і маладых людзей. А прыгадваючы, куды плывуць, не ведалі, што й казаць; а Трышчан весяліў іх і ўсё зводзіў на жарты. Яны таксама весяліліся й спадзяваліся на Трышчанава рыцарства, ды казалі: "З Трышчанам не зазнаем ліха!".

І быў ім супраціўны вецер. Маракі перастрашыліся, і знемагалі яны, і не маглі кіраваць суднам, і пусцілі яго на волю ветру, просячы Бога: "Божа, злітуйся і выбаў нас ад смерці". І было так дзень і ноч, а назаўтра вецер аціх і мора супакоілася. І апынуліся яны наўздалёку аднаго горада, які называўся Дамалот – сталічны горад караля Артыюша, бо быў гэта самы багаты й раскошны з усіх гарадоў, і стаяў той горад на ўзмор'і. А калі яны там апынуліся, караля Артыюша не было ў горадзе: з невялікай дружынай паехаў у Кардуэль.

"Дзе мы?" – спытаўся Трышчан у маракоў. "Мы ў Вялікай Зямлі",– адказалі тыя. "Не боймася ўжо ды ўздайма хвалу Богу, што мы ля берага: тут знойдзем сабе адпачынак і забавы, хвалячы Бога, што прынёс нас жывымі да берага",– сказаў Трышчан. І зрабілі так: напялі шэсць вялікіх шатроў, вынеслі тарчы й зброю, павыводзілі коней ды стаялі ў тым месцы, [бавячы час] у гульнях і забавах.

У той самы час ехалі два вандроўныя рыцары, якія, не ведаючы адзін аднаго, стрэліся на дарозе (пры кожным было па слузе). Адзін рыцар зваўся Яшчор, ён быў братам Анцалота, а другі – Марганор. Яшчор нядаўна, тыдні з чатыры таму, быў пасвечаны на рыцара, але і тыдня не бавіў пры двары – паехаў шукаць фартуны. І здарылася з ім нямала добрага, бо ён быў з годных рыцараў і вельмі высокі сэрцам сваім. Марганор быў старэйшы гадамі і нікім яшчэ не быў пераможаны, але не меў такога сэрца, як Яшчор.

Пад'ехалі яны бліжэй да шатроў і ўбачылі тарчы й гелмы. "Гэта вандроўныя рыцары прыпыніліся ў халадку, а тарчы яны паклалі паводле ландрэшскага звычаю: каб усе, хто едзе міма, біліся з імі. Калі б хто праехаў міма і не пазмагаўся з імі, то была б яму ганьба",– разважылі Яшчор і Марганор. "Маем бітву: яны чакаюць нас або каго іншага. Калі не будзем з імі біцца, то ганьба нам",– сказаў Марганор. "Ну, то

ў імя Божае!” – сказаў Яшчор. І падрыхтаваліся яны да бітвы, як мае быць.

А быў з Трышчанам адзін рыцар, які ведаў той ландрэшскі звычай, бо вандраваў па зямлі караля Артыюша. “Трышчан, – сказаў ён, – бачыш, тыя два рыцары рыхтуюцца да бітвы, бо, угледзеўшы пры шатры нашыя тарчы, не могуць праехаць без бою”. – “Ці ж гэта ў іх такі звычай?” – пацікавіўся Трышчан. “Так”,– адказаў рыцар. “Блаславёныя тыя, якія звычай гэты ўстанавілі! – усклікнуў Трышчан. – А мы не ўпусцім нагоды, дайце мне зброю!” – “Навошта?” – спыталіся астатнія. “Ці бачыце тых двух рыцараў, што збіраюцца ў бой?” – спытаўся Трышчан. “А калі мы не схочам з імі біцца?” – спыталіся тыя. “Як збаімося тых двух рыцараў, то не возьмем Іжоты з Арляндэі, дзе інакш, як праз бітву, яе не здабудзеш”,– сказаў Трышчан.

Трышчанава бітва з Марганорам Падрыхтаваўшыся, ускочыў Трышчан на каня і крыху ад’ехаўся ад шатроў. “Рыцар ужо падрыхтаваўся,– сказаў Марганор Яшчору. – Як хочаш, то едзьма да яго”. Будучы маладзейшы, Яшчор не хацеў кідацца паперад. А Марганор пад’ехаў бліжэй і што сілы ўдарыў Трышчану ў тарчу, аж дзіда ў яго пайшла на трэскі. Але Трышчан ніяк не пацярпеў ды што моцы ўдарыў Марганора ў адказ: той упаў на адзін бок, а конь яго – на другі. І ці не параніўся Марганор, бо моцна пабіўся пры падзенні.

Трышчанава бітва з Яшчорам Збіў Трышчан аднаго рыцара і скіраваўся да другога. Яшчор жа так стукнуў яго, што дзіда разляцелася на кавалкі; тым ударам прабіў ён Трышчанаву тарчу і панцыр і крыху параніў яго ў левы бок. Трышчан жа ўдарыў Яшчора так моцна, што той зваліўся на зямлю.

Бачачы, што пабіты, ускочыў Яшчор на ногі і схапіўся за меч. “Рыцар,– усклікнуў ён да Трышчана,– біўся ты дзідаю, біся ж яшчэ і мячом, пакуль не пераможа адзін з нас!”. – “Не хочу, бо няма мне за што з табой біцца,– адказаў Трышчан. – А змагаліся мы дзеля звычаю, і больш біцца не жадаю”. – “Давай жа хоць трохі”,– мовіў Яшчор. “Не жадаю”,– адказаў Трышчан. Яшчор моцна здзівіўся і спытаўся: “Хай табе Бог памагае, хто ж ты, што так баішся ўдару мяча?” – “Я з Карнавалі”,– адказаў Трышчан. “Ці ж ты сапраўды рыцар караля Марка?” – спытаўся Яшчор. “Я, і ўсе тыя, каго ты бачыш”,– адказаў Трышчан. “У ліхі час прыйшлі вы ў гэтую зямлю, бо я зганьбаваны”,– мовіў Яшчор. “Чаму?” – спытаўся Трышчан. “Калі хтокольвек пачуе, што я збіты табою, то кожны ўважыць мяне за благога рыцара. Я не варты насіць зброю”,– адказаў Яшчор і адшпурнуў ад сябе тарчу й меч ды заплакаў, праклінаючы сябе самога. “Што ты робіш, пытаюся?” – здзівіўся Трышчан. “Не хочу насіць гэтай зброі, ані ездзіць на гэтым кані, на якім зведаў ад нейкага рыцара такую ганьбу, што застаецца мне толькі йсці пешшу”,– адказаў Яшчор і пусціў каня ў поле. А Трышчан засмяяўся з таго і мовіў: “Рыцар, сорамна мне адпускаць цябе пешага: калі не хочаш гэтага каня і зброі, вазьмі майго каня і зброю”. – “Не дай таго Бог, бо меў бы шчэ большую ганьбу, калі б уздзеў карнавальскі панцыр”,– сказаў Яшчор і пайшоў пешшу, пакінуўшы каня і зброю ў полі; з ім паехаў і зажураны Марганор. Трышчан жа вярнуўся да таварышаў і распавёў ім пра Яшчоравы словы. І дзівіліся ўсе.

Назаўтра, стоячы на тым самым месцы, угледзелі яны, што плыве ў іхні бок, да прыстані, вялікае судна. І прыстала судна да берага, а ў ім аказаўся сам кароль Ленвіз Арляндэйскі. І прыстала на адлегласці стралы. Пазыходзілі рыцары на бераг і ўставілі шацёр, павыводзілі коней. А кароль асядлаў каня і паехаў да Трышчанавых шатроў, і пад’ехаўшы, спытаўся: “Адкуль такая дружына?” – “З Карнавалі”,– адказалі яму. “Якая ж патрэба прывяла вас сюды?” – пацікавіўся кароль. “Злая прагода”. – “Ці ёсць тут Трышчан?” – спытаўся кароль. “Ёсць, вунь адпачывае ў шатры. А адкуль жа вы, што пытаецеся пра Трышчана?” – спыталіся ў караля. “Я – рыцар з Арляндэі, і вельмі хацеў бы з ім пабачыцца,– адказаў кароль. – Спадзяюся, ён будзе рады пабачыцца са мною”. – “Як жа ж ты завешся, каб мы маглі яму перадаць?” – “Скажыце яму, што імя мне – Ленвіз”.

Пачуўшы згадку пра Ленвіза, ускочыў Трышчан і спытаўся: “Дзе ён?” – “Чакае цябе там”,– адказалі яму. Трышчан кінуўся шпарчэй і ўбачыў перад шатром караля, і ў вялікай радасці падбег да яго. І абняліся яны вельмі любасна і пыталіся адзін у аднаго, што каму сталася ад часу расстання. “Я дужа рады, што адшукаў цябе”,– сказаў кароль. “Пане, а якая табе ёсць ува мне патрэба? – спытаўся Трышчан. – Зведаў я вялікую шану пры тваім двары, а нядаўна ты збавіў мяне ад смерці. Я абяцаўся, што няма на свеце таго, чаго не зрабіў бы для цябе, адно каб без ганьбы для імя свайго”.

“Вялікая твая ласка,– мовіў кароль. – Скажу табе, дзеля чаго я прыехаў сюды, у Ландрэшскае каралеўства. Пасля цябе ў Арляндэі часта ладзіліся турнаі, у якія прыязджала нямала годных рыцараў з Ландрэша, з Галіюша і з іншых краёў. І было колькі турнаяў пад тым горадам, дзе ты перамог Паламідажа. І прыехалі туды чатыры рыцары – высокага роду, крэўныя караля Бана Баноцкага – і перамаглі ў тым турнаі. Я запрасіў іх у свой дом на пастой. І прыехалі яны, а з імі шмат іншых рыцараў, у той горад, дзе і ты спыняўся. І будучы яны там, сталася за мае грахі, не ведаю за якія, што аднаго з іх забілі ў маім доме – чаго не хачу трымаць у тайне, але Бог сведка – няма тут маёй віны. Дужа шкадаваў я пра тое. То ўспамажы мне Бог! Лепш мне збыцца добрага замку, як стацца таму злу ў маім доме! Даведаўшыся пра забойства, тыя тры рыцары, што былі з ім,

гневаліся на мяне, ды не маглі нічога зрабіць мне ў маім доме. І адзін з іх, па імені Бланор, сказаў: "Кароль Ленвіз, мы прыехалі ў твой дом, пакліканыя як да сябра, а ты ўчыніў нам як вораг – па-здрадніцку забіў ва ўласным доме нашага брата. Мы не можам нічога з табою зрабіць тут, але ты разлічышся са мной у бітве пры двары караля Артыюша". І, сказаўшы гэтак, паехаў. Іншыя ж рыцары, што былі там, гаварылі тое самае, бо ўсе шкадавалі пра здарэнне. Надоечы прынеслі мне ліст ад караля Артыюша: кліча мяне і дае тэрмін, у які маю з'явіцца да іх на бітву і адвесціся няпраўды, узведзенай на мяне Бланорам праз смерць яго сваяка. Шле мне Артыюш вестку, што калі я не з'яўлюся – загіну як здрайца. На гэтую позву мушу з'явіцца, бо кароль Артыюш настолькі моцны, што можа мяне загубіць. Між усіх маіх людзей няма чалавека, здатнага да бітвы з Бланорам. Сам жа ж не пачуваюся аж так моцны, каб адвесці ад сябе ягоную хлусню, бо ён з ліку тых годных рыцараў, якія слывуць па свеце. Вось праз гэта я ў вялікім смутку, і не ведаю, што й рабіць. Але за тую дабрыню, якую зведаў ты ў маім доме, наважваюся прасіць, каб ты прыняў за мяне бітву з Бланорам. Спадзяюся на тваю ласку". Так сказаў кароль Ленвіз Трышчану. Выслухаўшы, вельмі ўсцешыўся Трышчан і падумаў пра сябе: "Ужо ж мецьму Іжоту – тое, па што з'явіўся". Каралю ж Ленвізу адказаў так: "Пане, ты шмат зрабіў для мяне, і я гатовы зрабіць для цябе ўсё. Але дамовімся: дасць Бог, спраўлюся з гэтым – дай мне дар, якога ў цябе папрашу". З вялікай радасцю абяцаў яму кароль так і зрабіць. І пачалі Гаварнар і ўсе карнавальскія ды арляндэйскія паны казаць, каб пачулі прысутныя там ад абодвух бакоў людзі: "Трышчан гатовы біцца з Бланорам за праўду. А кароль абяцаў яму дар, якога, уладзіўшы гэтую справу, папросіць Трышчан". І пыталіся ўсе ў караля: "Ці так?" – "Так",– адказваў кароль, а Трышчан пацвярджаў: "Сапраўды так".

І ўдарылі тут з абодвух бакоў у бубны і затрубілі ў трубы. І быў вялікі пір, бо ведалі арляндэйцы, што Трышчан – вельмі годны рыцар. "Калі дзеля гэтай патрэбы знайшлі Трышчана, то Бланор ужо, лічы, пераможаны",– казалі яны. "А мы мецьмем тое, чаго хочам",– казалі карнавальцы. "Калі вы мяне любіце,– сказаў Трышчан адным і другім,– то не кажыце ні хто я, ні адкулья, як і пра тое, што маю прыняць гэту бітву". "Пане, хай будзе па тваёй волі",– адказалі яны. І зышліся арляндэйцы з карнавальцамі.

У час таго піру пад'ехала да шатра адна дзяўчына. Мела яна пры сабе толькі дабротную тарчу без усялякіх адзнакаў – не такую, як іншыя тарчы: была на ёй маляваная нейкая пані і рыцар, які яе цалаваў. І была тая тарча расшчэпленая пасярэдзіне, і немагчыма было якім чынам яе сцягнуць (а тая тарча была расшчэпленая між вуснаў рыцара й пані).

Трышчан і іншыя падзівіліся з таго ды спыталіся ў дзяўчыны: "Адкуль ты?" – "Я – госць з чужога краю. Я паслана ад аднае пані да другое, [яшчэ] большае",– адказала тая. "Прашу, раскажы ж мне, як маеш ахвоту, чаму расшчапілася гэтая тарча? Ці нельга яе якім чынам сашчапіць?" – спытаўся Трышчан. "А хто ты такі, што пытаешся ў мяне?" – пацікавілася дзяўчына. "Я – госць з чужога краю",– адказаў Трышчан. "Як хочаш ад мяне пра што даведацца, скажы мне сваё імя",– мовіла дзяўчына. "Імя мне – Трышчан, я пляменнік караля Марка Карнавальскага". – "Пане,– сказала тая,– ад многіх людзей чула я пра цябе нямала добрага, таму раскажу табе.

Жыве ў гэтай зямлі такі вялікі рыцар, што ні блізка, ні далёка няма яму раўні. І кахае ён адну пані з гэтае зямлі, вельмі высокую родам. Так шляхетна яе кахае, як самога сябе, а пані яго таксама. Але яны шчэ не пазналіся цялесна, толькі цалаваліся. На гонар таго кахання, як бачыш, і зроблена гэтая тарча. І ніякім чынам нельга яго злучыць, пакуль не злучацца яны і не споўняць свайго намеру і добрае волі – тады злучыцца і гэтая тарча". "Назаві ж мне, дзяўчына, імя таго рыцара",– папрасіў Трышчан. "Гэтага я табе ні за што не скажу ",– мовіла тая.

"Дзяўчына, ці ж кароль Артыюш у Дамалоце?" – спытаўся Трышчан. "Не, ён у Кардуэлі, але пакінуў караля Кордаса і караля са Згоцыі паглядзець на тую бітву, што будзе паміж арляндэйскім каралём і Бланорам. Пры двары цяпер многа годных рыцараў з пелемені караля Бана Баноцкага, якія прыехалі дзеля тае бітвы". – "А што ж той рыцар, з кім мае біцца кароль?" – спытаўся Трышчан. "Вельмі годны рыцарствам",– адказала дзяўчына.

Затым дзяўчына выправілася ў Кардуэль, бо спадзявалася знайсці там таго, каго шукала. А была гэта дзяўчына аднае пані з Локвы, якая была вялікай зёлачніцай, чараўніцай,– большай, чым іншыя ведзьмы. А навучылася яна чараўніцтву ад Мерліна-прарока. Той Мерлін шмат ведаў пра будучыню, але ж ндапусціў безразважна, што згубіла яго тая, якую кахаў усім сэрцам і якой цалкам даверыўся. Яна ж уласнаручна пазбавіла яго жыцця, зачыніўшы пад зямлёй у магіле, зачараваўшы так, што той не здаваў сабе справы. І сталася з таго вялікае зло, што загінула праз тую жанчына гэткая мудрасць. А тая пані з Локвы, пра якую я вам распавяду, ведала ўсё, што адбывалася паміж каралеваю Веліверaю і Анцалотам. Хацела яна даведацца ўсё пра тую справу, і з тым выправіла да каралевы дзяўчыну з тарчай. І даручыла ёй, каб пачула каралева Велівера, што азначае тая тарча і пабачыла яе на свае вочы; ды яшчэ каб затрымала дзяўчыну пры сабе, пакуль не злучыцца панна з Анцалотам – вельмі хацела даведацца, ці зыдзецца тады й тарча. Тут спынімся.

У той час Анцалот быў у прынчыпа Галіёта, які яго вельмі любіў. Анцалот жа хутчэй абраў бы

смерць, як пазбыцца з ім таварышавання. І калі б Анцалот раптоўна памёр – Галіёт і ўсе рыцары дужа б яго шкадавалі, бо ніхто не меў такой моцнай рукі й высокага сэрца, як Анцалот.

Трышчан зноў пайшоў да караля Ленвіза і распавёў яму пра ўсё, што чуў ад дзяўчыны, і пра Бланора – што той прыбыў да двара караля Артыюша, і як кароль Артыюш пакінуў двух каралёў паглядзець бітву. "Маеце паспяшацца,– мовіў кароль Ленвіз. – Хай паможа нам Бог і ўганаруе, калі мая праўда".

Так яны размаўлялі, аж ізноў едзе, плачучы, тая дзяўчына. Трышчан стаў, як забыўся, а потым пакінуў караля і хутчэй пайшоў да дзяўчыны. "Што з табой сталася?" – спытаўся ён. "Пане,– кажа тая,– нейкі рыцар адняў у мяне тарчу, якую я везла. Я прапала, не ведаю, што й рабіць: ён мяне ледзь не забіў, што я не хацела аддаць тарчы. Цяпер не магу ні вярнуцца, ні рушыць далей, куды йшла". – Разгневаўся Трышчан ды кажа: "Тарча будзе пры табе. Скажы мне, куды падаўся рыцар?" – "Проста па дарозе",– адказала дзяўчына. Трышчан хутчэй увабраўся ў панцыр (а з ім быў адзін са слугаў) і паехаў за тым рыцарам, і неўзабаве яго дагнаў.

А пры тым рыцары былі два зброяносцы. Убачыўшы рыцара, крыкнуў яму Трышчан: "Вярні дзяўчыне тарчу, або сцеражыся мяне!"

Трышчанава бітва з Брэўсам І наляцеў Брэўс на Трышчана, і ўдарыў яго што моцы, і зламаў дзіду. А Трышчан так стукнуў Брэўса, што дзіда прайшла таму правае плячо і ён упаў на зямлю. А калі Трышчан ухапіў дзіду, то [Брэўс] знепрытамнеў ад болю. Трышчан жа, хочучы ведаць, хто ён такі, саскочыў з каня і зняў яму гелм з галавы. "Ты – нябожчык, калі не паабяцаеш зрабіць тое, што я табе загадаю!" – усклікнуў Трышчан. Той, бачачы сваю галаву непакрытай і будучы ў сямротным страху, дастаў свой меч і працягнуў Трышчану, і прысягнуў зрабіць усё, што той загадае. "Сядай на каня,– загадаў Трышчан,– вазьмі тарчу ды едзь за мною".

І той сеў на каня і паехаў. І калі былі неўздалёку шатроў, вярнуў Трышчан дзяўчыне тарчу, сказаўшы: "Я гатовы зрабіць усё, што пажадаеш". – "Не хочу ад цябе большага, толькі тарчу",– адказала дзяўчына. Тады спытаўся Трышчан у Брэўса: "Хто ты?" – "Брэўс",– адказаў той. "Ці ж ты напраўду Брэўс?" – спытаўся Трышчан. "Так завуць мяне людзі",– адказаў той. "Я чуў, як людзі дрэнна адзываліся пра цябе. Каб я не пусціў цябе вольна, то папомсціў бы табе за тваю злосць і здраду. Але йдзі ў спакоі". А дзяўчына вельмі хораша падзякавала Трышчану і паехала сваім шляхам.

А Трышчан паехаў да караля Ленвіза, і сказаў яму кароль: "Едзьма туды, дзе нас чакаюць".– "Хай будзе так",– пагадзіўся Трышчан. І, падрыхтаваўшыся належным чынам, паехалі яны ў Дамалот. І праязджалі паўз каралеўскі двор, а перад тым дваром сядзела шмат годных людзей. Паводле панскага звычаю, Трышчан ехаў са сваёй дружынаю, і ехаў у гелме, бо не хацеў, каб яго пазналі. Адзін рыцар нёс дзіду, а другі – тарч. А ў той час былі пры двары ўсе годныя рыцары – сваякі караля Бана Баноцкага. Былі там і тыя два каралі, якіх кароль Артыюш пакінуў паглядзець бітву.

Заўважылі тыя сваякі арляндэйскага караля, які збройна прыехаў зняць з сябе паклёп, узведзены Бланорам; заўважылі яны таксама падрыхтаванага да бітвы і хораша апранутага юнака. І пыталіся пра яго, і не маглі даведацца. Падышоў кароль Ленвіз да тых двух каралёў і сказаў: "Панове, я гатовы аддзяліць праўду ад паклёпу, які ўзведзены на мяне іншым". Сваякі ж Бана Баноцкага, падышоўшы, мовілі: "Мы хочам табе паказаць, як падманным чынам змярцвіў ты ў сваім двары нашага адзінапляменніка".

"Як будзе Божая воля, праз меч укажу табе, хто з іх найлепшы рыцар",– мовіў рыцар Бланор і, на знак выкліку на бой, паклаў пальчатку. Трышчан падышоў да двух каралёў і сказаў: "Панове, я бяру на сябе бітву арляндэйскага караля, бо ён не вінаваты ў смерці таго, хто забіты ў ягоным доме". І ўзяў пальчатку. "То едзьце ж, не марудзячы,– сказалі каралі. – І канец тым размовам".

Бланор пайшоў увабрацца ў панцыр, і ўвабраўся ў самы вялікі. Яго агледзелі, далі добрага і вялікага каня, які належаў каралеўскаму прынчыпу Галіёту. Блерыж панёс Бланораву тарчу, а іншы рыцар – дзіду. І паехалі з вялікай дружынаю за горад, і ніхто з іх не быў у панцыры, толькі Бланор. А як былі ўжо на полі, вывеў кароль Ленвіз Трышчана і сказаў, плачучы: "Прашу цябе, дзеля Бога, сцеражыся й не бойся". – "Калі Бог захоча ўказаць на таго, хто жыве ў праўдзе, то я збаўлю цябе ад Бланора",– мовіў Трышчан і, ухапіўшы тарчу і дзіду, смела стаў на полі. "Вось рыцар, з якім маеш біцца,– сказаў Блерыж Бланору. – Па ім відаць, што ён умее годна трымацца ў сядле і насіць зброю. Памятай, што ніводны рыцар з нашага роду не быў такі благі, каб не адстаяў гонару. Такую ласку даў нам Бог. А цяпер сцеражыся, каб мы не былі табою прыніжаныя". – "Браце, не адчайвайся",– мовіў Бланор.

Трышчанава бітва з Бланорам І так выехалі яны на поле. І калі ўбачыліся Трышчан з Бланорам на полі, то пусціліся адзін да аднаго і сутыкнуліся так, што абодва паламалі дзіды, пападалі з коньмі на зямлю і абодва параніліся й пабіліся. І ў вялікай адвазе паўскоквалі і пачалі што моцы сячыся па гелмах, не саступаючы адзін аднаму. І ўсе, хто там быў, дзівіліся з таго, што яны чынілі. "Божа любы!– мовіў кароль Кордас.– Было б вялікае няшчасце, каб загінулі два гэтыя рыцары. Бачу я, якія яны спрытныя й дужыя". А рыцары секліся без супыну, і хутка аслаблі на іх панцыры і паадпадалі ў тарчах падвязкі; і параніліся ў многіх месцах.

Дзівіўся Трышчан з Бланора (а Бланор таксама). “Ні адзін чалавек не бачыў ‘шчэ такога чалавека”,– думаў ён пра Трышчана. І абодва баяліся смерці ці ганьбы. Зразумеў Трышчан, што Бланор – годны рыцар, якога не бачыў ён за ўсе дні жыцця свайго; і адчуў, што ўсёй моцаю сіліцца Бланор, але доўга не стрывае, і пачаў выцясняць яго з поля. І была тут моцная бітва, і казалі ўсе: “Гэтыя рыцары – з годных рыцараў!” – “Бачу я, што гэты рыцар не мае сабе ў свеце раўні,– сказаў Блерыж сваёй дружыне. – Нават Анцалот не такі – я бачу па ўдарах. Пабачыце, што Бланор таксама не зможа стрываць да канца”. Арляндэйскі кароль, бачачы адвагу Бланора – што той трымаецца супраць Трышчана – моцна спужаўся.

І пакуль яны рубаліся, аслаблі іхнія ўдары. “Хацеў бы я ведаць, колькі ты яшчэ вытрываеш”,– падумаў Трышчан. І была ім патрэба перадыхнуць. Бланор больш не мог: паклаў тарчу і меч ды лёг на зямлю, меў страх перад смерцю; Трышчан зрабіў тое ж. А як добра адпачнулі, Бланор, які лічыў, што прапаў, падумаў: “Калі толькі ён не знясіліцца зноў, я не стрымаю ўдару”. А Трышчану сказаў: “Рыцару, ведама мне, што ты – найвялікшы на свеце рыцар, таму хачу ведаць тваё імя і таму не маю намеру рабіць табе якое дабро, толькі зло. Ды хацелася б ведаць, ад чыёй рукі памру або з кім змагаюся”. – “Што ты зычыш мне зло, ведаю па ўдарах твайго мяча, і ўхваляю цябе ў тым; але ж не ўважаеш на тое, што нічога, акрамя смерці, цябе не чакае. Ведай жа, ад каго памрэш: я – Трышчан, пляменнік караля Марка Карнавальскага”,– адказаў Трышчан. Пачуўшы, дужа рады быў Бланор і мовіў: “Я чуў пра тваю вялікую славу ў свеце. Калі ты пераможаш мяне, то не мецьмуць сваякі мае ганьбы. Калі ж, дасць Бог, я цябе –здабуду вялікі гонар”. І, узяўшы тарчу і меч, дадаў: “Пабачыш: на сваю ганьбу прыйшоў ты сюды, калі толькі мая правая рука будзе ў моцы”. – “Не пахваляцца табе маёй ганьбай – цяпер жа даведаешся, з кім дзяліў арэну”,– адказаў Трышчан.

І падскочыў да яго Трышчан, і распачалася вельмі моцная бітва. “Калі б не бачылі, то не далі б веры”,– пачалі ўсе казаць. І гэтак яны біліся, саступаючы адзін аднаму поле. І рубаліся доўга, аж нарэшце Бланор не змог больш узняць мяча. Убачыўшы тое, мовіў Трышчан: “Маеш бараніцца, інакш – думай пра свой лёс”. Бланор жа не змог нічога адказаць. І зразумеў Трышчан, што яму сорамна: так моцна стукнуў яго па гелме, што Бланор не ўстояў на нагах ды паваліўся на зямлю, не варушачы ні рукою, ні нагою. “Здыме мне галаву, прашу цябе,– мовіў ён Трышчану. – Няхай ганьбе маёй прыйдзе канец”. Трышчан разумеў, што толькі з велічы сэрца не хоча ён прызнаваць паразы й хутчэй памрэ, як скажа “Я пераможаны”. – “Калі яго адпушчу, і ён не аддасць мне меча, – мая бітва не будзе лічыцца ні сапраўднай, ні выйгранай. А забіўшы яго, учыню зло: забіць такога рыцара!” – падумаў Трышчан.

Пайшоў ён да каралёў і мовіў: “Панове, вы самі бачылі, як мы біліся. Але ніхто з нас не жадае аддаць меч другому і не хоча сказаць “Я пераможаны”, і хутчэй памёр бы, як сказаў тое ўласным языком. А што будзе Бланору за ганьба з таго, што цяпер адвярнулася ад яго фартуна? Калі вы думаеце так сама, заключыце між намі мір, і няхай арляндэйскі кароль будзе вольны ад паклёпу. Калі ж бітва будзе працягнута,– станецца яшчэ горш: тады ўжо хтосьці з нас мае расстацца ў гэтай бітве з жыццём”.

Каралі разумелі, што Бланор хутчэй памрэ, чым скажа тыя словы. Бачылі яны і шляхетнасць Трышчана – што, маючы яго ў сваіх руках і могучы зрабіць з ім усё, што заўгодна, не хоча забіваць Бланора. І раіліся, што маюць з тым чыніць. І вырашылі, што бітву трэба спыніць, а Бланор не павінен памерці, калі ёсць на тое шляхетнасць і міласэрнасць Трышчана.

І сказалі Трышчану: “Рыцару, дзякуем табе за тваю шляхетнасць, што вызваляеш Бланора ад смерці. Ты ўжо можаш зняць панцыр, як хочаш. Прыйшлі мы да таго, што арляндэйскі кароль апраўданы ад паклёпу Бланора”. Трышчан ім падзякаваў. “Ці можам мы, як апраўданыя, пайсці куды хочам?” – спытаўся арляндэйскі кароль. “Можаце йсці куды хочаце”,– адказалі каралі. Трышчан уклаў меч у похвы, а тарчу закінуў за плечы, пайшоў да каня і з лёгкасцю – нібыта й не паранены – ускочыў на яго. І дзівіліся ўсе, як ён сядзеў на кані (а Трышчан ускочыў на каня з такой лёгкасцю, нібы й не быў паранены).

Бачачы, што Бланор упаў, кінуліся да яго сваякі, думаючы, што ён нежывы. А кароль Ленвіз, агледзеўшы, што Трышчан з’язджае, сказаў двум каралям: “Панове, адпусціце мяне з маім рыцарам, каб ён не з’ехаў і я не згубіў яго”. – “Скажы нам імя таго рыцара, а потым язджай сабе з Богам”,– адказалі тыя. “Не магу назваць вам без памылкі, бо хочу ехаць, каб не згубіць яго: гэта Трышчан, пляменнік караля Марка Карнавальскага, найвялікшы ў свеце рыцар”,– сказаў Ленвіз каралям і ўскочыў на каня. І неўзабаве дагнаў са сваімі дваранамі Трышчана. Але спачатку слава пра Трышчанава рыцарства дайшла да Ландрэшскага каралеўства, да двара караля Артыюша. І калі распавялі каралю Артыюшу, як, узяўшы перамогу, Трышчан збавіў Бланора ад смерці, а той не хацеў аддаваць яму меч, сказаў кароль Артыюш: “Гэта – найвялікшае рыцарскае майстэрства, чаго я нідзе не сустракаў. І ўвесь свет праславіць Трышчана за гэта. Не можа быць, каб ён не дасягнуў вялікае славы, калі ўжо ў гэткіх гадах, будучы маладым, выявіў гэткую годнасць”.

Калі Трышчан прыехаў да сваёй дружыны, да шатроў на ўзмор’і, у вялікай радасці страчалі яго ўсе і распытваліся, як яму павялося. “З ласкі Божае збавіў я караля ад Бланора і ад бядоты”,– адказаў той. Тут узнеслі ўсе Богу хвалу і спыталіся

ў Трышчана: “Пане, ці ты моцна паранены?” – “Раны ёсць, але я не дбаю пра тое; мы не зведалі паразы, то радуймася, бо здабылі тое, чаго хацелі”,– адказаў Трышчан. Тут пад’ехаў кароль Ленвіз са сваёй дружынаю і, скочыўшы з каня, падбег да Трышчана і расцалаваў яго, кажучы: “Трышчане, ты абараніў мяне мячом: цяпер і я сам, і ўсё, што я маю,– тваё. Але скажы мне, ці не моцна ты паранены?” – “Абы толькі знайшоўся добры лекар,– адазаў Трышчан,– тады не страшная мне смерць ад ранаў”. – “Калі пазбыліся такое бяды, то знойдзем і лекараў”,– мовіў кароль; і паклікаў лекараў, якія агледзелі Трышчану раны і зрабілі ўсё, што было патрэбна. “Кароль, ці памятаеш ты пра нашу дамову?” – спытаўся Трышчан у Ленвіза. “А як жа: маю даць тое, чаго ты захочаш”,– адказаў кароль.

Трышчан вельмі пакорліва падзякаваў яму і сказаў: “Я прашу тваю дачку Іжоту для свайго дзядзькі, караля Марка”. А потым спытаўся: “Пане, куды маем ехаць адгэтуль?” – “Да таго часу не зрушу я з гэтага месца, пакуль не ўбачу цябе здаровым; а тады як найхутчэй паедзем у Арляндэю. Прашу цябе, дзеля тваёй шляхетнасці: паедзьма са мной разам. Але будзьма тут гэтулькі, колькі будзе патрэбна”,– сказаў кароль. Ад гэтага часу паміж арляндэйцамі і карнавальцамі, якія раней былі ў найвялікшай варожасці між сабою, пачалася вялікая дружба і радасць.

І ўсю тую ноч не заплюшчыў Трышчан вачэй. Кароль жа крыху паспаў, а. назаўтра паклікаў аднаго мудрага чалавека і расказаў яму бачаны ўночы сон. “Пане, я раіў бы табе не аддаваць свае дачкі Трышчану, бо калі яна адправіцца ў Карнаваль – зазнае такое вялікае няшчасце, якога не зведвала ніводная дзяўчына”,– сказаў той чалавек. “Не магу так учыніць: я ж паабяцаў яе такому рыцару, як Трышчан. Ён жа ж так шмат зрабіў для мяне. Калі б я не аддаў яе, то быў бы здрайцам, бо дамовіўся з Трышчанам пра гэта тады, калі ў вялікай патрэбе прасіў ягонае дапамогі. Вельмі люблю я сваю дачку, але не прыстала мне пазбывацца праз яе гонару. Хай станецца воля Божая: не магу яе не аддаць”,– сказаў кароль.

Адпачнуўшы, загадаў Трышчан маракам рыхтаваць карабель, бо збіраўся адплыць у Арляндэю. Пры каралеўскім двары наладзілі на яго гонар вялікую бяседу. Было там нямала рыцараў, паняў і паненак, што прыйшлі паглядзець на слаўнага рыцара пана Трышчана, які выбавіў іх ад Бланоравай няволі.

Адвесяліўшыся, пайшлі карнавальцы ад караля і каралевы да мора і, радасныя, рушылі морам дадому, везучы з сабою прыгажуню Іжоту (а з ёю выправілася шмат годных і багата апранутых паняў і паненак, як тое й прыстала гэткай пані). Праз любоў да Іжоты плакалі кароль з каралеваю і ўсе добрыя людзі. А каралева, адазваўшы Гаварнара й Брагіню набок, мовіла ім: “Вазьміце гэту поўную пітва срэбную пляшыцу і захавайце яе. А калі кароль Марк з Іжотаю будуць ужо на пасцелі, дайце ім напіцца гэтага пітва – перш каралю, а потым Іжоце. І калі яны абое нап’юцца, рэшту выліце. Калі ж хто іншы паспрабуе гэтага пітва, можа стацца вялікая бяда, бо гэта – напой кахання. Напіўшыся, так моцна пакахаюць яны адно аднаго, што да канца іхняга жыцця нікому не ўдасца іх пасварыць ”.

Гаварнар з Брагіняю прысягнулі так і зрабіць. Развітаўшыся з каралём і каралеваю, карнавальцы напялі ветразі. І ў вялікай радасці выправіліся Іжота з Трышчанам у дарогу, і ніхто не думаў пра штосьці непрыстойнае – толькі пра вартыя, годныя й паважныя рэчы.

Трэцяга дня, плывучы па моры, граў Трышчан з Іжотай у шахматы. На Трышчану былі кармінавыя шаты і жупан, а на Іжоце – зялёнага аксаміту саян. Было лета, і была вялікая спякота. “Трэба спатоліць смагу”,– сказаў Трышчан. Гаварнар пайшоў і прынёс кубкі пітва з тае пляшыцы з напоем кахання (запамятаваўшы, што ў ёй, бо ў той каморы было нямала іншых пасудзін), і падаў адзін кубак Трышчану, а другі – Іжоце.

І толькі адпілі таго пітва, нават кубкаў яшчэ не асушылі, як успыхнула між імі такое вялікае каханне, што і да канца жыцця свайго не пакінулі б адно аднаго. І глядзелі адно на аднаго, і не думалі ні пра каго іншага, толькі пра сябе. І селі, як спалоханыя. Трышчан мысліў пра Іжоту, а Іжота пра яго; а на караля Марка забыліся. “Дзіўлюся я, адкуль гэта прыйшло мне так неспадзявана, а раней жа са мной такога не здаралася?”– мовіў Трышчан. І задумаліся адно пра аднаго. “Думка наша памылковая”,– так разважалі. Ды ўсё ж змагло іх пітво. “Не дзіва, што я пакахаў Іжоту: яна – найпрыгажэйшае, што ёсць на свеце, і не знайшоў бы я лепшай,– думаў Трышчан. – Я вывез яе з Арляндэі, і мне яна даручана. А каханне наша можа быць і скрытым”. Іжота ж падумала: “Не дзіва, што я пакахала Трышчана: ён мне раўня і такі ж высакародны, як і я сама. Ды й няма большага рыцара на свеце”. І зразумелі, што абодва пакахалі сэрцам. Усцешылася з таго Іжота і падумала: “Калі пакахаў мяне найвялікшы рыцар, навошта мне жадаць большага?” А Трышчан падумаў: “Я маю найвялікшую ў свеце фартуну, калі пакахала мяне найчароўнейшая дзяўчына; я ж таго не заслужыў ад яе”.

Згадаўшы, што даў ім напой кахання, спалохаўся Гаварнар; і аслупянеў, як забыўся. І пачаў жадаць сабе смерці, што Трышчан пакахаў Іжоту, а Іжота Трышчана. “Мы вінаватыя, што, не ведаючы, далі ім выпіць гэтае пітво”,– мовіў Гаварнар Брагіні. “Мы ступілі на благі шлях і загубілі сябе, а таксама й Трышчана з Іжотай”,– мовіла Брагіня. Гаварнар паказаў пляшыцу, у якой было пітво, і спытаўся: “Ці ведаеш, што гэта?” – “Гэта напой кахання”,– адказала Брагіня. “Дрэнна ж захавалі мы нам даручанае: дапусцілі

Трышчану з Іжотай напіцца гэтага пітва, таму яны й кахаюцца",– сказаў Гаварнар, а Брагіня заплакала. "Вялікае зло мы ўчынілі! Не можа быць, каб па гэтым не сталася шчэ большае зло,– мовіла Брагіня. – Цяпер нам трэба быць вельмі абачлівымі, а мы ў вялікім суме праз тое". І быў сум іх у тайне – каб не даведаліся іншыя.

А Трышчан з Іжотай не маглі больш цярпець. "Кахаю цябе сэрцам",– сказаў Трышчан Іжоце. Яна вельмі ўсцешылася з таго і адказала: "Нікога на свеце не кахаю так, як цябе. І не дай мне Бог, покуль жыцьму, каб сталася іначай". Бачачы, што Іжота думае як і ён, Трышчан, больш не чакаючы, пайшоў з Іжотай у пакой, дзе і споўнілі яны сваю волю. Ад таго часу не спынілася між імі каханне. І мелі яны праз тое каханне вялікі клопат. І няма таго рыцара, які зведаў бы праз каханне столькі пакутаў, як Трышчан. А такая вялікая шкода была з таго, бо ў тады не было рыцара, большага за Трышчана: ён быў трэцім на свеце рыцарам.

"Што думаеш пра гэта? – спытаў Гаварнар Брагіню. – Здаецца мне, што Трышчан сарваў Іжоціну кветку, бо я бачыў іх разам". – "Як даведаецца кароль Марк, што яна не дзяўчына, то мы прапалі: ён загубіць нас усіх",– адказала Брагіня. "Не бойся,– кажа Гаварнар. – Калі ўжо так сталася за нашыя грахі, то маем паклапаціцца, каб ніхто не даведаўся". – "Як тое можа стацца?" – спыталася Брагіня. "Даверся мне, я ўсё ўладжу",– адказаў Гаварнар. "Добра было б, абы тое Бог даў!"– усклікнула Брагіня. А Трышчан і Іжота не ведалі, што Гаварнару й Брагіні ўсё вядома. І не думаў Трышчан ні пра што – толькі пра Іжоту, а Іжота – пра Трышчана. І нішто не было ім наўме: толькі жыць, як у раі, і кахаць адно аднаго больш, як саміх сябе. І так узрасло іх каханне, што й не ведалі, як устрымацца адно ад аднаго. І, не марудзячы, паехалі яны ў Карнаваль.

І надарылася перамена: за дзень надвор'е сапсавалася, усхадзілася мора, узняўся вецер і праз усю ноч гнаў гвалтам іхняе судна туды, куды яны й не спадзяваліся трапіць. Назаўтра апынуліся яны пад вялікім умацаваным горадам, што стаяў у моры, на выспе, вакол якое было яшчэ мноства большых выспаў. А на тых выспах, якія зваліся Дальныя Выспы, жыло многа добрых людзей і было шмат усялякага дабра. Гаспадаром іх быў прынчып Галіёт, і гэта была яго радзіма. Адвагай сваёю скарыў Галіёт і іншыя землі ды краіны. Анцалот жа ў той час знаходзіўся ў зямлі, што звалася Сарэнлойс.

"Ці не ведаеце, дзе знаходзіцца той Плачны Горад?" – спытаўся Трышчан у маракоў. "Не ведаем. Але ведама нам, што гэта горад прынчыпа Галіёта",– адказалі тыя. "Не хацелася б мне патрапіць туды не па сваёй волі, бо мне распавядалі, што там існуе благі звычай",– сказаў Трышчан. Гэтак яны гаварылі, аж ідуць шасцёра ўзброеных чалавек. Разумеючы, што падарожным нідзе не ўцячы з карабля, спыталіся яны: "Адкуль вы, што прысталі да нашае прыстані без дазволу?" – "Мы з Карнавалі, паслы караля Марка, а плывем з Арляндэі. А сюды нас загнала благое надвор'е. Мы ні ў чым перад вамі не вінаватыя, і ні ў чым вам не шкодзім",– адказаў Трышчан. "Адкуль бы вы ні былі, па нашым звычаі вы – нашыя вязні. Вылазьце прэч, колькі вас там ёсць, і йдзеце ў горад – там даведаецеся пра наш звычай".

"Што рабіцьмем? – спытаўся Трышчан у таварышаў. – Калі паслухаемся іх, то апынемся ў іхніх руках і яны могуць прычыніць нам зло". – "Немаведама, што ў іх наўме, але нам лепш як мага бараніцца тут, нават калі давядзецца даць бой",– адказалі адныя таварышы; а іншыя мовілі: "Наша ўпартасць нам нічым тут не ўспаможа, бо мы ў іхніх руках – могуць патапіць нас з суднам альбо пабіць каменнем у горадзе. Таму лепш аддаймася ў іхнія рукі". – "Панове, асцерагайцеся штосьці рабіць, бо ў гэтым горадзе такі благі звычай, што, як аддамося ім у рукі, яны загубяць нас або кінуць у вязніцы. Не прычакаем мы ад іх удзячнасці за сваю паслугу, але ж і ласка іхняя нам не да патрэбы. Раю зрабіць так: будзем бараніцца, колькі зможам – лепш нам памерці, як зведаць іхнюю ласку, бо ласка іхняя не прынясе нам дабра",– мовіў Трышчан і спытаўся ў Іжоты:

"А ты што думаеш пра ўсё гэта?" Іжота нацярпелася была страху, і сказала, плачучы: "Трышчане, не ўмею я пра тое сказаць. Мяне аддалі ў твае рукі і пад тваю апеку, ты вывез мяне з маёй зямлі. І калі я прычакаю ганьбы або смерці, то ўжо лепш ад цябе". Пачуўшы тыя словы, пачаў Трышчан праклінаць той дзень, у які нарадзіўся. "Панна,– звярнуўся ён да Іжоты,– ці хочаш ты, каб мы засталіся на гэтым судне, пакуль мяне не заб'юць, або падымемся на гару ў замак і аддамося ім у рукі?" – "Няхай станецца так, як хочаш ты",– адказала тая. Тады сказаў Трышчан: "Хадзем да іх на гару і трывайма ўсё, што зведаем ад іх, калі ўжо не можам ад іх адбараніцца". І ўсе яго падтрымалі.

І зышлі з судна, і пайшлі на гару, у горад. І сустрэлі яны ў замку мноства добрых людзей: рыцараў, юнакоў, дзяўчын і слугаў. І завялі іх у нейкі вялікі дом, дзе было шмат пакойчыкаў. А ў тых пакойчыках знаходзіліся вязні, зняволеныя жыхарамі таго горада. А турэмны двор быў агароджаны такім трывалым муром, што ніводны вязень не мог бы ўцячы. Пусціўшы ўсярэдзіну, замкнулі за імі вароты. "Панове,– мовіў Трышчан,– мы вязні і маем загінуць, бо гэтыя людзі такія падступныя і маюць такія дрэнныя законы, што не выйсці нам адсюль жывымі, калі толькі нас Бог не вызваліць ". І заплакалі ўсе, і пачалі моцна бедаваць – моўчкі, бо не хацелі, каб пачулі іншыя вязні. Так прабыў Трышчан з таварышамі ў няволі дзень і ноч, і ніхто іх не бачыў.

Назаўтра зайшлі да іх шасцёра няўзброеных людзей і спыталіся: "Як маецеся?" – "Як і мае

быць у такім выпадку, які спаслаў нам Бог,– адказаў Трышчан. – Прашу вас, панове, памагай вам Бог! Скажыце, ці мы маем заставацца тут, у гэтай няволі?” – “Гэта месца, з якога ніхто не выходзіць: так наканавана ўсім, каго сюды ўпускаюць. І ніколі ўжо такія людзі не спыняюць плачу і праводзяць у слязах усе свае дні – таму і называецца горад Горадам Плачу”,– адказаў адзін з рыцараў. “Ох, мой любы Божа! – усклікнуў Трышчан.– Ці ж гэта праўда, што ні адзін, хто сюды ўвойдзе, не застанецца ў жывых?!” – “Сапраўды, ад часу, як устаноўлены гэты звычай, ні адзін. Ды калі б знайшоўся высокі сэрцам і рыцарствам рыцар, а пані ягоная аказалася б прыгажэйшаю за нашую пані, і калі б яны з’явіліся разам,– сталіся б нашымі гаспадарамі; а тыя, каму мы служым цяпер, мусілі б прыняць смерць”,– паведаміў рыцар.

Пачуўшы тое, узвесяліўся Трышчан ды кажа: “Калі б нас судзілі па справядлівасці, мы былі б пушчаныя з няволі, бо Іжота – найпякнейшая ў свеце, а наконт рыцара – як Бог дасць”. А затым пытаецца ў рыцара: “Прашу цябе, скажы мне: калі б тут знайшоўся рыцар, большы за вашага, і пані, прыгажэйшая за вашу, ці мы выйўлі б з няволі?” – “Выйшлі б, але таго тут стацца не можа, бо наш рыцар – шляхетны пан, і ён цвёрды ў сваіх намерах. Ён такі рыцар, што другога такога на свеце няма”,– адказвае той. “А калі б знайшоўся на свеце рыцар, большы за Анцалота?” – спытаўся Трышчан. – “І такому знойдзем раўню”. – “А калі ён пераможа вашага рыцара, ці выпусцяць нас з няволі?” – “Выпусцяць, калі разам з рыцарам прыедзе пані”,– адказаў рыцар. “Мы ўжо вольныя, кажу табе, калі толькі вы не прычыніце нам несправядлівасці,– мовіў Трышчан. – Гэтак сказаў бы я і пры двары караля Артыюша, бо рыцар, пра якога вы кажаце, не большы за нашага; таксама і вашая пані не прыгажэйшая за нашу”. Рыцар аж знямеў. “Дзе той, якога вы гэтак узносіце?” – спытаўся ён. “Калі з намі абыдуцца па справядлівасці і мы выйдзем на поле, ці будзеце вы трымацца свайго закону і справядліва абыдзецеся з намі? – спытаўся Трышчан. – Выведзіце вашую пані і вашага рыцара і аддайце нас на справядлівы суд: калі нашая пані акажацца лепшай, і рыцар таксама будзе лепшым, няхай мы станемся вольнымі. Калі ж здарыцца не так, то няхай адсякуць мне галаву”. – “Ты сказаў дастаткова. Я хочу пайсці і паведаміць туды, куды належыць”,– сказаў рыцар і пайшоў з тымі, з кім прыйшоў.

А тым часам я раскажу вам, чаму той горад называецца Плачным. Горад быў заснаваны на благіх законах у тыя гады, калі на загад Госпада нашага Ісуса Хрыста Іосіф наведваў вялікія краіны і навяртаў у хрысціянскую веру мноства людзей. Даведаўшыся, што гэтыя Дольныя Выспы поўныя людства, паслаў туды Іосіф набожных людзей, каб навярталі народ да Бога. І навярнулі ўсе тыя выспы, акрамя аднае, што завецца Арашая; не было там іншых народаў, толькі арашы. Валадар іхні быў арашцам, і меў ён дванаццаць сыноў – і ўсе былі арашцы. Калі хрысціяне аб’явіліся на той выспе, яе валадаром быў Даўлітас. І параніў яго аднойчы дзікі мядзведзь, пасля чаго і адпаў ён ад Іосіфавага хрышчэння.

Тым часам з’явіўся да Брунора й ягонае пані рыцар ды кажа: “Пане, узялі мы ў палон маладых людзей, карнавальцаў, і паведамілі ім пра закон нашага горада. Адзін жа рыцар з іхняе кампаніі дакляраваў, што ён лепшы за цябе і пані ягоная лепшая за нашую пані. А прыйшлі мы паведаміць вам пра гэта, бо не можам адмяніць нашага звычаю, устаноўленага нам нашымі продкамі; таму скажыце, што маем рабіць”. – “Не я яго ўводзіў, не мне яго й адмяняць: клічце тых, што маюць судзіць і глядзець. Тая пані, якая акажацца прыгажэйшаю, і будзе вашаю пані, а другая мае памерці. Рыхтуйце бітву, а што да мяне – я гатовы”,– сказаў Брунор. “Інакш і быць не можа”,– мовілі людзі. Потым прыйшлі яны да Трышчана і паведамілі яму: “Калі вы маеце такога рыцара, як дакляравалі, то з вамі ўсё будзе добра. Рыхтуйцеся, бо заўтра маеце прыняць бой”.

І адпусцілі іх з вязніцы на дзень і ноч. І далі Трышчану ўсё, што было патрэбна. І прыходзіла шмат рыцараў, якія пыталіся пра ягонае імя, але ж не змаглі дазнацца. І пазіралі на Іжоту. Тая ж таілася, ды не магла ўтаіцца; і тыя, што бачылі гэта, казалі між сабой: “Страцілі мы нашую пані-гаспадарыню, бо гэтая лепшая”.

Назаўтра ўвабраўся Трышчан у панцыр, і падалі яму іншы меч. “Дайце мне мой меч”,– папрасіў ён. І далі яму. Ускочыў Трышчан на вельмі харошага каня, а Гаварнар панёс яму тарчу і дзіду. Іжота ж хораша ўвабралася ў багатыя шаты і села на іншаходніка, а пры ёй былі Брагіня ды іншыя дзяўчыны. З’ехаліся яны да шатроў і сустрэлі тых, што меліся рассудзіць іхнюю прыгажосць. А ў шатрах тых было мноства годных людзей і рыцараў ды паняў, што прыйшлі паглядзець на бітву. Прыехаў і Трышчан з таварышамі. Скочылі яны з коней і прыселі, бо яшчэ не было Брунора. І вось затрубіў чалавек у рог, і гук той разлятаўся далёка. Тады ўскочыў хораша ўвабраны Брунор на каня і выехаў з горада, а з ім прыехала колькі рыцараў ды ягоная пані, Галіётава маці. Пад’ехаўшы пад шатры, спытаўся Брунор: “Дзе тая дзяўчына, што сваёй прыгажосцю роўная нашай пані?” І паказалі яму на Іжоту. Убачыў ён Іжоту і моцна спалохаўся: “Не бачыў я за жыццё прыгажэйшай дзяўчыны. Баюся, што праз яе прыгажосць страчу самае дарагое”. Падыйшла Галіётава маці, якая была вельмі прыгожая; і калі ўбачыла Іжоту, то моцна спалохалася, што праз ейную прыгажосць прыме смерць, бо бачыла ў ёй найпрыгажэйшую ў свеце жанчыну.

Угледзеўшы тую пані, кіўнуў Трышчан Іжоце, падышоў да суддзяў і мовіў: “Панове і пані, што

маеце рассудзіць нас наконт прыгажосці тых паняў! Гляньце – вось яны стаяць побач. Рассудзіце ж справядліва". Яны ж маўчалі, бо бачылі, што Іжота куды прыгажэйшая, як тая пані. Другі раз звярнуўся да іх Трышчан: "Прашу вас, скажыце мне праўду, паводле вашага закону". – "Мы павінны гэта зрабіць, але нам вельмі шкада,– з жалем адказалі тыя і, павярнуўшыся да Іжоты, мовілі: – Пані, ты прыгажэйшая, і прыгажосць твая збавіла цябе ад смерці. За тваю прыгажосць хочам мець у табе сваю гаспадарыню. Ды як з'явіцца прыгажэйшая за цябе, будзь пэўная, што памрэш, як і тая, што так доўга жыла між намі і якой мы выказвалі вялікую шану. Цяпер жа яна асуджана на смерць; нам дужа ўкада, але інакш быць не можа, бо мы прысягалі трымацца гэтага закону. Хай будзе пракляты той, хто перашы ўстанавіў гэты закон!" Выслухаўшы іх, загаласілі ўсе гучнымі галасамі, плачучы з такім жалем, што не было чалавека, які б не шкадаваў, гледзячы на тое.

"Панове, вялікая вашая ласка! Дзе ж той, з кім маю біцца?" – спытаўся Трышчан. "Вось той, хто трымае ўладу",– адказалі яму і ўказалі на Брунора. "Сцеражыся мяне, бо я не хачу адкладаць фартуны!" – крыкнуў Трышчан да Брунора.

Трышчанава бітва з Брунорам Схапіў Брунор тарчу й дзіду ды скочыў да Трышчана, а Трышчан – да яго. І ўдарылі адзін аднаго так моцна, што аж зброя й тарчы павыпадвалі з рук. І параніліся абодва, і пападалі з коней. Трышчан быў неглыбока паранены ў бок, а Брунор быў глыбока паранены ў грудзі. І паламаліся ў іх дзіды, і, выхапіўшы мячы, пачалі рубацца што моцы. Па ўдары Брунор зразумеў, што Трышчан – з годных рыцараў, і пачаў сіліцца. І вельмі моцна і часта секлі адзін аднаго: кожны рубаў аберуч, бо кожнаму вырашаўся лёс. І зразумеў Брунор, што Трышчан – большы за яго рыцар, таму прыкрываўся тарчаю, каб Трышчан стаміўся, але тое не памагло. Цэліўся Брунор рубануць Трышчана ў адкрытае месца, але Трышчан быў годны майстра – умеў асцерагчыся.

І доўга рубаліся, абодва параненыя; і так стаміліся, што мелі патрэбу ў пярэдыху. Адышліся яны адзін ад аднаго і пасталі, абапёршыся на тарчы й мячы і паглядаючы адзін на аднаго. І доўга стаялі. "Пане Брунор,– сказаў нарэшце Трышчан,– я ўважаю цябе за вельмі годнага і ўмелага рыцара, і таму спрыяю табе: бачыць Бог, што не рады б я быў, каб ты загінуў. Дзеля гэтага прашу цябе, калі можаш, завяршы гэтую бітву на маю славу і з вызваленнем маіх таварышаў. Я з радасцю скончу бітву – абы толькі ты не загінуў". – "Мы на тым месцы, дзе або ты мяне заб'еш, або я цябе, або абодва будзем мёртвыя, інакш быць не можа",– адказаў Брунор. "Дзе нянавісць, там любові не месца. Калі ж так, то сцеражыся мяне",– мовіў Трышчан. І пачалі яны сечу, і дзівіліся з іх усе. Нарэшце Брунор не стрываў: адкінуў тарчу і меч, а сам упаў на зямлю. "Ці ты ўжо больш не можаш?" – спытаўся Трышчан. "Рыцару, я прызнаю тваё вяршэнства ў гэтай бітве,– мовіў Брунор. – Не трымай на мяне зла, што не магу ўчыніць па тваёй волі, бо не магу". – "Я злітуюся з цябе, дай мне свой меч і скажы "Я пераможаны!" – мовіў Трышчан. "Благі быў бы той чалавек, што сказаў бы тыя словы сваім языком – для мяне гэта няшчасце. Не дай таго Бог да маёй смерці, якая ўжо побач са мною!" – адказаў Брунор. "Мяркуеш, што застанешся жывы?" – спытаўся Трышчан. "Твой меч не пакінуў мне аніякай надзеі, канец ужо блізкі. Як мне не верыш, то зараз пабачыш сам",– сказаў Брунор і, мовіўшы тое, аддаў Богу душу.

Убачыў Трышчан, што той сканаў, і зняў яму гелм з галавы, і адкінуў яго далёка. Паклікаўшы тых, што суправаджалі Брунора, спытаўся: "Панове, ці дастаткова я зрабіў для вызвалення сябе і сваіх таварышаў?" – "Ты зрабіў дастаткова. Ты зваяваў гэты горад і гэтую выспу, і цяпер ты наш гаспадар, а тая панна, якую прывёз з сабою,– наша гаспадарыня. Але ж маеш учыніць шчэ адну справу",– адказалі яны. "Якую ж?" – спытаўся Трышчан. "Адсячы мячом галаву нашай пані Бруноравай",– адказалі тыя. Глянуў Трышчан на пані (а тая моцна плача), і стала яму дужа шкада яе. "Як жа ж магу забіць жанчыну?" – здзівіўся Трышчан. "Інакш і быць не можа",– адказалі суддзі. Дужа ўгнявіўся Трышчан, і здумеўся. "Хай будзе пракляты той, хто ўстанавіў гэты закон, і тыя, хто гэтага закону трымаюцца. Я мушу ўчыніць тое, праз што ніколі не зведаю радасці кожнага разу, як пра тое згадаю",– падумаў Трышчан і, падышоўшы, адсек ёй галаву. "Вы давялі мяне да тае ганьбы; бо кожны годны чалавек, даведаўшыся, палічыць тое мне за ганьбу",– мовіў Трышчан. "Не табе ганьба, а тым, што ўстанавілі гэткі закон. Пойдзем жа наверх, у горад, і там, у горадзе, ты прысягнеш нам трымацца закону гэтага горада – так, як рабілі тыя, што былі да цябе",– адказалі яму.

Пан Трышчан не рады быў з таго панавання, але ж не магло быць іначай. І пайшоў ён з суддзямі ў замак, і там сказалі: "Трышчане, тут нам прысягні". Не хацеў Трышчан прысягаць, але інакш не магло стацца – прысягнуў. Яны загадалі яму стаць з Іжотаю на тым месцы, дзе стаяў Брунор са сваёй паняю. І было ў Трышчана з Іжотай такое каханне, што не было яму наўме анічога, толькі Іжота, а Іжоце – толькі Трышчан.

А калі ўбачыла бедная Галіётава сястра сваіх бацьку і маці нежывых, пачулася гэтая дзяўчына найгаротнейшаю на свеце. Будучы ў той жалобе, змайстравала яна судзіну, і узяўшы бацькаву галаву і матчыну, паклала іх туды й замацавала на кані. І выправілася яна з невялікай дружынаю да Дольных Выспаў на пошукі Галіёта. І дзе б ні праязджала, страчаючы рыцараў і юнакоў – у кож-

нага пыталася пра прынчыпа Галіёта; і кожны ўказваў ёй правільны шлях туды, дзе быў Галіёт.

Едучы, напаткала яна аднаго высокага рыцарствам годнага рыцара, які ў поўнай зброі ехаў з невялікай дружынаю. Яна прывіталася з ім, і ён таксама вельмі шляхетна прывітаўся з ёю. "Рыцару, дазволь мне спытацца ў цябе як у пана і дзеля тваёй шляхетнасці: ці не чуў ты дзе часам якой пагалоскі пра прынчыпа Галіёта?" – "Ты сртэла, каго шукаеш",– адказаў рыцар. Яна ж доўга глядзела на яго і не пазнавала, бо быў у панцыры, а як пазнала – кінулася яму на шыю, плачучы і не ў сілах гаварыць.

А калі змагла, сказала: "Ніколі не чула я, каб такому вялікаму пану, як ты, прычыніўся такі жаль, пра які хочу паведаміць табе я, твая сястра". І, адкрыўшы судзіну, дзе былі косці, сказала: "Гэта косці таго, хто цябе спарадзіў; а гэта – галава той, якая насіла цябе ва ўлонні сваім. Абоіх забіў сваёй рукою Трышчан, пляменнік караля Марка Карнавальскага. І таму выправілася я на твае пошукі: каб ты даведаўся пра тое і разважыў, што маеш рабіць. Бо ж ты, дужы чалавек, можаш зрабіць усё, што пажадаеш".– "Як тое сталася?" – спытаў Галіёт. Яна распавяла яму ўсё па парадку. Зразумеў Галіёт, што Трышчан у тым не павінен, і не трымаў на яго ў сэрцы сваім крыўды; і праслязіўся з вялікага жалю. "Любая сястра мая, за мае грахі сталася з намі такое вялікае няшчасце,– сказаў Галіёт. – Каб пачуваўся ўпэўнена, то даўно скасаваў бы тыя благія законы, што існуюць на той выспе; але цяпер паеду і скасую тыя благія законы. А з Трышчанам абыдуся так, як ён таго заслужыў, бо не магу аслухацца самога сябе: калі б не адпомсціў, то дрэнна ўчыніў бы; і пакуль жыцьму – усёй моцай цела свайго буду помсціць. Вернемся ж у Сарэлойнс і там пахаваем бацькава і матчына целы ў абацтве. Там і параімся, як можам папомсціць". І паехалі ўсе ў вялікім суме, і ніхто не здагадаўся б, што гэта Галіёт, бо ехаў ён з невялікай дружынаю.

І праехалі яны да горада, дзе быў Кароль Ста Рыцараў. Убачыўшы Галіёта, вельмі ўсцешыўся той з ягонага прыезду; але не спадабалася яму, што прыехаў Галіёт з малою дружынаю. "Гэта нездарма",– падумаў кароль. Калі ж Галіёт скінуў панцыр, падышоў да яго кароль і спытаўся: "Пане, як маешся? З чаго ты такі невясёлы? Дзеля Бога, скажы мне, што сталася?" – "Не дзіва, што я невясёлы, калі мне прыйшло такое вялікае няшчасце й жалоба",– адказаў Галіёт; і пачаў распавядаць, як забіў Трышчан ягоных бацьку і маці. Кажа кароль: "Гэта, гаспадару, напраўду вялікі жаль. І што ты мяркуеш пра гэта?" – "Хачу выправіцца на тую выспу з адным рыцарам і двума хлопцамі, на добрым кані і пры добрай зброі – так, каб ніхто мяне не пазнаў; бо хочу з'явіцца пад выглядам чужаземца, хочу біцца з Трышчанам. Калі ён мяне заб'е – канец маёй жалобе, а калі я яго – ніхто не паставіць мне тое за ганьбу, наадварот, за рыцарства. А табе загадваю: збяры войска з пяцісот дабрых воінаў і плыві морам да тае выспы пад Плачны Горад – хачу скасаваць тыя благія законы, што загадваюць браць чужаземцаў у палон і трымаць у вязніцы; ты ж перабі ўсіх жыхароў і выкінь іхнія целы ў затоку, і няхай не застанецца ніводнага, мужчыны ці жанчыны. Калі ж знойдзеш там якіх чужаземцаў, то адпусці ўсіх",– мовіў Галіёт.

На тое сказаў Кароль Ста Рыцараў: "Пане, што загадаеш – усё зраблю, як буду жывы. Але ж як ты можаш думаць пра бітву з Трышчанам, найвялікшым рыцарам,– нават большым за Анцалота? Няма больш такога на ўсе чатыры бакі свету – ні на моры, ні на сушы. Не пускайся, сабе на пагібель, у тую прыгоду – не раю табе гэтага рабіць". І дадаў: "Пане, Бог даў табе царства і такую моц, што не гадзіцца табе ні помсціць, ні легкадумна ставіцца да такое справы. Бо калі з табою здарыцца горшае або смерць напаткае – усё тваё царства, пішы, прапала. А калі Трышчан цябе панізіць, будзе табе вялікае няшчасце. Пане, я заўсёды ўважаў цябе годным рыцарам, і раю табе: адступіся ад бітвы з Трышчанам. Як прымеш яго з ласкаю, ён, бачачы гэткую тваю жалобу, сам прыме на сябе тую помсту. Калі ж вы абодва станеце на полі і ён цябе не пераможа,– адсячы мне тады галаву".

"Ведаю, што ты кажаш праўду, і я табе веру. Але ж, калі б я адпосціў яму праз Анцалота або іншага рыцара, то ўчыніў бы горш. Таму зрабі так, як я табе загадаў. Хоць мне і згінуць, але мушу тое ўчыніць, бо не мецьму спакою, пакуль не пабачуся з Трышчанам",– сказаў Галіёт. І ахапіў караля моцны страх, бо баяўся, што Галіёт не стрывае супраць Трышчана, і зажурыўся кароль вельмі, бо любіў свайго пана Галіёта ўсім сэрцам.

Па той размове загадаў Галіёт аднесці ў адзін кляштар бацькавы косці і матчыну галаву; і з вялікім плачам паклалі іх у багата ўпрыгожаную труну. А па тым у вялікай пашане пакінуў тым горадзе сястру, а сам на кані, на якога меў вялікую надзею, з адным рыцарам і двума слугамі паехаў да мора. І прыхапіў вельмі добрую зброю і меч, які даў яму Анцалот.

І калі з сваёй дружынай Галіёт прыехаў да мора, ніхто яго не пазнаў, бо ён не ездзіў з малой дружынай. Прастояўшы там дзень, пакуль знайшоўся гатовы карабель і стала добрае надвор'е, выправіўся Галіёт у мора. І калі яны ўжо былі неўздалёку берага, сказаў Галіёт маракам: "Кіруйцеся пад Плачны Горад". – "Не дай Бог нам там апынуцца! Лепш нам памерці, як плысці туды!" – адказалі маракі. "Не можа быць іначай, мусіце туды плысці",– сказаў Галіёт. Пачуўшы тое ад Галіёта, не ведалі маракі, што й рабіць: "Паплыўшы туды, згінем, а не – Галіёт будзе ў сташным гневе, ды мае ж дружыну й зброю і можа нас загубіць". Галіёт жа зноў сказаў: "Плывіце, не бойцеся. Без страху можаце туды з'явіцца". – "Пане, як жа

ж нам не баяцца? Злітуйся, дзеля Бога, не шукай нам і сабе смерці, бо сам ведаеш, што не будзе там таго, хто не прыме смерці. Не вядзі нас туды",– мовілі маракі. "Як не хочаце плысці, куды загадваю,– цяпер жа памраце на гэтым месцы",– сказаў Галіёт і, выхапіўшы меч, замахнуўся, нібы хацеў сячы. Перапужаліся маракі і сказалі: "Пане, калі не можна інакш, то мы ў тваіх руках – што знагадаеш, тое і зробім, толькі не губі нас". – "Не бойцеся, не будзе вам нічога",– сказаў тады Галіёт. І скіраваліся да выспы, і наступнага дня прыплылі да выспы, у прыстань пад Плачны Горад.

Прыйшлі да іх людзі з верхняга замка і сказалі: "Мы бярэм вас у палон!". А Галіёт адказаў: "Хоць мы й прысталі да вашай зямлі, але няварта нас арыштоўваць, бо я гатовы трымацца вашага закону". – "Тады маеш біцца з Трышчанам, найбольшым рыцарам на свеце". – "Хай сабе нават большым, як ёсць насамрэч, але ж я і з'явіўся не дзеля чаго іншага, як для бітвы з ім",– адказаў Галіёт. "Выходзьце прэч",– загадалі людзі. Галіёт з дружынаю выйшлі, і месцічы павялі маракоў у вязніцу. "Адпусціце двух гэтых юнакоў і рыцара – няхай таварышуюць мне да таго месца, дзе адбудзецца бітва",– папрасіў Галіёт. "Як табе імя?" – спыталіся ў яго. "Майго імя вы цяпер не даведаецеся,– адказаў Галіёт. – Вядзіце мяне туды, дзе будзе бітва". – "Пра тое не турбуйцеся, бітва будзе неўзабаве",– адказалі людзі. І селі яны, пятнаццаць вершнікаў, на коней; і паехаў Галіёт з таварышамі на тое месца, дзе мелася быць бітва.

А Трышчан з Іжотаю, Гаварнарам і Брагіняю ў вялікай радасці жылі ў верхнім замку. Не памятаў там Трышчан ні пра што, толькі пра Іжоту, а Іжота – пра Трышчана. І было для іх тое няведанне асалодаю, і жылі, як у Бога ў раі. І не згадвалі ні караля Марка, ні Карнавалі. Жылі яны ў такой радасці два месяцы, а напрыканцы трэцяга месяца прыходзіць да Трышчана адзін рыцар ды кажа: "Пане, цяпер ты яшчэ можаш весяліцца з Іжотаю, але заўтра маеш біцца з адным рыцарам, які дзеля гэтага прыехаў ад двара караля Артыюша. Мы пакінулі яго на тым месцы, дзе мае быць бітва". – "Ці ведаеце, як імя таго рыцара?" – спытаўсяТрышчан. "Не ведаем, не захацеў назвацца",– адказаў рыцар. А Трышчан падумаў, ці не Анцалот гэта, і мовіў: "Я ведаю, што гэта за рыцар. Ці дамовіліся пра бітву? Калі ён з'явіўся дзеля гэтага, то мецьме. І хаця не дзеля майго дабра ён з'явіўся, аднак жа прывітайце яго ад майго імя, бо не думаю, што ён вялікі рыцар". З тым і пакінуў рыцар Трышчана, прыйшоў да Галіёта і пераказаў: "Заўтра маеце біцца, а сёння Трышчан вітае цябе". – "Трышчан вітае мяне як непрыяцеля, і я таксама вітаю яго як непрыяцеля".

І доўга гаварылі між сабою пра рыцара, але не здагадаліся, хто ён. Гаварнар чуў, што той рыцар гаварыў пра бітву: "Гэта, вядома ж, Анцалот – паехаў, шукаючы розных жорсткіх прыгод, з двара караля Артыюша",– падумаў ён (Гаварнар дужа баяўся Анцалота) і, падышоўшы да Трышчана, сказаў: "Заўтра ты маеш бітву". – "Ці ведаеш, з кім?" – спытаўся Трышчан. "Не ведаю, ды мяркую, што гэта Анцалот наўмысна прыехаў біцца з табою, а ён – з вялікіх рыцараў свету",– адказаў Гаварнар. "Я рады падужацца з ім, бо як дойдзе да мечных удараў, а Бог мне паспрыяе і мы акажамся раўнёю, то не хацеў бы я большае славы. Калі ж ён заб'е мяне, то хай лепш ён, чым іншыя пяцёра рыцараў". Гаварнар яшчэ больш спалохаўся і мовіў: "Усё так, як ты кажаш, але вялікі страх і вялікая пагібель". – "Настаўнік,– сказаў Трышчан,– ты сам ведаеш, што смерці баяцца не трэба – на тым і стаім". Пачуўшы, пачала Іжота плакаць і тужыць, кажучы: "Цяжка мне на сэрцы! Што за ліхая прыгода, у які нядобры час нарадзілася я на свет! Яшчэ не выйшлі тры месяцы маёй фартуне й радасці, а ўжо надыходзіць мая пакута, канец жыцця майго. Каб мела я вялікую рану ці прычакала смерці, то было б мне больш асалодна і лепш!" А Трышчан суцяшаў яе, мовячы: "Прысягаю, што не ўзяць яму верху нада мною ні ў чым!". – "Не прашу я ў Бога большага, адно каб ты застаўся жывы ды не меў ганьбы ў той бітве, бо я не баюся ніводнага рыцара, акрамя Анцалота",– мовіла Іжота. І былі Трышчан з Іжотаю ў страху. Галіёт жа нічога пра тое не ведаў.

І як надышла ноч, з'явіўся адзін з тых збройных рыцараў, што ахоўвалі Галіёта, і мовіць: "Прыбыў, кажу вам, Кароль Ста Рыцараў, а з ім войска збройнае й коннае; спыніліся яны ў прыстані. Мы, хочучы датрымаць вашага закону, загадалі ім выйсці, а калі захацелі арыштаваць, яны пахапаліся за зброю ды перабілі нашых людзей – нямала пасеклі й пакалолі. Мы ж не змаглі супрацьстаяць, таму аддаліся ў іхнія рукі. Мы, пане, у іхніх руках, а яны з Кар'елоня, людзі прынчыпа Галіёта". Пачуўшы згадку пра Галіёта, усе разбегліся па сваіх патрэбах. Галіёт жа да раніцы заставаўся ў шатры.

А на світанку ўвабраўся Трышчан у вялікую зброю і, выслухаўшы імшу, выехаў з горада. А з ім паехалі Іжота, Гаварнар, Брагіня і чатыры слугі. І калі яны былі неўздалёку шатроў, Галіёт ужо быў на кані. Убачыўшы набліжэнне Трышчана, ухапіў Галіёт дзіду і тарчу. Убачыў Трышчан, што той гатовы, і мовіў Гаварнару: "Паедзь да таго рыцара і даведайся, хто ён: калі гэта Анцалот, хацеў бы я з ім таварышаваць". Гаварнар паехаў і прывітаў Галіёта, і той таксама прывітаў яго ў адказ. "Рыцару, гэта Трышчан, з якім ты маеш біцца,– мовіў Гаварнар. – Ён просіць, дзеля тваёй шляхетнасці, назвацца яму, хто ты; ты ж ведаеш ужо, з кім б'ешся, то хай бы і ён ведаў, з кім б'ецца". – "Калі ён – Трышчан, то я –ягоны смяротны вораг,– адказаў Галіёт. – І ёсць за што, бо ён забіў маіх бацьку і маці. Я прыйшоў адпомсціць яму ўсёй моцаю цела свайго, калі змагу. А імя мне – Галіёт з Дольных Выспаў, даволі далёка можна пачуць імя маё". Выслухаўшы Галіёта і ведаючы,

што ён найвялікшы на свеце валадар, спалохаўся Гаварнар і пра ўсё распавёў Трышчану, а той выслухаў і мовіў: “Божа, слава табе, што найвялікшы пан і найвялікшы рыцар свету бярэцца біцца са мною ў полі! Ён – вянец усіх годнасцяў і адвагаў. Пан над панамі прыйшоў біцца са мною, які можа паставіць у полі сто тысячаў войска, збройнага і пры дзідах”. Канец тым размовам.

Трышчанава бітва з Галіётам Прыпусцілі яны адзін да аднаго так хутка, як толькі коні маглі скочыць, і ўдарыліся з такой моцай, што дзіды іхнія паламаліся. І так моцна ўдарыліся, што абодва пападалі з коньмі на зямлю, ад гэтага ўдару абодва параніліся. І ўскочылі так, як тыя, што маюць вялікую годнасць і вялікае сэрца, пахапалі мячы й пачалі сячыся. Трышчан быў у стараху, але абодва былі вялікія мужы й біліся так моцна, што не было чалавека, які, гледзячы на гэта, не збаяўся б. Трышчан біў моцна, і Галіёт таксама: паказвалі адзін аднаму сваю варожасць. Трышчан пазнаў свайго непрыяцеля, а Галіёт падумаў: “Гэта той вялікі рыцар, слава пра якога йдзе па ўсім свеце. Тут мне прыняць смерць або застацца годным мужам”. І абодва сіліліся, паказваючы адзін аднаму ўласнае рыцарства. А Іжота думала, што прычакае канца таго, каго любіла больш за сябе. Калі ён трымаў удары, яна бляднела; і аддала б, здаецца, увесь свет, адно каб ён застаўся жывы і не пацярпеў у той бітве. Ударыў Галіёт Трышчана – і той падаў на калені, а Іжота прымала ўдары ў сваё сэрца і бляднела, як папуга. Калі ж, выціскаючы Галіёта з поля, біў Трышчан, Іжота весялела і залівалася чырванню. Яны біліся, а Іжота прымала ўдары ў сваё сэрца і была ўпэўнена, што Трышчан годна адстаіць у бітве, адылі Трышчан як хацеў ганяў Галіёта па полі. Галіёт быў моцна паранены і зыходзіў крывёю; Трышчан жа меў нязначныя раны. Галіёт усёй моцаю сіліўся супраць Трышчана: “Пабачым, колькі ж я змагу супрацьстаяць яму. – І з сумам падумаў: – Відаць, не абыду смерці ад Трышчана”. Тут прыйшоў на падмогу Галіёту са збройным людам Кароль Ста Рыцараў; а йшлі яны хутка, бо бачыў кароль, што Трышчан змагае Галіёта. Галіёт пазнаў сваю харугву і мовіў: “Трышчане, ты – нябожчык! Бачыш – гэта мае людзі. Ты забіў маіх бацьку і маці, і калі б я табе не адпомсціў – увесь свет уважаў бы мяне за благога чалавека”. – “Не можа таго быць, пане, каб ты застрашыў мяне людзьмі. Я ведаю цябе як годнага рыцара: не прыехаў бы ты да мяне сам, каб хацеў папомсціць мне праз іншага чалавека. Я не баюся нічога і не сцерагуся нікога, акрамя цябе. Бог сведка, што я не вінаваты перад табою за смерць тваіх бацькі і маці. Ты і сам тое добра ведаеш. Я прызнаю за табою перамогу ў гэтай бітве, а ты адпусці мяне з маімі таварышамі свабодна. Я зрабіў нядобра, што перамог цябе, вялікага пана і найвялікшага рыцара, мячом. Бог сведка, што кажу тое не ад страху, нібыта баюся смерці”,– сказаў Трышчан Галіёту і, падышоўшы, аддаў яму меч. Галіёт узяў меч і мовіў: “Ты мне столькі прычыніў, што я маю ненавідзець цябе ўсім сэрцам. Але не зраблю тое за тваю годнасць, бо ты – найвялікшы ў свеце рыцар. Не гадзіцца цябе губіць, я абяцаю табе сваё сяброўства”. Прыпаў Трышчан перад ім на калені свае і шляхетна падзячыў за ласку. Галіёт падхапіў яго пад пахі і мовіў: “Так не гадзіцца, паколькі я вялікі пан, а ты – такі ж вялікі і радавіты чалавек, як і я. А рыцар ты большы, як я, і няма табе ў свеце раўні”.

А Кароль Ста Рыцараў набліжаецца з дзідамі да Трышчана. Тут закрычэў яму Галіёт што моцы: “Стой! Пакінь Трышчана ў спакоі, калі хочаш жыць!” Пачуўшы тое, спыніўся кароль і адвярнуў войска, а сам пад’ехаў да Галіёта й спытаўся: “Пане, як табе павялося?” – “Дзякуй Богу, няблага, але й не дужа каб добра”,– адказаў Галіёт. “Я ж казаў вам і раней, што так станецца”,– мовіў кароль. “Я ж застаўся ў гэтай бітве жывы. Але дужа хацелася мне з ім біцца, і я цешуся, што з ім пазнаўся. Калі б тое было магчыма, хацеў бы я, каб яны з Анцалотам былі мне сябрамі, бо наколькі гэтыя рыцары адважныя, настолькі ж і шляхетныя і ўсялякае годнасці поўныя”,– адказаў Галіёт. “І што цяпер маеш рабіць?” – спытаў кароль. “Паедзьма разам з Трышчанам да ягонага дому, і там я адпачну, пакуль набяруся сілаў”,– адказаў Галіёт. І селі Галіёт, Трышчан, Іжота і ўсе іхнія таварышы хутчэй на коней, і заехалі на гару, у замак, што называецца Ораш. Там агледзелі Галіёту й Трышчану раны. Галіёт меў вялікія раны, і зыходзіў крывёю: прыкладалі лекары зёлкі да ранаў і дзівіліся, як той яшчэ жыве. І цэлы месяц не мог Галіёт целам варухнуць. А Трышчан праляжаў пятнаццаць дзён, і былі пры ім ягоныя таварышы. А тыя рыцары караля Артыюша, што былі ў вязніцы,– усе сабраліся да Трышчана (гэтыя людзі прыбылі з каралём Артыюшам, які Кароль над Ста Рыцарамі). І ўвайшлі яны ў Плачны Горад. Вязні ж павыходзілі на волю і падпалілі горад, бо месцічы біліся з імі за той Іосіфаў закон, якога не трымаліся праз многія гады. І Галіёт аддаў загад, каб ніхто не гнявіў ні Трышчанавых таварышаў, ні самога ягонага госця; і не дазволіў Трышчану ад’ехаць, пакуль яны абодва не акрыялі.

І сказаў Галіёт Трышчану: “Я прыбыў на гэтую выспу па тваю смерць, на помсту смерці бацькі майго і маці маёй, але ведаю, што ты забіў іх не з уласнае волі. За тваё рыцарстве прабачаю табе гэта. Ты казаў, што вязеш тую панну для свайго дзядзькі, як і абяцаўся яму, – я адпускаю цябе з ёю. Але дужа шкада, што ты не можаш паехаць са мною: нічога больш любага воку не бачыў бы я ў жыцці, каб угледзеў цябе побач з панам Анцалотам. Ты можаш атрымаць ад свайго дзядзькі дазвол і прыехаць да мяне ў Сарэлойнскае каралеўства або туды, дзе я буду. Прыгадай тую шляхетнасць і адпушчэнне гневу,

якія зазнаў ад мяне, ды прыязджай да мяне як найбарзджэй. Я ж абяцаю табе – як рыцар, бо ж я не кароль – тыя мае дзяржавы і землі, што заваяваў я для Анцалота і для цябе, каб вадзіць таварыства з вамі абодвума, а вам – сам мною. Большага багацця я й не хацеў бы". – "Пане, вялікая ласка твая – ты ж так шмат для мяне зрабіў. Я й не ведаю, як табе за тое аддзячыць. Яу судзіць мне Бог застацца жывому, у хуткім часе хацеў бы я з табою пабачыцца, дзе б ты ні быў. Кажу табе тое разам з сваімі таварышамі",– мовіў Трышчан. І было на моры спакойна. Галіёт праводзіў Трышчана да мора і прасіў яго, каб не ўчыніў інакш – адно так, як абяцаўся. Але потым, па нейкім часе, дайшла да Трышчана вестка, што Галіёт памёр. І быў з таго Трышчан у вялікай жалобе.

Расстаўшыся з Трышчанам, напісаў Галіёт уласнаручна ліст і паслаў каралеве Веліверы, а ў ім распавёў пра знішчэнне дрэнных законаў па смерці бацькоў сваіх, і што "няма ў свеце рыцараў большых, як тыя два, і не ведаю, каторы з іх большы – Анцалот з Локвы або Трышчан з Еліонаса, пляменнік караля Марка". Калі Велівера прачытала той ліст, была вельмі ўсцешная, і падумала: "З прыемнасцю пабачыла б я панну Іжоту і пана Трышчана". Пры двары не было пэўных вестак пра Анцалота, бо на той час ён быў з'ехаў з глузду, і было так праз два гады. А сталася тое тады, калі Міліенец караля Бана і Бандэмагуль з'явіліся пры двары караля Артыюша і Бандэмагуль выкраў каралеву Веліверу, якая была пад аховаю стольніка Кеніша, ды павёз яе ў Ландрэш.

І вось рушылі Трышчан з Іжотаю й таварышамі ў Карнаваль, да караля Марка. І быў там вялікі пір: як маладыя, так і старыя – усе весяліліся й бавіліся. У тым весяленні, як надышла ноч, прыйшоў Іжоце час ісці з каралём Маркам на ложа. І была Іжота ў вялікім суме, бо не магла забыцца на таго, якога кахала. "Хацела б я зараз быць яшчэ на выспе Арашай, дзе па сваёй волі мела Трышчана",– падумала яна, і з тымі думкамі легла на ложку. (Для страты "свайго" дзявоцтва ўпрасіла яна Брагіню – каб у тую першую ноч аказалася ў ложку з каралём заместа яе.)

Счакаўшы, увайшоў кароль Марк у спачывальню. А ў спачывальні, акрамя Трышчана, Гаварнара і Брагіні, нікога больш не было. Кароль хутчэй распрануўся, а калі Трышчан патушыў свечкі, спытаўся: "Навошта ты гэта зрабіў?" – "У Арляндэі існуе такі звычай: калі вялікі пан кладзецца з паннаю ў першую ноч, то, каб панна не пачувала сораму, свечкі тушаць. Ейная маці заклінала мяне зрабіць тое, і я паабяцаў ёй",– адказаў Трышчан. "То й добра зрабіў",– мовіў кароль. Пасля гэтага Трышчан, Іжота і Гаварнар выйшлі са спачывальні, а Брагіня легла на ложку заместа Іжоты. У той час, калі кароль уваходзіў у спачывальню, Іжота стаяла насупраць, стаілася за вуглом, пакуль не выйшла да яе з пакоя Брагіня. Споўніўшы сваю волю з Брагіняй, кароль і не здагадаўся, што гэта не Іжота. Неўзабаве Брагіня выйшла, а Іжота, увайшоўшы, легла з каралём.

І як надышоў новы дзень, сказаў кароль Трышчану: "Трышчане, угоднік ты мой, сыне мой ненароджаны, прынёс ты мне частае золата!". Трышчан дужа ўсцешыўся з таго. І на радасці загадаў кароль Марк рыцарам напоўніць сэрцы свае весялосцю, прыгаворваючы: "Прынёс мне Трышчан чыстае золата". І загадаў прынесці ўсялякія гудзёлкі, дуды, бубны, трубы, шахматы, варцабы, лютні, арганы. А такое весяленне наладзіў ён дзеля таго, каб рыцары імкнуліся да адвагі. Бачачы такое весяленне, пачалі панны таньчыць у гонар пана Трышчана гарацінскі танец, кажучы: "Прывёз нам пан Трышчан тое, з чым будзем граць-спяваць да канца дзён сваіх". І пазірала русая Іжота сваімі светлымі вачыма на пана Трышчана, а Трышчан пазіраў на Іжоту. І ніхто між усіх паноў, паняў і паннаў (акрамя Трышчана, Іжота, Гаварнара і Брагіні) не ведаў, што сталася ўначы. І праводзіў час кароль Марк са сваімі рыцарамі ў забавах.

Неяк прыйшоў да караля Марка адзін з яго рыцараў і мовіў: "Вяльможны каролю, хай будзе пад сакрэтам тое, што я табе скажу". Зірнуўшы на рыцара, мовіў кароль: "Кажы, што маеш". – "Ты магутны валадар, і непрыемная мне твая неабачлівасць. Я скажу табе: Трышчан кахае Іжоту цялесным чынам",– паведаміў рыцар. "Ці можаш тое давесці?" – спытаўся кароль. "Пане, чуў я, што маюць яны сустрэцца ў першую начную варту ў садочку за альтанкай",– адказаў рыцар. Хочучы ў гэтым пераканацца, сказаў кароль Марк рыцарам: "Маем ехаць". – "Каму загадаеш ехаць з табою?" – спытаўся Трышчан. "О пачэсны рыцару Трышчане, не едзь сёння са мною, чакай мяне тут да заўтра",– адказаў кароль. Ад'ехаўшыся далей ад двара, адаслаў кароль рыцараў, а сам вярнуўся назад, зайшоў у садок і забраўся на яблыню.

А ноч была месячная, і кароль не мог схаваць свайго ценю. А пан Трышчан умовіўся перад тым з Іжотаю, каб выйшла ў садок. Выйшла яна і спынілася пад яблыняй, радая каханню з Трышчанам. Падышоўшы бліжэй да Іжоты, заўважыў Трышчан на яблыні цень чалавека. Паглядзеў угору, прыпаў на калена і мовіў Іжоце: "О вялебная пані, вянец усіх паняў, прасіў я цябе выйсці ў гэты садок, каб падзяліцца сваімі думкамі. Мяркую пусціцца па моры й сушы, бо чуў, што казаў кароль Марк: "Глядзіць Трышчан на Іжоту мілосным звычаем". Як перад Богам, раскажы каралю пра маю службу, як біўся я дзеля яго з вогненным Бланорам, найбольшым рыцарам. Хай бы кароль не гневаўся на мяне". Іжота была вельмі мудрая й разважлівая ў кожнай справе – здагадалася, што Трышчан штосьці бачыць. Глянула яна на садок, і ўбачыла на зямлі чалавечы цень. І, не зірнуўшы на дрэва, сказала: "О вялебны рыцар, вянец усіх рыцараў, які любіш дзяржаву

караля Марка,– бо ж каралю ведама пра тваю вялікую паслугу – які вызваліў усю Карнаваль, ад малога да вялікага! Усе дзяржавы страсянуліся ад рыцарства твайго. Было б вялікае дзіва, каб забыўся кароль на тваю дабрыню і паверыў нейкаму рыцару. Я пагавару пра цябе з гаспадаром каралём. Будзь пэўны, што ён дасць веры мне, жонцы сваёй. Калі ж ты вырашыў адправіцца па моры й сушы, счакай, пакуль прыедзе кароль Марк". Пан Трышчан узнёс Богу хвалу і падзякаваў пекнай Іжоце, і пакланіўся, і пайшоў у агульны палац, а Іжота – у спачывальню.

Злез кароль Марк з дрэва і падумаў сам сабе: "Няма ў тым Трышчанавай віны. Калі б тое аказалася праўдай, цяпер было б інакш". І прыйшла каралю здагадка, што гневаецца той рыцар на Трышчана, бо хадзіў разам з ім у Арляндэю па Іжоту. А калі прыплылі яны да замка Дамалот у Ландрэшскім каралеўстве, якое было пад уладаю караля Дэмагуля, з'явіліся там, шукаючы сабе раўні, два рыцары, Яшчор і Марганор; і дужа хацелася Трышчану пазмагацца з імі. І той рыцар упрошваў Трышчана, кажучы: "Трышчане, не пасылай мяне біцца з тымі рыцарамі. Лепш пашлі мяне прывезці нашаму пану, каралю Марку, з горада Біяна ў Арляндэі Іжоту, дачку караля Ленвіза". Трышчан жа тады адказаў яму так: "Калі ты баішся бітвы ў Ландрэшы, то не едзь з намі і ў Арляндэю, бо і там знойдзем мы шмат годных рыцараў. А Іжоту без вялікае бітвы нам не аддадуць". Вось за што гневаўся рыцар на Трышчана. Прыйшло тое каралю на розум, і не мог даць таму веры.

Як вярнуўся кароль Марк у палац, прыйшла да яго Іжота і мовіла: "Вялебны пане, раскажу табе пра адну справу. Калі ты ад'ехаў з рыцарамі да іншага двара, а Трышчана пакінуў тут, захацеў ён паехаць па свеце. Я пытаюся ў яго: "Чаму ты з'язджаеш?" А ён і кажа: "Даведаўся я, што кароль глядзіць на мяне гнеўнымі вачыма". Я ж супакоіла яго, казаўшы, што даведаюся спачатку тваю думку. З гэтай прычыны прашу цябе, васпане: ведаеш і сам, як прыніжана была Карнаваль, як вызваліў яе Трышчан – забіў на выспе Самсоне рыцара Амурата Арляндэйскага, вызваліў Карнаваль ад малога да вялікага. І ўчыніў тое, каб ты панаваў. А яшчэ ж перамог ён найбольшага рыцара, вогненнага Бланора, а гэта ж – здабываючы мяне – рабіў ён і для цябе. Калі б які іншы рыцар прыехаў шукаць сабе раўні да твайго двара і даведаўся, што Трышчан у вас,– не рады б з ім біўся. А адважыцца каторы на бітву – Трышчан цябе праславіць, бо калі прыязджалі рыцары да двара майго бацькі, не было сярод іх ніводнага, хто ўстаяў бы супраць Паламідажа; калі ж той сутыкнуўся з Трышчанам, адылі Трышчан змог скінуць яго з каня. Таму, пане, не дазваляй яму пакінуць цябе". Выслухаў кароль Марк йеныя цудоўныя словы і сказаў: "Даносілі мне на Трышчана, але сам ведаю, што ён мне верны, і люблю яго сэрцам, як сябе самога".

Сон караля Затым сказаў кароль Марк пекнай Іжоце: "Бачыў я сон: была адна цудоўная краіна, і вырасла там пекная ружа, і былі на ёй вельмі прыгожыя кветкі. "Краіна гэтая будзе цудоўнай для такой пекнае ружы",– казалі годныя рыцары. Гаспадар жа тае краіны казаў: "Краіна мая, але ружа не мая: хтокольвек сарве гэтую кветку – ягонай і будзе". Нямала рыцараў прыбывала ў тую краіну, і кожнаму хацелася займець кветку тае ружы, ды нікому не ўдавалася яе сарваць. І вось з'явіўся нейкі рыцар – працягнуў руку да тае ружы і сарваў кветку. "Гэта дзіва, што нікому доўга не ўдавалася сарваць кветку ружы, а з'явіўся гэты рыцар – і хутка сарваў ейную кветку",– казалі астатнія рыцары. Калі ж ён захацеў яшчэ больш нарваць кветак, то не змог. Тым часам я прачнуўся". – "Пане, як на мой розум, ружа павінна належаць таму рыцару, які сарваў з яе кветку",– сказала Іжота. Кароль жа меркаваў, што ніхто да таго не дамысліцца. Іжота ж была вельмі мудрая і дамыслілася, навошта кароль тое сказаў: падалося Іжоце, што расказала Брагіня каралю пра ейнае каханне з Трышчанам. Таму моцна ўгневалася Іжота на Брагіню й здумелася, якім чынам звесці яе са свету.

І паехаў Трышчан праз чыстыя дубровы ў пошуку бітвы, бо ўжо колькі дзён думаў пра тое. І сказала Іжота Брагіні: "Пан Трышчан паехаў на пошукі бітвы і там, пэўне, мецьме колькі ранаў. А тых зёлак, якімі лекуюць раны, засталося вобмаль". – "О пачэсная пані, не слушна табе ехаць замест мяне,– мовіла тут Брагіня. – Каб прывезці зёлак для пана Трышчана, я паеду не толькі да чыстых дубровуў, але і далей, нават калі давядзецца паехаць далёка па моры й сушы. Але прашу цябе – пашлі са мною двух рыцараў, каб не сталася мне якога няшчасця".

Іжота загадала паклікаць двух слугаў і загадала ім убірацца ў панцыры, а як увабраліся, мовіла ім: "Едзьце з гэтай дзяўчынаю, а потым загубіце насмерць, а я за тое ўпрашу караля, каб зрабіў вас рыцарамі".

Заехаўшы ў чыстыя дубровы, здумеліся слугі: "Гэтая дзяўчына нямала паслужыла Трышчану ў горадзе Біяне ў Арляндэі. Яна мудрая й разважлівая. Трэба сказаць ёй, дзеля чаго мы прыехалі: ці не зробіць яна так, каб мы былі вольныя ад пакарання, а яна ад смерці?" І спыталіся ў Брагіні: "Ці ведаеш, дзеўчына, што маеш прыняць ад нас смерць?" – "Не магу з вамі ні пра што гаварыць, пакуль не ўбачу вашых абліччаў",– адказала Брагіня. Тады яны паздымалі гелмы і паказалі свае абліччы. І зразумела Брагіня, што яны паехалі, каб забіць яе. "Не смейце рабіць нічога іншага, акрамя таго, што вам загадалі,– мовіла яна. – Як схочаце, можаце застацца чыстымі ад граху і не парушыць прыказання Пана нашага". – "О годная дзеўчына, дзеля таго мы табе й сказалі, каб нам быць вольнымі ад граху, а табе ад смерці",– мовілі рыцары. "Павядзеце мяне на

раздарожжа ў чыстых дубровах. Ёсць там вельмі прыгожае дрэва, пры якім заўсёды мноства лютых звяроў. Прывяжыце мяне да таго дрэва – няхай прыму я смерць ад звяроў". А так сказала, бо рэдка здаралася, каб побач з тым дрэвам не аказаўся рыцар.

І павялі яе слугі ды прывязалі да таго дрэва. І пачалі аглядацца па ўсіх баках – адкуль жа прыйдуць тыя звяры. І ўбачылі, што едзе прыгожы Паламідаж Анупліціч, а за ім – ягоныя слугі. Усцешылася ўсім сэрцам Брагіня, бо пазнала прыгожага Паламідажа. Паламідаж усё зразумеў і сказаў сваім: "Не сталася так, як хацеў: прыехаў я, каб прыняць смерць ад рукі пана Трышчана, аж яго самога напаткала смерць, бо калі б пан Трышчан быў жывы – не сталася б так Брагіні". А затым спытаўся ў Брагіні: "Хай Бог злітуецца над табою, дзеўчына! Якою ж смерцю загінуў пан Трышчан? Бо каб ён быў жывы, не напаткала б цябе тое няшчасце". – "Рыцару, ведаю, што ты – адважны рыцар Паламідаж, сын караля Анупліта, найвялікшы непрыяцель пана Трышчана. Я гэтак жа не магла загінуць ад лютых звяроў, як не бачыла пана Трышчана такім вясёлым, як учора: паехаў ён у чыстыя дубровы шукаць бітвы з годнымі рыцарамі, бо даўно таго прагнуў",– адказала Брагіня. "У чым жа правінавацілася ты перад пекнай Іжотаю, што зносіш такую пакуту?" – спытаўся Паламідаж. "Адвяжы мяне ад дрэва, тады скажу",– адказала Брагіня. Адвязаў яе Паламідаж ад дрэва і мовіў: "Раскажы, дзеўчына". Тады тая пачала распавядаць: "Вось чаму мне так сталася. Паехала я з сваёй паняй з аднаго каралеўства ў другое; яна павезла сваю кветку, а я – іншую. Плылі мы па моры і ехалі па сушы. Плывучы морам, пані мая сваю кветку ўтапіла, а я сваёй не. Яна ж змясціла маю кветку туды, дзе было месца для ейнае – праз тое мне сталася гэтае няшчасце". – "Ці ведае пра гэта пан Трышчан?" – спытаў Паламідаж. "Не, не ведае",– адказала Брагіня.

І кажа тады Паламідаж: "О годная панна, нямала паслужыла ты пану Трышчану, і перада мною заслугі твае вялікія. Я збавіў цябе ад смерці, паслужы ж і ты мне". – "Кожны рыцар годны таго, каб жадаць гонару рыцарам і паннам". – "То едзьма з намі ў Карнаваль. А яшчэ раскажы мне пра звычай вашага пана, караля Марка",– папрасіў Паламідаж. "У нашага пана добры звычай: калі рыцары з'яўляюцца пры двары і кажуць каралю Марку, што прыехалі з іншага краю ў пошуку бітвы, кароль кожнаму з іх абавязаны паслаць каня і зброю. Калі ж іхнія коні стомяцца, будуць змагацца на свежых",– адказала Брагіня. "Чаму ж існуе такі звычай тут? – спытаўся Паламідаж. – Бо гэта ж звычай караля Артыюша, які вянец усіх каралёў на ўсе чатыры бакі свету". – "Звычай гэты ўведзены быў тады, калі пан Трышчан вярнуўся з Арляндэі ў Карнаваль",– адказала Брагіня. Пасля гэтага паехаў Паламідаж у Карнаваль. "Панна, хочу, каб да часу пра мяне не ведалі – хто я і адкуль",– папрасіў ён Брагіню.

І калі прыехалі яны да рыцарскага двара, прывялі Паламідажу каня і прынеслі зброю, спытаўшы: "Ці вы рыцары, што прыехалі шукаць бітвы?" – "Вядома. Ці ж тут пан Трышчан?" – спытаўся Паламідаж. "Паехаў у ловы",– адказалі яму. "А мне казалі, што ён у дубровах",– мовіў Паламідаж. "Паехаў шукаць бітвы з вялікімі рыцарамі і перамог тых рыцараў". – "І моцна ён паранены?" – спытаўся Паламідаж. "Паранены, але не моцна",– адказалі яму. "Ці хутка прыедзе пан Трышчан?" – пацікавіўся Паламідаж. "Не ведаем. Каб знайшоў там сабе бітву, затрымаўся б, бо ён – вянец усіх рыцараў, што любяць караля нашага Марка". Вельмі ўсцешыўся Паламідаж, што нічога не даведаўся там пра Трышчана, і выйшаў на вуліцу. І тут ён заўважыў трох паннаў. Ідуць яны вуліцай, гаворачы між сабою: "Загадаў кароль рыцарам і дзяўчынам з'явіцца да яго ў агульны палац". – "Што ты думаеш пра гэта?" – спытаўся Паламідаж у Брагіні. "Здаецца мне, што гаспадар кароль мае намер распытацца ў іх пра мяне",– адказала тая. "Калі я павінен біць чалом каралю?" – спытаўся Паламідаж. "Калі рыцары зыдуцца да караля ў агульны палац",– адказала Брагіня. "Любая панна, пільнуй таго часу",– папрасіў Паламідаж. І сказала Брагіня Паламідажу па нейкім часе: "Час табе біць чалом каралю Марку". І пайшоў Паламідаж на палац, а з ім яго рыцары.

Прыйшоў пекны Паламідаж пры двух мячах і чорнай тарчы, і пакланіўся. Кароль вельмі ласкава прывітаў яго, а потым сказаў: "Калі каму ведама, якою смерцю памерла дзяўчына Брагіня, хай скажа мне, а я таго чалавека шчодра ўзнагароджу. Калі ж хтосьці скажа, што яна жывая, то што б ні кранула рука ягоная,– не будзе яму забароны тое мець". І распавёў яму Паламідаж пра караля Артыюша, і кароль Марк узвесяліўся сэрцам. І загадаў прынесці шахматы, і сказаў Паламідажу, каб гуляў з ім. Як селі гуляць, мовіў кароль Паламідажу: "Я табе скажу, рыцару, што ніхто не адмаўляецца гуляць са мною ў шахматы". – "Ведама мне, кароль, што ты разважлівы пан. Але ці не хочаш згуляць вось на што: хто з нас выйграе, то няхай пераможца возьме сабе ўсё, што ні кране рука ягоная",– прапанаваў Паламідаж. І абодва з тым пагадзіліся.

Паламідаж выйграў і мовіў: "Кароль Марк Карнавальскі, ты сказаў: "Хто паведаміць пра жыццё дзяўчыны Брагіні, той хай возьме ўсё, што б ні кранула рука ягоная". А яшчэ ты сказаў, што калі хто з нас выйграе ў шахматы, то няхай возьме ўсё, што ні кране рука ягоная. А слова караля – рэч важнейшая справа, чым ягонае каралеўства. Дай ты мне пекную Іжоту, а я дам табе дзяўчыну Брагіню". – "То дзе ж яна?" – спытаўся кароль. "У маім доме,– адказаў Паламідаж і загадаў свайму рыцару: – Прывядзі Брагіню!" І прывёў рыцар Брагіню.

Убачыўшы яе, дужа рады быў кароль Марк, і сказаў адной дзяўчыне: “Ідзі, скажы Іжоце: апранайся, маеш паехаць з Паламідажам”. А пекная Іжота ўбіралася павольна, чакаючы, што прыспее пан Трышчан – не адважыўся б тады Паламідаж нават і нагадаць ёй пра той ад’езд. І прыйшла чароўная Іжота да караля. “Рыцару, вось твая пані”,– мовіў кароль Паламідажу.

Сэрца Паламідажа напоўнілася радасцю, узнёс ён Богу хвалу і падзякаваў каралю Марку за Іжоту. А пекная Іжота сказала Паламідажу: “Рыцар, за мае грахі аддалі мяне за караля Марка Карнавальскага – ён загадаў аддаць мяне табе. Ты сам памятаеш, як служыў дзеля мяне ў майго бацькі тры гады, ды не змог выслужыць. Калі ж так хутка ўдалося адбіць мяне ў караля Марка, то хадзем у гэтую царкву ды паклянемся перад Богам, што не пакінем адно аднаго да смерці”. Моцна ўзлаваўся Паламідаж на гэтыя словы і мовіў: “Хадзем, пані!”

І прыехалі яны да царквы. Скочыўшы з каня, зайшла Іжота ў царкву перш за Паламідажа. А ў той царкве звісалі да нізу раменныя лесвіцы. Узабралася Іжота па гэтых лесвіцах да верхняга акна, і апынуўшыся там, усцягнула лесвіцу наверх. Тут, вельмі радасны, зайшоў у царкву рыцар Паламідаж Ануплiціч. Калі ж ён убачыў сваю Іжоту ў царкоўным акне, то моцна засмуціўся і мовіў: “О шаноўная пані, навошта ты гэта робіш? Спускайся наніз, паклянемся перад Богам, што не пакінем адно аднаго да смерці. Ты ж сама так прапанавала, пані. Даю табе слова рыцара: паколькі кароль Марк аддаў цябе мне, не паеду без цябе”. – “Паедзь з Богам, бо ёсць у караля Марка рыцары, якія паехалі ў ловы: калі яны стрэнуць цябе пры сваёй царкве – мецьмеш вялікую бітву”,– адказала Іжота. “О шаноўная пані, не баюся я ніводнага рыцара, бо кароль Марк аддаў цябе мне”,– адказаў Паламідаж.

Тады паглядзела Іжота, дзе паехалі рыцары, і ўбачыла, што едзе да царквы пан Трышчан. А Трышчан меў такі звычай: едучы да двара або з двара, заўсёды заязджаў да гэтае царквы. “Рыцару, паедзь з Богам – набліжаецца да цябе рыцар”,– сказала Іжота Паламідажу. “Пані, што ты страшыш мяне рыцарам? – адказаў той. – Калі ён адзін, хай будзе два! Пані, спускайся наніз – маеш паехаць са мной”. – “Рыцару, паедзь з Богам: рыцарскім звычаем едзе рыцар да царквы, сцеражыся ўдару гэтага рыцара”,– кажа Іжота. “Калі ён адзін, хай будзе тры! Пані, спускайся наніз – прысягнуць, як абяцаліся”,– сказаў Паламідаж. “Рыцару, едзь ад царквы, бо прычакаеш сораму ад удару іншага рыцара – ужо той рыцар, які йдзе супраць цябе, недалёка ад царквы”,– мовіць Іжота. “Калі ён адзін, хай будзе іх дзесяць! Прысягаю словам рыцара, што чакацьму цябе тры дні і тры ночы, бо не хочу паехаць без цябе”,– адказаў Паламідаж. А Іжота й кажа яму: “Не тры, не два –толькі Трышчан едзе”. Тады ўскочыў Паламідаж на каня і паехаў як мага хутчэй, бо ведаў, што Трышчан ладзіць з дзідаю й канём.

Убачыў Трышчан, куды паехаў рыцар ад царквы, і пазнаў па знаку, хто гэта. І паімчаўся за ім што найбарзджэй, але не дагнаў і вярнуўся, бо конь ягоны стаміўся ў ловах. Прыехаўшы да царквы і ўбачыўшы чароўную Іжоту, дужа ўгневаўся Трышчан і не схацеў нават распытацца пра Паламідажа; сказаў толькі: “Сядай, пані, на каня, ды едзьма да караля Марка”. – “Не магу я паехаць да караля, бо ён аддаў мяне Паламідажу”,– адказала Іжота. “О шаноўная пані, як жа ж можа быць, каб кароль аддаў цябе Паламідажу? Ён жа любіць усялякія разнастайныя забавы”. – “Трышчане, калі б ён любіў забавы, ці аддаў бы мяне праезджаму рыцару?” – спыталася Іжота.

Па той размове паехалі пан Трышчан з Іжотай ад царквы вандраваць па свеце, і паехалі з Карнавалі ў Дамалот. І стрэла іх адна дзяўчына, і сказала: “Рыцару, не ведаю, хто ты, але бачу, што ты годны рыцар. Шкада мне твайго няшчасця, бо, калі ты паедзеш гэтым шляхам,– не зможаш не стрэцца з бядою”. – “Панна, дзякую табе ад усіх рыцараў, што ты радая асцерагчы рыцара ад няшчасця. Скажы мне, дзеўчына, чаму ты засцерагаеш мяне ад гэтага шляху?” – “Годны рыцару,– кажа тая,– наперадзе чакае цябе кароль Артыюш з сваёй каралевай Жанібрай, а з імі шмат годных рыцараў, і кожны любіць каралеўства караля Артыюша. Тыя рыцары, як пабачаць пры табе найпрыгажэйшую пані, захочуць адабраць яе ў цябе праз лютую бітву. Рыцару, там будзе не адзін ці два, а мноства годных рыцараў, што прагнуць зламаць свае дзіды – з уласнае волі аддасі сваю пані”. Адказвае ёй пан Трышчан: “Дзеўчына, хай заносяць табе хвалу ўсе рыцары і панны, што ты радая адвесці ад рыцара няшчасце, ды ведай: хто б і калі ні скінуў мяне дзідай з каня – ён не прымусіць мяне збочыць з гэтага шляху”. І пасля раз’ехаліся пан Трышчан з той дзяўчынай.

І вось убачыў ён шатры караля Артыюша (а яны былі хораша ўпрыгожаны); спадзяваўся Трышчан прыняць там бой, таму сказаў пекнай Іжоце: “Шаноўная пані, ці бачыш, як блізка пры дарозе напяты шацёр караля Артыюша? Ведаю, што тут мноства годных рыцараў. Калі паедзем простым шляхам да шатра караля Артыюша,– мецьму вялікую бітву. Калі ж праеду наўзбоч ад шатра караля Артыюша,– усё адно не міну бітвы, бо яны скажуць: “Вось вязе баязлівы рыцар найпрыгажэйшую панну!” Таму, пані, мушу ехаць да шатра караля Артыюша простым шляхам. А табе даю слова рыцара: глянеш куды-небудзь яшчэ, акрамя як мне, Трышчану, між плячэй, а каню свайму між вушэй – буду мець на цябе немалы гнеў”. – “О шаноўны рыцару Трышчане! Калі б я доўга блукала па моры й сушы, не знайшла б рыцара, большага за цябе. А тых, што

найвялікшыя рыцары пры двары караля Артыюша,– усіх іх бачыла я пры двары бацькі майго ў Арляндэі",– мовіла Іжота.

І пад'ехаў Трышчан да шатра караля Артыюша, бо напяты быў шацёр так блізка пры дарозе, што вяроўкі віселі над ёю. І паехаў Трышчан па дарозе па вяроўках, і зачапіў іх канём, і скалануўся ўвесь шацёр. А ў гэты час кароль сядзеў за сталом з сваёй каралевай Жанібрай і рыцарамі. Нічога не разумеючы, пачалі рыцары скакаць праз сталы, каб пабачыць, што сталася. "Хто ж гэта паказвае такім чынам сваю пыху перад каралём нашым Артыюшам, вянцом усіх каралёў?" – пыталіся. Пекная Іжота і Трышчан, пачуўшы звон посуду ў шатрах і чуючы, што рыцары, скачучы праз сталы, б'юць посуд, моцна спалохаліся, бо баяліся ганьбы.

І як павыходзілі рыцары з шатра, убачылі яны Трышчана, найвялікшага рыцара, а з ім ягоную пані. Быў між іх і Анцалот, сын Дамалота, караля з Локвы, наймілейшы Трышчанаў таварыш. Але не пазнаў ён Трышчана, бо той быў у панцыры. Убачыў Анцалот вельмі годнага рыцара, і кажа: "Шмат вандраваў я па моры і сушы, але не страчаў ніводнага рыцара, які б так моцна сядзеў на кані або так хораша трымаў нагу ў стрэмені, акрамя аднаго, і ніводнае так пекнае пані не страчаў, акрамя аднае".

А быў у караля Артыюша нядаўна пасвечаны на рыцара падчашы па імені Геюш, які меў вялікую адвагу, але мала моцы. Убачыўшы найпрыгажэйшую пані Іжоту, узвесяліўся той падчашы ў сэрцы сваім ды ўзнёс Богу хвалу. Пайшоў ён у шацёр да караля Артыюша і ўкленчыў перад ім, кажучы: "Усемагутнейшы кароль, вянец усіх каралёў, краіне тваёй няма раўні ні далёка, ні блізка! Ты абяцаў мне, што калі я ўбачу найпрыгажэйшую панну, ты аддасі яе мне. І вось, пане, калі б я шмат вандраваў па моры й сушы, то не знайшоў бы такой цудоўнай дзяўчыны, як тая, што з гэтым рыцарам, што праехаў зблізу твайго шатра і не біў вам чалом. Хай я забяру ў яго тую панну, а яго прывяду да цябе". – "Рыцару, калі ты прывядзеш да мяне таго рыцара, то не толькі тую дзяўчыну, але і ўсё, што захочаш, возьмеш",– сказаў кароль Артыюш.

З вялікай адвагай падзякаваў падчашы, нібыта ўжо меў у руках, што хацеў. І давай Геюш хутчэй убірацца ў панцыр, бо спяшаўся за Іжотай. Анцалот жа сказаў яму: "Геюш, не квапся ехаць за тым рыцарам, бо я ведаю, як ён трымаецца на кані і як трымае нагу ў стрэмені. Перш твой конь, наступаючы нам на лейцы, дасць прароцтва, чым ты прывядзеш яго пры сваім слабым стрэмені. Я табе скажу па-праўдзе: баязлівы рыцар не вазіў бы з сабой такой прыгожае панны, бо адабралі б яе ў яго шчэ да нас". – "Не гадзіцца аднаму рыцару адгаварваць іншага ад справы гонару. Даю слова рыцара: як стрэнуся з ім – не вялікая будзе мне патрэба ў выказванні свайго майстэрства",– адказаў Геюш. "Пане падчашы, я спадзяюся, што, зыйшоўшыся, не вялікае майстэрства выявіце вы",– мовіў пан Анцалот.

І вось, як найхутчэй, у поўнай бесклапотнасці, кінуўся падчашы за панам Трышчанам. Калі ж Іжота і Гаварнар заўважылі яго, сказала Іжота Трышчану: "Едзе за табой рыцар". – "Як едзе?" – пытаецца Трышчан. "Што найбарзджэй, як толькі конь можа",– адказвае Іжота. "Гэта новапасвечаны рыцар, ён не мае вялікага намеру выказваць перада мною свайго майстэрства, а я – перад ім",– сказаў Трышчан.

І тут выгукнуў гучна падчашы Геюш: "Рыцар, які возіш найпрыгажэйшую панну, пачакай мяне – пабачыш, хто з нас будзе больш годны ейнага кахання!" Перш як абярнуцца, узяў пан Трышчан дзіду пад паху, і крыкнуў Геюшу: "Едзь, то пабачыш!"

Трышчанава бітва з Геюшам Калі сутыкнуліся дзіды, паляцеў Геюш па адзін бок, а конь ягоны – па другі. А Іжота з Гаварнарам глядзелі, што будзе. Яны й не заўважылі, каб Трышчанава нага нават зварухнулася ў стрэмені, не тое што каб сядло пад ім зрушылася – усё на вялікую славу гэтаму рыцару. Скочыў пан Трышчан з каня, скінуў Геюшу з галавы гелм і хацеў пазбавіць яго душы. А той прасіў, каб яму даравалі жыццё. Тады кажа яму Трышчан: "Зрабі ж тое, што я табе загадаю, і тады я выбаўлю цябе ад лютае смерці і ад свайго вострага мяча". – "О пане, зраблю, нават калі ты выправіш мяне далёка па моры й сушы, адно не адбірай майго жыцця",– адказаў рыцар. "Рыцар, здымі з сябе зброю і аддай яе пану свайму, які цябе сюды прыслаў",– сказаў Трышчан і адвярнуўся да Геюша спінай. І здаволіўся на тым падчашы, і пайшоў пехам, несучы сваю зброю.

Аж едзе кароль Артыюш з сваімі рыцарамі й каралева Жанібра з паннамі. І ўбачылі рыцары, што ідзе конь, наступаючы на лейцы, а за ім, схіліўшыся, пляцецца рыцар. Тыя рыцары, што былі таварышамі падчашага, сказалі каралю Артыюшу: "Пане, які адважны твой падчашы і наш таварыш Геюш! Маем надзею, ён забіў таго рыцара, што быў з паннай, і нясе ягоную зброю – бо ніколі раней не бачылі мы такога ладнага панцыра, як на тым рыцары". – "О мой Божа! – усклікнуў пан Анцалот. – Якую ж бязглуздзіцу верзяце вы пану нашаму каралю Артыюшу: калі б наш рыцар перамог таго рыцара, ці ж пусціў бы ён свайго каня?! Даю вам слова рыцара: наш рыцар нясе ўласную зброю".

Пая тых размовах, несучы ў абярэмку сваю зброю, падышоў падчашы. Наблізіўся ён да караля ды кажа: "Пане, пабач мяне лепш жывога, чым мёртвага. Лепш было мне выканаць тваё даручэнне, як пазбыцца галавы. Я табе скажу, што няма рыцара, які змог бы *яму* супрацьстаяць". Моцна засмуціўся кароль, што з яго рыцарам сталася няшчасце. Паклікаў ён сваю каралеву Жанібру

і сказаў: “Пані, пайдзі з паннамі і ўпрасі Анцалота,– бо ён найвялікшы рыцар між нас, вянец усім рыцарам, якія любяць маю краіну – каб прывёў таго рыцара”.

І ўпрошвала каралева Анцалота, так гаворачы: “Найвышэйшы рыцару Анцалоце, дзеля Бога, здымі з нашага пана, караля Артыюша, цярновы вянец і ўскладзі з сухацвету: прывядзі да нас таго рыцара, і атрымаеш вось гэтую панну”. – “Шаноўная пані, дзеля чаго ты пасылаеш мяне за тым рыцарам – дзеля маёй прыкрае смерці? – спытаў Анцалот. – Але ж, паколькі загадваеш ты, мушу ехаць”.

Затым увабраўся ён у панцыр, скочыў на каня і паехаў за Трышчанам ціхай ступою, бо ведаў, што дагоніць яго. І думаў сабе: “Не ўцячы рыцару, які возіць з сабою такую пекную панну”. Калі быў Анцалот ужо неўздалёку, заўважылі яго Іжота з Гаварнарам. “Пане Трышчане, едзе за табой, паводле рыцарскага звычаю, рыцар”,– кажа Іжота. “Пані, як едзе той рыцар?” – спытаўся пан Трышчан. “Рыцар пекны сабою й едзе ціхай ступою”,– адказала Іжота. Глянуў Трышчан наперад, у далячынь, і ўбачыў вельмі прыгожую царкву, а перад ёй прыгожую альтанку. “Едзьма да царквы, пад тую альтанку”,– прапанаваў Трышчан. І паехалі туды. “Пані, гэты рыцар з бывалых, – сказаў Іжоце Трышчан. – Не ведаю, ці будзеш ты ягонай, ці маёй”.

І вось праехалі яны да царквы. Трышчан сеў пад альтанкаю ў халадку і зняў гелм з галавы, бо спацела яму галава. Пазнаў яго Анцалот і паехаў шпарчэй, бо ведаў, што гэта пан Трышчан, і вельмі рады быў з той сустрэчы. Заўважыўшы яго, уздзеў пан Трышчан гелм на галаву і ўскочыў на каня – і быў гатовы да бітвы. Убачыўшы Трышчана на кані, адшпурнуў пан Анцалот свой гелм. Тут пазнаў яго і Трышчан, і скочыў з каня. І прывіталіся яны вельмі ласкава, і пыталіся адзін у аднаго: “Рыцару, што за прыгоды ты зведаў ад часу, як мы расталіся?” Пан Трышчан хваліўся Анцалоту, так кажучы: “З усіх тых рыцараў, што, вандруючы, шукаюць сабе раўні – з племені караля Бана Баноцкага або караля Перамонта Францэйскага – ніхто не ўстаяў пад маім ударам”. – “Я – вянец усім тым рыцарам, якія любяць караля Артыюша”,– мовіў Анцалот.

Затым кажа Анцалот пану Трышчану: “Загадай рыхтаваць каня ды едзьма разам тваім шляхам, бо я не вярнуся да караля Артыюша”. – “Чаму ты не хочаш вярнуцца да караля?” – спытаўся Трышчан. “Таму што пры ім я буду мёртвы, толькі з табой застануся жывы”,– адказаў Анцалот. “Як жа так можа быць, рыцару?” – спытаўся Трышчан. “Паслалі мяне было, каб прывёў цябе – а тое ці змог бы зрабіць хоць адзін рыцар?”. Кажа Трышчан: “Паеду да караля Артыюша ды скажу яму, што ты большы за мяне рыцар”. – “Чаго Бог не схоча, таго ніхто не ўчыніць: я не большы за цябе рыцар, ты вянец рыцарству”,– адказаў Анцалот. І вырашылі: “Што параіць Іжота, тое і зробім”. Русая ж Іжота мовіла так: “Вы абодва годныя рыцары – Бог ведае, каторы з вас большы. Ды калі ўжо пастанавілі зрабіць так, як я вам параю, то едзьма да караля Артыюша: многія рыцары кажуць, што каралева Жанібра прыгажэйшая за мяне, але я добра ведаю, што я прыгажэй. Але ж хочу паглядзець на прыгажосць паняў і годнасць рыцараў”.

Затым паехаў Трышчан з сваім наймілейшым таварышам Анцалотам да караля Артыюша. Убачыўшы іх, вельмі радыя былі рыцары, бо думалі, што Анцалот вядзе таго рыцара. Калі ж Анцалот з Трышчанам былі неўздалёку шатра, зразумелі ўсе, што гэтыя рыцары добра ладзяць між сабою.

І вось увайшлі яны ў шацёр караля Артыюша (а больш за ўсё любіў кароль рыцараў). Укленчыў пан Трышчан і мовіў: “Пане, хай ведае тваё панства, што Анцалот – большы за мяне рыцар: ён прывёў мяне, як аленя за горла, да вашай вялебнасці”. І, сказаўшы так, падняўся Трышчан. Тады ўкленчыў Анцалот, узнёс хвалу Богу і сказаў каралю з каралеваю: “Панове, дзякуйце пану Трышчану за маё жыццё, бо ён не схацеў мяне загубіць – адно прывёў мяне, як дзіця бічам, у лагер караля Артыюша. Ведайце ж, што Трышчан – вянец усім рыцарам на ўсе чатыры бакі свету, па моры й сушы”. Сказалі тады ўсе рыцары: “Вы абодва годныя рыцары, хай злітуецца над вамі Бог! І, паколькі вы так хораша выявілі сваё рыцарства,– няма вашаму рыцарству раўні ні блізка, ні далёка. Ужо ж пабачылі мы вашую годнасць, хай жа пабачым яшчэ і прыгажосць вашых паняў”.

Прыбраліся каралева Жанібра й Іжота, як толькі маглі. І прыйшлі рыцары і суддзі караля Артыюша ацаніць іхнюю пекнасць. “Нас прызначылі справядліва судзіць на абодва бакі. Ды здаецца мне, што як прыгажэйшае золата за срэбра, так прыгажэйшая пані гэтага рыцара за нашую каралеву,– сказаў адзін з суддзяў. А потым спытаўся ў астатніх: – А як вы мяркуеце?” – “Мы мяркуем так сама, як ты рассудзіў: няма ні рыцара, годнасцю сваёй роўнага пану Трышчану, ні пані, якую можна было б параўнаць з пані Іжотай”,– адказалі астатнія суддзі.

Моцна ўгнявілася за тое каралева Жанібра на суддзяў, аднак нічога не магла з тым парадзіць, і здумелася, як бы зганьбаваць Трышчана. І прасіла Гаваона, пляменніка караля Артыюша, кажучы: “Рыцар, падужайся з Трышчанам. Як пераможаш яго – будзе табе вялікі гонар, што перамог найвялікшага рыцара; а як ён пераможа – табе ганьбы з таго не будзе, бо пераможа цябе найвялікшы рыцар”.

І кажа Гаваон Трышчану: “Рыцар, загадай рыхтаваць сабе каня – хачу падужацца з табой”. – “До’, годны рыцар,– мовіць яму Трышчан,– добра

кажаш: я ўжо колькі дзён хочу зведаць фартуну". І выехаў Гаваон пры поўнай зброі.

Трышчанава бітва з Гаваонам Як зышліся тыя рыцары на полі, то Гаваон, калі б мог, адмяніў бы тую бітву – такім прыгожым і годным падаўся яму Трышчан у панцыры. "Рыцар, сцеражыся майго ўдару!" – усклікнуў Гаваон. І ўдарыліся, паламалі дзіды на мноства кавалкаў і стукнуліся плячыма й тарчамі. Гаваон упаў па адзін бок, а конь яго – па другі. А Жанібра чакала з дзяўчынамі, што ж будзе дзеяцца між рыцараў, ды не заўважыла, каб нават нага Трышчанава рушылася ў стрэмені, не тое што каб зрушылася пад ім сядло. Чароўная Іжота ўзнесла Богу хвалу і ўсклікнула: "Памілуй, Божа, пана Трышчана!"

Убачыўшы Гаваона на зямлі, моцна ўзлавалася каралева Жанібра і не так шкадавала падзення Гаваонавага, колькі словаў Іжоціных. Пайшла каралева да рыцараў у агульны палац і мовіла ім: "Шаноўныя рыцары караля нашага Артыюша! За гонар Божы і на просьбу ўсіх рыцараў і паннаў пазмагайцеся з Трышчанам. І калі хто з вас пераможа Трышчана, ён узвялічыць увесь двор караля Артыюша. Калі ж пераможа Трышчан, не будзе вам з таго ніякае ганьбы, бо ён – вянец усім рыцарам".

І следам усе ўвабраліся ў панцыры, скочылі на коней, і кожны крыкнуў пану Трышчану: "Сцеражыся майго ўдару!"

Трышчанава бітва з рыцарамі караля Артыюша Кожны рыцар, які трапляў пад удар пана Трышчана, падаў услед за канём. І была тая бітва тры дні.

Зразумела тады каралева Жанібра, што няма пры двары караля Артыюша ніводнага рыцара, які мог бы выбіць Трышчана з сядла, і спадзявалася толькі на Анцалота. І ўпрошвала яго, кажучы: "Годны рыцару Анцалоце, падужайся з Трышчанам, каб мы былі ўзвялічаныя табою". – "Чаму пасылаеш мяне пад Трышчанаў удар, на лютую смерць? – спытаў Анцалот. – Але мушу тое зрабіць".

Затым гаворыць Трышчану: "Рыцар, кажы рыхтаваць сабе коней і ўбірайся ў зброю: маем біцца". – "Рыцару, няма ніводнага рыцара, з якім мне хацелася б пазмагацца так, як з табою,– адказвае яму Трышчан. – Калі пераможаш ты мяне – перамог наймілейшы мой таварыш і найвялікшы рыцар, а калі я цябе – перамог я наймілейшага таварыша і найвялікшага рыцара. Ці ж ты не бачыў, якая вялікая бітва была ў мяне цягам трох дзён?" – "Не гадзіцца табе прасіць у мяне часу ў адзін дзень, вазьмі сабе часу ў пятнаццаць дзён: бітва са мной будзе мацнейшая, чым з усімі тымі рыцарамі". А такі тэрмін вызначыў Анцалот, бо ведаў: Трышчан захоча даць бой раней.

І прыйшоў час ехаць Трышчану ў свой лагер; адкланяўся ён каралю, каралеве і рыцарам. Анцалот хацеў паехаць з ім, але каралева ўпрасіла яго, кажучы: "Годны рыцар, счакай: чула я, што мае прыбыць да двара караля Артыюша кароль Самсіж з Чорнае выспы".

А потым прыехаў кароль Самсіж і кажа: "Ведаю, кароль Артыюш, што ты – вянец усіх каралёў. Я прыехаў, бо ведаю, што з табой найвялікшыя рыцары. А вам, рыцары, што любіце дзяржаву караля Артыюша, кажу: калі перамагу кагосьці з вас, хай будзе ў маёй волі; калі ж каторы з вас пераможа мяне – хай я буду ў яго волі". Вельмі радыя былі рыцары з той навіны, і ўвабраліся ў панцыры; і кожны, згодна з воляй караля Артыюша, хацеў першы прыняць бітву з Самсіжам.

Бітва караля Самсіжа з рыцарамі караля Артыюша Потым узброіўся кароль Самсіж і асядлаў каня, і біўся з каралеўскімі рыцарамі; і кожны, хто трапіў пад удар Самсіжа, апынуўся пад канём. І выбіў кароль Самсіж з сядла адзінаццаць рыцараў.

Анцалот таксама захацеў выступіць супраць Самсіжа. Калі сутыкнуліся яны – паламалі дзіды свае на мноства кавалкаў і так стукнуліся плячмі, што коні прыселі пад абодвума. Анцалот упаў з каня, а кароль Самсіж павіс на кані, учапіўшыся за яго. "Наш рыцар не зведаў паразы, бо яны абодва пападалі з коней",– сказалі рыцары караля Артыюша. "Прайграную бітву нельга пачынаць нанова: у бітве перамог той рыцар, які не расстаўся з канём",– мовіў кароль Артыюш.

Быў любы кароль Артыюш рыцарам, а яны яму. І кажа кароль: "Лепш паехаць мне з маімі рыцарамі на Чорную выспу ў вязніцу караля Самсіжа, чым адстаць ад іх у той справе". Узброіўся кароль Артыюш, ускочыў на каня і кліча каралю Самсіжу: "Сцеражыся майго ўдару!"

Бітва караля Артыюша з Самсіжам І зышліся каралі ва ўдары. Для караля Самсіжа бітва з Артыюшам была лягчэйшая, як з найменшым з тых адзінаццаці каралеўскіх рыцараў. І ўпаў кароль Артыюш неўздалёку каня. А затым павёў кароль Самсіж караля Артыюша і рыцараў ягоных у палон. І былі рыцары ў вялікай тузе, кожны быў бледны ад жалю.

"Пане, давай разважым, як нам вызваліцца з рук Самсіжа, – кажа Анцалот каралю. – Як не вызвалімся з дапамогай Трышчана, то й з дапамогаю іншых рыцараў не вызвалімся". І паклікалі да сябе каралеву Жанібру. "Пані, знайдзі пана Трышчана і раскажы, што з намі сталася. Перадай яму ад мяне: просіць цябе Анцалот, твой наймілейшы таварыш: "Рыцар, калі ты не вызваліш нас з вязніцы караля Самсіжа на Чорнай выспе, то нам давядзецца памерці ў той вязніцы",– сказаў ёй Анцалот.

Каралева паспяшалася, і стрэла яна адну дзяўчыну. "Дзяўчына, ці не маеш сказаць што пра пана Трышчана?" – спыталася каралева. "Пані, пра каго ты пытаешся? Гэты рыцар заўсёды дома, а дом яго – на кані",– адказала тая.

У вялікім суме ад'ехала каралева ад тае дзяўчыны, і стрэла іншую дзяўчыну й спыталася: "Ці не маеш сказаць што пра пана Трышчана?" – "Пані, я не ведаю ні хто ты, ні што ты за пані, ні адкуль ты і як табе імя. Аднак жа бачу, што ты годная пані, але сумная. Калі ты пытаешся ў мяне пра пана Трышчана, то дзеля ягонае годнасці паведамлю табе. Ці ведаеш, дзе знаходзіцца першая прыстань? У той прыстані мноства суднаў. Ты адразу заўважыш ўвабранае ў перлы й каштоўныя камяні судна пана Трышчана. Калі не акажацца ў тым судне, спытай пра яго ў тым шатры, у якім заўважыш найбольшую прыгажосць і весялосць, ён тое любіць".

Радасная ад'ехала каралева Жанібра ад тае дзяўчыны. Неўзабаве ўбачыла яна тую прыстань, па апісанні дзяўчыны пазнала судна пана Трышчана і ўзвесялілася. Побач з тым суднам было многа рыцарскіх шатроў. Каралева заўважыла перад шатрамі дзяўчыну, падышла да яе й спытала: "Скажы мне, дзяўчына, дзе тут Трышчанаў шацёр?" – "Стаіш перад тым шатром, пра які пытаешся",– адказала тая. Каралева без папярэджання зайшла ў шацёр і пачала спешна распавядаць пану Трышчану, як кароль Самсіж павёў у палон караля Артыюша з ягонымі рыцарамі. "Рыцару, Анцалот, твой наймілейшы таварыш, прасіў перадаць табе: "Калі ты не вызваліш нас з вязніцы караля Самсіжа, мусім там і памерці".

А Трышчан у той час адпачываў: за дзень перад тым біўся ён з вялікімі рыцарамі – перамог дванаццацёх рыцараў і меў невялікія раны, а таму ляжаў. Пачуўшы словы каралевы, схапіў ён у галавах ложка меч і так моцна страсянуў ім, што аж кроў пацякла на ложак з ранаў ягоных. Убачыўшы тое, сказала Іжота каралеве: "Пані, ты каранаваная каралева, што ж ты прыходзіш да рыцара з сумнымі весткамі? Табе трэба было прыйсці і раскрыць мяккія вусны для ціхіх размоваў, каб сэрца рыцара навярнулася да адвагі". – "Пані Іжота, якія розныя ў нас думкі! Ты – найпякнейшая ў свеце пані, і маеш пры сабе свайго пана, на якога ўскладаеш надзею. Ты можаш зрабіць яго здаровым, як найбольш, за дзесяць дзён. Я ж бачыла, куды павялі майго пана караля Артыюша і ягоных рыцараў",– адказала каралева. Пасля слоў каралевы Жанібры злосна паглядзеў пан Трышчан на Іжоту.

Іжота ведала натуру Трышчана, што ён любіць павесяліцца. Таму ўхапіла яна каралеву за руку й пачала вельмі хораша граць гарацінскі танец. І пачало ад таго сэрца пана Трышчана поўніцца адвагаю, і прасіў ён Гаварнара: "Дай мне лютню!" Трышчан пачаў вельмі хораша граць, і ад слухання лютні сэрцы абедзьвюх паняў і пана Трышчана напоўніліся радасцю.

Затым кажа пан Трышчан Іжоце: "Падрыхтуй мне судна й пакладзі ў яго хлеба й віна. Даю табе слова рыцара: або я застануся з каралём Артыюшам у Самсіжавай вязніцы, або вызвалю караля Артыюша й ягоных рыцараў". – "Пане, паедзеш тады, як будзеш здаровы",– мовіла Іжота. "Я магу лячыцца едучы гэтак жа, як і лежачы, бо раны запякліся пад даспехамі і лекар непатрэбны",– сказаў Трышчан. Зразумела тады Іжота, што не ўдасца яго адгаварыць, і кажа: "Пане, судна тваё ўпрыгожана і падрыхтавана, засталося занесці туды стравы й віны".

Тады зайшоў Трышчан на судна, а з ім Іжота, Гаварнар і каралева Жанібра. Як адплылі ад берага, узняўся вецер і ўсхадзілася мора, і не ведалі, да якога берага прыстануць. Прасіла Жанібра Іжоту, кажучы: "Пані, я не навучаная плаваць па моры. Прасі пана Трышчана, каб указаў прыстань, дзе ўзнеслі б мы Богу хвалу, які выбавіць нас ад смерці на моры". Убачыўшы, што робіцца на моры, узяў Трышчан лютню і пачаў граць. І доўга граў, і ніводная пані не думала пра прыстань – так люба было ім слухаць. "Плывіце да прыстані, каб нам узнесці хвалу Госпаду Богу, што выбавіў нас ад смерці на моры і ад граху",– загадаў Трышчан маракам.

І прысталі маракі пад нейкі замк, дзе была добрая прыстань, але дрэнны закон. Прынялі там Трышчана ласкава і спыталіся ў яго: "Рыцару, кім даводзяцца табе тыя панны?" – "Сёстрамі,– адказаў той і, паказаўшы на Жанібру, сказаў: – Гэта старэйшая сястра". І паказаў на Іжоту: "Гэта – мая малодшая". – "Хай злітуецца з вас Бог, нідзе не бачылі мы так падобных сваякоў",– сказалі жыхары.

"Рыцары, не ўважце за благі намер тое, пра што буду ў вас пытацца, бо ў нашай зямлі з гэтага не дзівяцца: калі б ведаў, то не пытаўся б",– мовіў Трышчан. – "Рыцар, звычай тут добры – пытай пра што хочаш",– адказалі жыхары. "Спытаюся ў вас вось пра што: бачу, што вы прыгожыя сабою, але чаму вы такія бледныя?" – мовіў Трышчан. Яны ж адказалі: "Ці ж ты не ведаеш тутэйшага звычаю? Гаспадыняю гэтага замка ёсць адна дзяўчына, якая не зведала мужчыны і мае такі звычай: хтокольвек прыплыве ў гэтую прыстаню – не б'е ёй чалом, покуль не будзе спакладзены. А ты, рыцар, калі спакладзены, удар ёй чалом". – "Нямала вандраваў я па моры й сушы, але не страчаў такога дрэннага звычаю,– кажа Трышчан. – Гора вам, што вы яго зносіце; а з намі станецца, што Бог спашле. Дайце мне каня і зброю, і я паеду, адкуль прыехаў". – "Рыцар, іншыя рыцары таксама маглі да таго даўмецца, калі б так магло быць",– адказалі яму.

Трышчана схапілі й кінулі ў вязніцу, а ў той вязніцы ўжо сем гадоў былі дванаццаць рыцараў. "Давайце дазволім сябе спакласці: лепш нам памерці на волі, чым у вязніцы",– казалі яны між сабою. "О мой Божа, гэта ж у нас пан Трышчан!" – мовіў раптам адзін з іх; а іншы спытаўся: "Што ты радуешся няшчасцю найбольшага рыцара

і нашай пагібелі?” – “Не таму я радуюся, пра што ты гаворыш, але радуюся нашаму вызваленню і ягонаму гонару, бо я ведаю, як умее абысціся з мячом пан Трышчан”,– адказаў рыцар.

А былі ў тае панны два браты: адзін старэйшы, а другі малодшы. Малодшы мог гаварыць з сястрою заўсёды, калі хацеў, а старэйшы такога права не меў. І кажа ёй малодшы брат: “Панна, хай возьме наш брат за сябе старэйшую сястру таго рыцара, а малодшую вазьму я”. – “Калі будзеш і надалей казаць мне пра тое – расстанешся з душою”,– адказала яму сястра.

Выйшаў ён з палаца і ўбачыў Жанібру з Іжотай, а тыя стаяць, вельмі хораша ўвабраныя. І падумаў ён па шчырасці сэрца: “Калі б тая малодшая пагадзілася пайсці за мяне, я пагаварыў бы з сваёй сястрой яшчэ”. Падышоў ён да іх ды й кажа Іжоце: “Панна, калі я ўпрашу тваю сястру, ці пойдзеш за мяне?” – “Панічу, няма для нас нічога больш любаснага за нашага брата, які ў вашай вязніцы”,– адказала яму Іжота. (А Іжота насіла пад сукняю Трышчанаў меч.) – “Я мог бы памагчы вам убачыцца з вашым братам, але адкажы мне спачатку наконт кахання, пра якое я табе казаў”. – “Спачатку спытайся ў сваёй сястры”,– кажа Іжота.

У гэты момант укінула Іжота меч у вязніцу. Ухапіў пан Трышчан меч у свае рукі і пайшоў да турэмнае брамы; а за ім і ўсе рыцары выйшлі з вязніцы. Калі ўбачылі гэта тамтэйшыя рыцары – кінуліся да іх па вуліцах, хапаючы з лёту дзіды й чапляючы гелмы на галовы, бо і раней уцякалі рыцары з вязніцы, але іх вярталі назад.

Адзін з іх, вельмі адважны, перш за іншых падбег да Трышчана, хочучы вярнуць яго ў вязніцу – галава таго рыцара далёка адляцела ад тулава. Пан Трышчан пачаў наносіць жорсткія ўдары, і кожнага, у каго толькі бачыў дзіду ў руках або гелм на галаве, забіў.

І мела тая панна звычай: не рушалася й з месца насустрач таму рыцару, які біў ёй чалом. Калі паведамілі пра Трышчана, яна, як змяя на купіне, пасмыкалася на залатой кушэтцы. Калі ж убачыла Трышчана ў дзвярах свайго палаца, дык хутчэй ускочыла, стрэла яго сярод палацу, і цякла вада па ейных нагах. І ўкленчыла перад Трышчанам, а пан Трышчан ухапіў яе за макаўку і сцяў ёй галаву, і адкінуў прэч, кажучы: “Няхай не пануе больш дрэнны закон на гэтай выспе!”

Агледзеў Трышчан палац – ці няма там рыцараў, але нікога не аказалася, хіба толькі паніч, што не быў яшчэ пасвечаны на рыцара. І прыйшло Трышчану на розум, калі яго ўбачыў: “Ці не брат гэта тае панны, які хацеў узяць Іжоту?” І выйшаў з ім, і спытаўся ў Жанібры й Іжоты: “Пані, ці павінен гэты паніч пазбыцца галавы?” – “Пане, мы не рады нічыёй смерці, але гэты паніч прасіў мяне”,– адказала Іжота. І сцяў яму Трышчан галаву. Тады Жанібра спыталася: “Пані, навошта ты гэта зрабіла?” – “Шаноўная пані, цяпер я ведаю натуру пана Трышчана: калі б я не сказала яму праўды, не ведаю, што б з намі й сталася”,– адказала Іжота.

Затым сабраліся рыцары ў агульны палац. Пан Трышчан загадаў прывесці ўсіх коней і прынесці ўсю зброю тае панны. І адарыў кожнага з рыцараў, якіх застаў у вязніцы, канём і зброяй; і сказаў ім: “Рыцары, вы колькі гадоў чакалі выхаду на волю. А цяпер хто што пажадае – тое няхай і бярэ”. З вялікай пакорай падзячылі рыцары пану Трышчану і мовілі: “Рыцар, паколькі ты збавіў нас ад смерці, хочам пайсці з табой, хочам табе служыць”.

“Рыцары, хай будзе вам падзяка ад рыцараў і паняў, што вы ўшаноўваеце мяне між сабой. А калі хто з вас хоча назвацца дадзеным мною, Трышчанам, слугою Анцалота – таго зраблю я гаспадаром гэтага замка і гэтае прыстані”,– адказаў ім Трышчан. І кажа адзін з рыцараў па імені Амадор: “Пане, я хочу быць дадзеным табою, панам Трышчанам, слугою пана Анцалота”. І аддаў яму пан Трышчан той замак і прыстань пры ім, каб стаў ён слугой наймілейшаму ягонаму таварышу. І казалі тыя рыцары: “О любы наш Божа! Як клапоціцца пан Трышчан пра ўзвелічэнне Анцалота! Хай злітуецца з нас Бог!”

А потым пан Трышчан спешна выправіўся морам да караля Самсіжа, і прыстаў да берага ў іншай дужа добрай прыстані. Горад быў прыгожы, і ўсе звычаі там былі добрыя. Толькі адзін падступны крыжак, які шмат дасягнуў падступствам сваім і быў павінен у ганьбаванні рыцараў і паннаў, меў такі звычай: па-здрадніцку забіваў кожнага госця і забіраў ягоны набытак.

Прыстаўшы з тымі панямі да берага, узяў Трышчан лютню ў рукі і вельмі хораша зайграў. Прыйшлі рыцары з таго горада паслухаць тое вясёлае й прыгожае гранне, а з імі й падступны крыжак. “Рыцар гэты створаны не на зло, а на рыцарства”,– казалі яны. І ніхто не мог здаволіцца, тую лютню слухаючы. А падступны крыжак здумеўся, як бы забіць таго рыцара пры тых дзьвюх паннах. “Я маю золата і срэбра і ўсялякую прыгажосць, якія здабыў падступствам сваім і адвагаю, а калі б яшчэ і сцяў галаву таму рыцару, што з тымі дзьвюма паннамі, то Бог дастаткова зрабіў бы для мяне”,– думаў ён.

З таго часу й да ночы хадзіў падступны крыжак ля Трышчана, каб забіць яго, але ніяк яму тое не ўдавалася. “Раніцой рыцар можа пайсці на імшу, я ж дачакаюся яго за муром – і так адсяку яму галаву”,– падумаў крыжак. І вось пайшоў пан Трышчан на імшу: Іжота несла за ім меч, а каралева Жанібра – тарчу. І рыцары, якія бачылі тое, мовілі: “Гэта найвялікшы рыцар і найцудоўнейшыя панны!”. А калі былі неўздалёку царквы, кажа Іжота Трышчану: “На табе меч, рыцар, – сцеражыся ўдару іншага рыцара!” Перш як абярнуцца, схапіў Трышчан меч – аж стаіць за

муром рыцар з аголеным мячом, хочучы парубаць Трышчана. Наскочыў на яго пан Трышчан, і з аднаго ўдару пакацілася галава крыжака. “Як стаў рыцарам, то з ніводным рыцарам не меў я такога простага бою, як з гэтым. І вельмі шкадую пра тое”,– мовіў Трышчан.

“Не будзе больш падступнічаць, і табе ж хацеў тым паслужыць”,– сказалі рыцары. Паколькі Трышчан спяшаўся да караля Самсіжа, то не рады быў таму, што забіў рыцара: меркаваў, што з-за крыжака тутэйшыя рыцары выклічуць яго на бой. Калі ж увайшоў у царкву, падышлі да яго з паннамі рыцары таго горада й мовілі: “Рыцар, падзяка табе ад усіх рыцараў за тое, што знішчыў ты ў гэтай добрай прыстані злы звычай. Хадзем з намі – аддамо табе ўсю маёмасць крыжака, бо належыць яна вам і нікому іншаму; ды яшчэ таму, каму ты дасі; ты вольны ў гэтай справе, бо мы вырашылі – ад каго крыжак прыме смерць, таму й ягоная маёмасць”.

Пайшоў пан Трышчан з тымі рыцарамі, яны ж паказалі яму склепы і, адамкнуўшы іх, сказалі: “Рыцар, гэта – тваё!” Убачыў у тых склепах Трышчан мноства ўсялякага дабра, золата й срэбра, і перлаў, і каштоўных камянёў, і тавару. Пачаў пан Трышчан дзяліць тое дабро між рыцараў і паннаў і ўсіх, хто на тое заслужыў. А рыцары таго горада таксама адорвалі яго, кажучы: “Будзь узвялічаны, рыцар, што загубіў падступнага крыжака!”

Адпачнуўшы ў тым горадзе колькі дзён, кажа Трышчан каралеве Жанібры й пекнай Іжоце: “Шаноўныя пані, вы бачыце, якія прыгоды напаткалі нас на гэтым шляху. Калі мы такім чынам дабярэмся да Чорнае выспы, да караля Самсіжа, не ведаю нават, што з намі й будзе, не тое што каб вызваліць караля Артыюша і ягоных рыцараў”. – “Пане Трышчане, калі б нам давялося вандраваць па моры й сушы – не знайшлі б мы такога дарадцы, як ты”,– адказалі пані. Загадаў пан Трышчан скроіць для сабе й свайму Гаварнара лацінскія рызы, а тым паням – манаскія сукні, а ў судна пакласці размаітага тавару. Зрабіўся Трышчан лацінніком і выправіўся ў мора. “Вязеце нас да Чорнае выспы”,– загадаў ён маракам Трышчан. І паплылі, і я плылі па моры наўздалёку якое прыстані, тады пан Трышчан заўсёды граў на лютні й тым весяліў паням сэрцы. І прыплылі неўзабаве да Чорнае выспы.

Выйшаўшы насустрач, кінуліся барзджэй рыцары караля Самсіжа да судна, бо меў кароль Самсіж той звычай: адкуль бы ні прыйшло судна, рыцары прыходзілі й бралі, што хацелі. А купцу, які паскардзіцца, што яго абабралі, кароль выплачваў замест рыцараў.

І сказаў Трышчан мараку: “Адплыві ад берага, бо мне ведамы звычай караля Самсіжа. І калі хто адбярэ ў мяне Жанібру або Іжоту, то нічым не зможа кароль Самсіж мне сплаціць: золата й срэбра і я маю дастаткова”.

Пасля гэтага ўсклікнуў Гаварнар: “Прыплыў адзін купец, які хацеў бы прадаць свой тавар – няхай не чыняць яму гвалту!” – “Купец, прысягаюць гаспадар кароль і ўсе рыцары, што не будзе нічога проці твае волі, і гвалту табе не будзе”. Затым прыстаў пан Трышчан да берага; і напялі шатры, і расклалі пры іх мноства размаітага тавару.

Прыйшоў да Трышчана адзін рыцар, пытаючыся: “Годны рыцар, чаму ты зрабіўся лацінніком?” – “Шмат ёсць людзей, падобных на рыцараў. Я б і рады быць тым рыцарам, за якога ты мяне ўважаеш, але ж я – лацінніК. Калі табе што патрэбна, купі, маю табе што прадаць”,– мовіў Трышчан. А той кажа: “Рыцар, я ведаю цябе: ты – той рыцар, што перамог пры двары караля Ленвіза ў Арляндэі трох рыцараў, пляменнікаў караля Бана Баноцкага. У годнасці няма табе раўні ні блізка, ні далёка”. – “Нішто так не ўводзіць у зман, як чалавечае аблічча. Калі б ты ўздзеў панцыр, я падумаў бы, што й ты рыцар; але ж бачу цяпер, што ты блазан, і хочаш ад мяне падарунка”,– адказаў Трышчан. Стала таму рыцару дужа сорамна, і сказаў: “Нічога не бачыў я так падобнага, як гэты купец да таго годнага рыцара”.

Іншыя ж рыцары пыталіся: “ЛацінніК, кім даводзяцца табе гэтыя панны?” – “Гэта мае сёстры: адна старэйшая, а другая – малодшая”. Яны ж пайшлі і пераказалі каралю Самсіжу, мовячы: “Пане, з тым купцом, які прасіў аб прысязе, дзьве дзяўчыны-сястры. Калі б мы прайшлі свет накрыж, не знайшлі б прыгажэйшых. А малодшая белая, што папер, і прыгожая, што ружа. Каб хацеў, ты мог бы іх купіць”.

І вырашыў кароль Самсіж сам глянуць на іх. Падышоў ён да Трышчанавага шатра ды кажа: “Здароў, лацінніК!” Трышчан падступіў да яго і прывітаў. І дзівіліся каралеўскія рыцары, як шляхетна пакланіўся той лацінніК каралю: “Ніхто з нас не здолеў бы гэтак зрабіць”. А кароль зайшоў у шацёр і застаў тых паняў за гульнёю ў шахматы, што былі з крышталю і вельмі прыгожыя.

“ЛацінніК, кім даводзяцца табе гэтыя панны?” – спытаўся кароль. “Сёстры мае”,– адказвае Трышчан. “Прадай мне гэтыя шахматы”,– просіць кароль. “Ты не зможаш мне заплаціць”,– адказвае Трышчан. “Калі б ты захацеў, я даў бы табе за кожную пешку вандроўнага рыцара, а за гэтага караля – караля Артыюша”,– мовіў кароль. “Што не прадаецца, таго не купіш”,– сказаў Трышчан. Кароль жа: “Прадай мне малодшую сястру, я адмераю табе за яе золатам трыкроць, і срэбрам, колькі схочаш”. – “Пане, ты абяцаў мне, што калі я не захочу штосьці прадаць, не будзе мне ў тым прымусу. Калі б я хацеў прадаць сваю сястру, то ў першай жа прыстані ўстанавіў бы вялікі кошт”,– адказаў Трышчан. Кажа тады кароль: “Грайма ж у шахматы на яе і на трэцюю частку майго каралеўства!” – “На што не будзе маёй волі, абяцаў ты мне, у тым не будзе прымусу,– адказаў Трышчан. – Я ж не ведаю, як гуляць у шахматы.

Пастаўлю я папа на першае месца, а дзе маю паставіць іншыя фігуры?" – "Лацінніік мае рацыю – у іх поп самы шанаваны",– падумаў кароль. А потым кажа: "Лацінніік, пазмагаймася ж за гэтую панну і палову майго каралеўства". – "Ты абяцаў мне, што не будзе гвалту ў тым, на што не будзе маёй волі. Я не ведаю, як сесці на каня або ўвабрацца ў панцыр",– кажа Трышчан. "Давай жа рубацца за ўсё маё каралеўства! З трох гэтых прапановаў выбяры сабе што хочаш! А не захочаш – я і дарма вазьму!" – "Як няма праўды ў тваіх першых словах, то не можа быць і ў апошніх. Ніколі не даводзілася мне бачыць вялікае бітвы, адно калі, гуляючы, пачнуць біцца лацінскія дзеці драўлянымі мячамі, гойсаючы па вуліцах. Ці не так і мы з табою маем біцца?" – пытае Трышчан. "Так, лацінніча! Але мы маем біцца жалезнымі. Ты добра зрабіў, што прывёў да мяне гэтую пекную панну".

Назаўтра прынеслі Трышчану ад караля двайны панцыр, кажучы: "Убірайся, лацінніча!" Трышчан пачаў накладваць левую наруч на правую руку, а правую – на левую, і правую нанаж на левую нагу, а левую – на правую; і сказаў: "Занясіце гэты панцыр вашаму пану, бо не пасуе светлы панцыр лацінскім плячам!"

Панеслі слугі панцыр каралю, і сказалі: "Літасцівы кароль, ён не ўмее ўбірацца ў панцыр! А пані нашая, гледзячы на яго, смяецца, весяліць сябе тым, не шкадуючы, дзеля пашаны да цябе, смерці свайго брата". А Трышчан мовіў між іншым Жанібры й Іжоце: "Падрыхтуйце лекі для ранаў, бо іду я да найвялікшага рыцара гэтага свету. Ды ўбярыцеся ў найлепшыя строі".

Выйшаў пан Трышчан у поўным узбраенні; а на гелме ў яго – вянок вельмі прыгожых кветак, а за ім – абедзьве пані. А кароль Самсіж стаяў з сваімі рыцарамі. Калі ж ён убачыў Трышчана, расхацелася яму з ім біцца. А як убачыў хораша ўвабраную Іжоту, то каб змог, нават праз парушэнне прысягі, узяў бы яе без усялякае бітвы – такой пекнай яна яму падалася. "Лацінніча, за што ты пагадзіўся на бітву са мной? За маё каралеўства?" – пытаецца кароль. "Кароль, ты тое сказаў, але я з тым не згаджаўся, бо ведаю, што смерць мая недалёка; але мушу згадзіцца на бітву з табой. Шмат вандраваў я па моры й сушы, і калі ўжо маю памерці, то хацеў бы памерці там, дзе як найбольш людзей пабачыць маю смерць. Чуў я, што ў тваёй вязніцы ёсць мноства годных людзей – загадай іх выпусціць: хай паглядзяць на маю смерць",– адказаў Трышчан. "Чым яму тое дапаможа, што кароль Артыюш з сваімі рыцарамі ўбачыць ягоную смерць? – мовіць кароль сваім рыцарам. – Загадайце ж вывесці іх з вязніцы!"

І вось выйшаў кароль Артыюш з сваімі рыцарамі з вязніцы. Убачыўшы Трышчана з Самсіжам, дванаццаць рыцараў караля Артыюша – акрамя Паламідажа, найвялікшага Трышчанавага непрыяцеля – і пан Анцалот рассмяяліся. "З чаго вы смеяцеся? – спытаўся тады кароль Артыюш. – Не дзіўлюся з іншых, але дзіўлюся з Анцалота, які смяецца са смерці найвялікшага рыцара і наймілейшага свайго таварыша, а таксама з нашай і сваёй пагібелі".– "Калі нам суджана быць вольнымі праз Трышчана, то лепш нам памерці ў гэтай вязніцы на Чорнай выспе",– сказаў Паламідаж. Анцалот жа адказаў: "Не смяюся я з ягонае смерці, але любая мне нашая свабода, бо ведаю: калі тут каралева Жанібра й Іжота – пан Трышчан выкажа майстэрства!"

Кароль Самсіж падышоў і мовіў Трышчану: "Біся, лацінніча!" – "Пане, навучы мяне",– папрасіў Трышчан. Кароль выхапіў меч і пачаў бразгаць аб панцыр, кажучы: "Так сячы, а так прыкрывайся!" А затым спытаўся: "Ці згодны ты, лацінніік, скончыць гэтую бітву і аддаць мне панну?" – "Кароль, ты, як вялікі пан, добра мяне навучыў. А што, як змагу я адбіць твой меч,– ці зможаш ты тады сячыся?" – спытаўся Трышчан. "Як зможаш, то прыкрывайся, але ты не зможаш". Пытаецца тады ў яго Трышчан: "А калі б я змог сячыся?" – "Сячыся!" – кажа кароль. "Кароль, ты навучыў мяне. Сцеражыся ж мяне цяпер!"

Бітва Трышчана з каралём Самсіжам І пачалі ганяцца, як ільвы па полі, кідаючыся адзін на аднаго, як рыцары, якім няма раўні ні блізка, ні далёка. Прыбіваў Самсіж Трышчана – і падымаў той уверх меч і тарчу, і падаў на калені пад моцнымі ўдарамі Самсіжа. А калі Трышчан прыбіваў Самсіжа – той падымаў уверх меч і тарчу, і падаў на калені пад моцнымі ўдарамі Трышчана. "Вялікія цуды! – усклікнулі рыцары караля Самсіжа. – Не было ніводнага рыцара, які змог бы спрацівіцца ўдарам нашага пана, а гэтаму рыцару ўдаецца – скача, як леў". Наляцеў Самсіж і пачаў рубаць з усяе моцы Трышчана па панцыры. Калі б не вытрымалі іхнія панцыры – абодва былі б нежывыя. Пад канец бітвы ўбачыў Трышчан, што Іжота змянілася з твару, і таму адкінуў пан Трышчан тарчу ды ўхапіўся аберуч за меч, і не марудзячы пачаў чыніць жорсткія ўдары. І секануў караля Самсіжа па абедзьвюх руках, і адпалі тыя рукі з мячом на зямлю. "Абараняйся, кароль, каб не акрывавіць мне рук тваіх – больш нічога я не ўмею!" – усклікнуў Трышчан. А потым схапіў меч за канец і паднёс Самсіжу, кажучы: "Чаму ты кінуў свой меч? Калі ён для цябе зацяжкі, на ж табе мой меч, а гэты аддай мне". І глянуў кароль Самсіж на Трышчана з лютай злосцю. "Чаму так гнеўна на мяне пазіраеш? Што я хітра і лоўка цябе перамог? Не мог я абысціся з табою інакш, толькі так",– мовіў Трышчан. Кароль жа сказаў: "Шаноўны рыцару Трышчане, зведаў я тваё майстэрства валодання мячом на сабе, і прасіў Бога, каб не даў мне памерці гвалтоўнаю смерцю ад тваіх жорсткіх удараў і вострага мяча твайго. Даю табе слова рыцара: калі б ты прыслаў да мяне таго, хто распавёў бы мне пра цябе, я адпусціў бы караля Артыюша

і ягоных рыцараў, бо бачу, што прыйшла праз іх да мяне мая смерць”.

Бачыў тое кароль Артыюш і рыцары, падышоў кароль да Трышчана, і напоўнілася сэрца ягонае радасцю. І пачалі рыцары люба вітацца з Трышчанам, і ўзносілі Богу хвалу, і дзякавалі пану Трышчану: “Найвышэйшы рыцару, хай будзе табе хвала ад усіх рыцараў, што ты вызваліў нас з Самсіжавай вязніцы”. – “Хай злітуецца Бог з Трышчана, бо па ўласнай добрай волі так шмат учыніў ён для караля Артыюша і ягоных рыцараў!”

Пан Трышчан загадаў прынесці ўсё, чым весяліў сябе Самсіж – трубы, дуды, лютні, арфы, арганы, шахматы, варцабы, вельмі хораша ўпрыгожаныя паводле гарадскога звычаю. І пачалі весяліцца. Каралю Артыюшу і ягоным рыцарам было любасна чуць тое весяленне. А калі сам пан Трышчан узяў лютню і пачаў вельмі хораша граць, напоўніліся сэрцы караля Артыюша і ягоных рыцараў радасцю ад слухання гукаў Трышчанавай лютні. І ніхто з рыцараў, слухаючы, не насыціўся.

Схапіла тут Іжота каралеву Жанібру і аддала яе каралю Артыюшу: “Пане, пан Трышчан аддае табе гэтую пані: калі вам прычынілася якая непрыемнасць – хай усё пачэсна направіцца”. Кожнага рыцара адарыла Іжота канём і зброяю. “Што ні кране чыясьці рука – не будзе яму забаронена тое мець”,– сказала Іжота рыцарам. А затым звярнулася да Анцалота: “Рыцар, аддае табе Трышчан усё, што набыў з маёмасці падступнага крыжака. Таксама аддае табе рыцара Амадора з замкам тае дзяўчыны, якая ўстанавіла ў сваёй прыстані адменены цяпер звычай”. Кароль Артыюш узнёс Богу хвалу і падзякаваў Трышчану, кажучы: “О найвышэйшы рыцару Трышчане, хай будзе ўзвялічана тваё рыцарства ўсімі рыцарамі і ўсімі людзьмі па ўсіх чатырох баках свету! Годнасці тваёй няма раўні на зямлі ні блізка, ні далёка!”

Тут прыехаў з Францэі адзін рыцар ад караля Перамонта. Ён ведаў тых рыцараў з прыстані і вельмі хацеў падужацца з імі. Зразумеў Трышчан, па што ён прыехаў, і сказаў каралю Артыюшу: “Вялебны кароль, вянец усім каралям, дзеля славы Божай, дай мне адзін дар”. – “Ты вольны ва ўсім, аднак жа не дазволю табе біцца з гэтым рыцарам”,– сказаў Артыюш. “Менавіта пра гэта й прашу, а ўсяго астатняга маю дастаткова”,– мовіў Трышчан. А кароль: “Я сказаў так, бо ты стомлены; але будзь вольны і ў гэтай справе”. І падзякаваў яму Трышчан.

“Рыцар, на сваё вялікае няшчасце дзякуеш ты яму”,– сказаў Трышчану францэйскі рыцар. “Пабачым”,– адказаў Трышчан.

Бітва Трышчана з францэйскім рыцарам Ускочылі абодва на коней і моцна сутыкнуліся, струшчылі дзіды на многа кавалкаў, а самі ўдарыліся тарчамі і плячыма. Францэйскі рыцар паляцеў на адзін бок, а конь ягоны – на другі. І ніхто не прыкмеціў, каб хоць нага ў стрэмені зварухнулася ў Трышчана.

Іншыя рыцары таксама было прыйшлі шукаць сабе раўні, ды калі ўбачылі, што францэйскі рыцар пераможаны, не захацелі біцца – ударылі чалом Артыюшу і паехалі туды, адкуль прыехалі. Адпачнулі ў той прыстані кароль Артыюш і ягоныя рыцары колькі дзён, а потым у вялікай радасці адплылі ад Чорнае выспы ў мора; а з імі і пан Трышчан.

У першай жа прыстані адлучыўся ад іх Трышчан, а Анцалот вельмі прасіў караля адпусціць яго з Трышчанам. “Годны рыцару Анцалоце, як патрапім дадому, тады зможаш паехаць адтуль да Трышчана: бо заўсёды зможаш знайсці яго там, дзе шукаюць рыцары сабе раўні”,– сказаў кароль.

А потым прыехалі да Трышчана сямёра рыцараў; і ўзнеслі Богу хвалу, што знайшлі Трышчана, і мовілі: “О найвышэйшы рыцар, узвялічаны ты рыцарскім ушанаваннем! Прыехалі мы праз веліч славы тваёй, бо і іншыя рыцары пытаюцца пра тваю мосць”. – “Кажыце, што патрэбна”,– сказаў ім Трышчан. “Славуты рыцару, мае Смердадуг-паганец такі звычай: калі спыніцца хто ў ягонай прыстані, то кожнага рыцара прыме ласкава; а як надыдзе першая начная варта, кіне рыцара на жорсткія пакуты: і ніводны рыцар не зможа адтуль з’ехаць, не зазнаўшы няшчасця. Мы таксама былі ў ягонай прыстані і зносілі тое ж, што й іншыя рыцары. Дзеля гонару Божага, пашкадуй нашага няшчасця – выпраўся з намі ў тую прыстань, бо калі мы не ўзвялічымся праз цябе, то ўжо нам канец. Будзе лепш, калі ты з Божае ласкі адмяніш той злы звычай”,– мовілі рыцары. І кажа Трышчан: “Мне таксама шкада тае вашай ганьбы, я паеду з вамі, але з умовай: да часу ніхто не павінен ведаць, хто я і адкуль”.

Калі Трышчан і тыя рыцары з’явіліся ў прыстані Смердадуга-паганіна, выйшлі з замка рыцары й вельмі ласкава прывіталі іх; потым забралі зброю і павялі ў агульны палац.

Зайшоў Смердадуг-паганін у жаночую спачывальню ды кажа сваёй дачцэ: “Вазьмі лютню, ідзі ў Чорны палац і, граючы, весялі тых рыцараў, каб не спалі ад грання, пакуль не надыдзе час кінуць іх на пакуты”.

І тая, узяўшы лютню, пайшла да рыцараў і пачала вельмі хораша граць. Рыцары, што не чулі грання пана Трышчана, думалі, што ніхто больш не змог бы так цудоўна, як тая панна, граць. “Панна, не адмоў мне ў тым, пра што папрашу”,– кажа Трышчан. “Не адмоўлю”. – “Пазыч мне лютні. Чую, што ты хораша граеш. Мы вандроўныя рыцары, мо’ і між нас каторы ўмее трохі граць на лютні”,– папрасіў Трышчан. Дала яна яму лютню, і Трышчан не ўдарыў па струнах адразу, а пачаў перш настрайваць, а настроіўшы, чароўна зайграў. І ад таго грання сэрца кожнага рыцара напоўнілася радасцю. А тая дзяўчына падступілася бліжэй, каб пераняць ноты. “Каб і я ўмела гэтак граць, што была б для мяне ўся маёмасць

бацькі майго!” Пачуўшы тое, вярнуў ёй Трышчан лютню.

І не схацела яна больш ударацъ па струнах, і пайшла да бацькі свайго, сказала: “Ойча, калі схочаш паганьбіць тых рыцараў, то не жыцьмеш, бо ёсць спаміж іх пан Трышчан, які не дапусціць ганьбы”. – “Скуль ты ведаеш, што гэта пан Трышчан? Тыя рыцары, што бачылі яго – ці ж бы яны яго не пазналі? А ты, не бачыўшы ніколі, пазнала?” – спытаў Смердадуг-паганін. “Па тым я пазнала, што ніводны рыцар, акрамя Трышчана, не ўмее граць на лютні так, як я. А спаміж іх ёсць рыцар, які грае на лютні лепш за мяне”,– адказала тая.

І вырашыў паганін паглядзець на ўсё на свае вочы. Прыйшоўшы да рыцараў, пачаў ён з імі гаворку. І сапраўды, дзіўныя справы зыходзілі ад таго рыцара, пра якога расказала яму дачка; па годнасці ягонай пазнаў яго. І пачаў прыслужваць рыцарам, як толькі мог, і даў ім на ноч харошы пакой на іхні выбар.

А назаўтра адпусціў рыцараў, і зачынілі за імі гарадскую браму і ўзвялі масты. А адзін з гарадскіх рыцараў мовіў: “Вы, сямёра рыцараў, дзякуйце пану Трышчану за ўтаймаванне гэтае прыстані, а то мелі б непрыемнасці. А калі з вамі Трышчан – нічога не бойцеся”. – “Мы былі б радыя, каб з намі быў пан Трышчан і каб усюды, у якой бы прыстані мы не з’явіліся, былі мы ўзвялічаныя Трышчанам”. – “Сапраўды, ты – сам Трышчан”,– сказаў рыцар. Ад’ехаўшыся ад таго горада, развітаўся пан Трышчан з рыцарамі. Яны ж дзякавалі яму, што праз яго былі ўшанаваныя ў той прыстані.

“Многіх рыцараў я зганьбіў, а калі б яшчэ і Трышчана зганьбіць, то выканаў бы я сваю задуму”,– падумаў Смердадуг-пананін, і паехаў ён за Трышчанам, дагнаў яго і кажа: “Найвышэйшы і слаўны ва ўсе чатыры бакі свету рыцар, вырашыў я павандраваць па свеце. І з ніводным рыцарам або каралём не хацеў бы вандраваць, адно з табою. Хачу я назвацца тваім слугою. Прашу цябе, пане, паедзь са мной да майго дому: я пакіну замак на князя ды паеду з табою”.

Даўшы веры ягоным словам, паехаў пан Трышчан адзін. І як прыехаў у прыстань, у вялікай радасці выйшлі месцічы страчаць Трышчана, кажучы: “Хай будзе ўзвялічана імя тваё! Мы – твае слугі”. І, забраўшы ў яго зброю, выйшлі з палаца; і пачалі радзіцца між сабою.

Быў там адзін рыцар здалёку. І кажа ён пану Трышчану: “Рыцар, не ведаю, хто ты й адкуль, але ж бачу ў табе годнага рыцара і прыгожага чалавека. Шкада мне твайго няшчасця. Яны радзяцца пра тое, якою смерцю цябе ўмарыць”. Прайшоўся Трышчан па палацы і, не знайшоўшы ні гелма, ні дзіды, упаў у роспач, што не было пры ім ягонага мяча.

Прыйшлі рыцары таго горада і арыштавалі Трышчана. “Якою смерцю яго пакараем?” – “Ідзіце й засячыце яго”,– кажа Смердадуг-паганін. А таго ж дня з’явіўся там адважны рыцар Паламідаж Анупліціч пры двух мячах і чорнай тарчы – найвялікшы пры двары караля Артыюша Трышчанаў непрыяцель – і кажа: “Не слушна пазбаўляць такога годнага рыцара галавы без бітвы – перамажыце спачатку, паводле рыцарскага звычаю, у бітве. Бачыў я, як здымае рыцар рыцару галаву, але ж паводле рыцарскага звычаю. А таго, што вы хочаце ўчыніць, не бачыў”. – “Бачылі мы, як злачынца за злачынцу заступаецца”,– адказалі яму.

Зразумеўшы, што іх абодвух з Трышчанам зганьбілі, падскочыў Паламідаж і падаў адзін меч Трышчану, а сабе пакінуў другі. Як люты звер, наляцеў Трышчан і пачаў моцна рубаць направа і налева. І ў каго толькі заўважаў у руках дзіду, а на галаве гелм – таго сек. Потым пайшоў ён у палац, каб забіць паганіна, аж бачыць – той уцякае з усіх ног. І амаль ужо дагнаў яго Трышчан, як той забег у сваю царкву, куды рыцар не мае права ўваходзіць з мячом. “Выходзь, здрайца, і бараніся ў бітве!” – крыкнуў Трышчан. А той у адказ: “Будзь пэўны, што, пакуль ты тут, не выйду адсюль!” (Таксама, як не выходзіў і будучы ў замку.) Трышчан адышоўся ад тае царквы, бо ведаў звычай, што не гадзіцца яму там стаяць з аголеным мячом. Пайшоў ён да Смердадугавага палаца і ўзнёс Богу хвалу, што збавіў яго ад гвалтоўнае смерці.

І кажа Трышчан Паламідажу: “Рыцару, дзякую табе ад усіх рыцараў і паннаў, што не даў мне загінуць!” – “Рыцару, за ўсю маю паслугу, якую я табе аказаў і яшчэ думаю аказаць, дай мне адну рэч, якую я ў цябе папрашу”,– гаворыць Паламідаж Трышчану. “Дам усё, што ні папросіш, акрамя Іжоты”,– кажа Трышчан. “Будзь жа маім найвялікшым непрыяцелем, як і раней”,– адказаў Паламідаж. “Хай будзе па-твойму, рыцару,– пагадзіўся Трышчан. – Ты аказаў мне вялікі гонар, і я таксама магу аказаць табе гонар”. – “Іншага нічога й не хочу, акрамя гэтага”,– сказаў Паламідаж. І зразумеў Трышчан, што мае біцца з Паламідажам. “Рыцару, калі я павінен біцца, то хочу біцца сваім мячом, а не гэтым, што ты мне даў”,– кажа Трышчан. І прынеслі пану Трышчану ягоны меч. І ўвабраліся абодва рыцары ў панцыры.

Бітва Трышчана з Паламідажам І кінуліся адзін на аднаго з вялікай адвагаю, і пачалі ганяцца адзін за адным, як ільвы. А гэтак моцна рубаліся дзеля таго, каб не стрымалі іхнія панцыры і абодва былі мёртвыя. Прыбіваў Паламідаж Трышчана – той прыкрываўся мячом і тарчай, адступаючы пад ударам Паламідажа. А потым Трышчан адкінуў ад сябе тарчу, ухапіў меч аберуч і пачаў рубаць, не прыкрываючыся. Паламідаж, падаючы на калені, падымаў угору меч і тарчу, чакаючы смерці ад моцнага ўдару Трышчана. “Гэты рыцар загубіў многіх рыцараў, а цяпер перамагае прыгожага Паламідажа”,– казалі рыцары таго горада. Секануў Трышчан Паламі-

дажа па гелме: рассек яму тым ударам гелм і нанёс ваялікую рану на галаве. “Рыцару, калі ты мяне пераможаш – не ўхваляць цябе рыцары, бо ты ж бачыў, якая бітва была ў мяне з тымі рыцарамі. Завершым гэтую бітву ды вызначым сабе тэрмін: дзе б ні аказаўся хто з нас, хай спыніцца праз той тэрмін пры гэтай царкве, у якой збіраюцца рыцары”,– мовіў Трышчан Паламідажу. І вызначылі тэрмін у пятнаццаць дзён. А так учыніў Трышчан, бо ягоны востры меч мог прычыніць Паламідажу цяжкую смерць. І расталіся адзін з адным.

Паехаў Паламідаж да двара караля Артыюша і распавёў яму пра Трышчанаву прыгоду, кажучы: “О рыцары нашага добрага пана караля Артыюша! Згадайце годнасць пана Трышчана, як многа гонару аказаў ён рыцарам. А цяпер не можа сабе добра зрабіць”. – “Чаму?” – спыталіся кароль Артыюш і ягоныя рыцары. “Падмануў яго Смердадуг-паганін – па-здрадніцку заманіў яго ў свой горад і зняволіў. Я біўся за яго з паганінам і атрымаў рану на галаве, праз якую якое не мог больш з ім біцца. І пастанавілі мы сустрэцца праз пятнаццаць дзён ля тае царквы,– і назваў Паламідаж тую царкву. – Як змагу, буду біцца за яго. Калі ж рана мая да таго часу не загаіцца, тады вы яго вызваляйце”. Дужа шкада было таго каралю Артыюшу і рыцарам ягоным. “Як сталася такое няшчасце з маім таварышам?” – спытаўся Анцалот. Але потым усцешыўся разам з каралём: “Як выйдзе Смердадуг – нядоўга яму давядзецца выхваляцца сваім майстэрствам перада мной!”

Калі надышоў тэрмін, прыехаў пан Трышчан да тае царквы, а з ім Іжота і Гаварнар. А над дзвярыма тае царквы былі выпісаны такія словы: “У гэты дзень леў мае біцца са змеем”. – “Калі я леў, тады Паламідаж не змей, а калі я змей, тады Паламідаж не леў. Буду я кімсьці з іх, а Паламідаж не будзе”,– падумаў Трышчан.

А ў гэты час прыехаў у панцыры пан Анцалот; і вырашыў ён, што гэта чакае яго Смердадуг-паганін. А Трышчан падумаў, што прыехаў Паламідаж. Імкліва й адважна кінуўся Анцалот у бой, а Трышчан чакаў яго смела і ўмела.

Бітва Трышчана з Анцалотам І як сышліся яны – паламалі дзіды і стукнуліся плячыма і тарчамі, і пад абодвума пападалі коні. Трышчан упаў з каня, ухапіў меч і падумаў: “Ніхто не мацнейшы з дзідаю на кані і ніхто – з мячом на зямлі”. Кінуліся яны адзін да аднаго і пусціліся ў высцігі, як два ільвы, кідаючыся адзін на аднаго, як тыя, каму няма раўні ні блізка, ні далёка. Прыбіваў Анцалот Трышчана – і прыкрываўся той тарчай і мячом, адступаючы пад ударамі Анцалота. А калі пан Трышчан, не прыкрываючыся, пачаў вельмі жорстка рубаць – Анцалот, прыпадаючы на калені пад моцнымі ўдарамі Трышчана, прыкрываўся мячом і тарчай. “Вялікі цуд: ні між вялікіх рыцараў з двара караля Артыюша, ні з Банака, з племені караля Бана, ні ў далёкіх краях не было да гэтага часу рыцара, які мог бы гэтак трымацца з мячом супраць пана майго Трышчана – толькі наймілейшы таварыш ягоны Анцалот, сын караля Дамалота з Локвы”,– сказаў Трышчанаў Гаварнар. А Анцалотаў Гаварнар сказаў: “Шмат вандраваў я па моры й сушы, але не бачыў ніводнага з вялікіх рыцараў караля Артыюша, ні з іншых далёкіх краін рыцара, які змог бы так трымацца з мячом супраць пана майго Анцалота – толькі пан Трышчан”.

Пачуўшы тыя словы, кажа Іжота рыцарам: “О годныя рыцары, разбярыцеся, што тут да чаго, каб потым не шкадаваць вам”. Паздымалі рыцары гелмы і пазналі адзін аднаго, і пачалі вельмі люба абдымацца. І распытваліся адзін у аднаго, якія хто меў прыгоды ад часу, як расталіся. Трышчан хваліўся Анцалоту, кажучы: “Колькі ні было вандроўных рыцараў – а гэтыя годныя рыцары, вандруючы, шукалі сабе раўні – і з племені караля Бана Баноцкага, і ад караля Перамонта Францэйскага – ніхто не ўстояў перада мною”. – “Усім, хто любіць пана нашага, караля Артыюша,– усім тым я карона”,– сказаў Анцалот.

Затым кажа Анцалот: “Рыцару, уздзень гелм на галаву ды давай рубацца, толькі цяпер мы параненыя. Але ні ў адной бітве не ўдасца нам узвысіцца аднаму над адным. Няхай лепш адзін з нас прыме смерць ад другога”. – “Хай злітуецца з цябе Бог, рыцар, чаму ты хочаш біцца? Няма на свеце ніводнага рыцара, з якім бы я так рады быў мець бітву, як з табою. Бо калі ты мяне пераможаш – пераможа мяне найвялікшы рыцар і найлюбшы таварыш, а калі я цябе перамагу, то перамагу карону ўсіх рыцараў, найвялікшага рыцара і найлюбшага таварыша. Ды лепш было мне з табою не знацца, рыцару: тады біўся б я з табою з большай ахвотай, як ведаючы цябе”,– адказаў Трышчан. “Выздаравейце спачатку, рыцары,– а выздаравець можаце за пятнаццаць дзён,– а бітве дайце спакой”,– кажа ім Іжота. Забрала іх Іжота, і паехалі яны за ёю ў панцырах. А раны іхнія прэлі ў панцырах.

І сустрэлі яны аднаго зброяносца з чорным сцягам, за якім везлі на возе мёртвага рыцара. І кажа той зброяносец пану Трышчану: “Рыцар, пан мой Паламідаж умовіўся з табою словам рыцара: у якім бы маёнтку ён ні аказаўся, ва ўмоўлены час аказацца ў гэтай царкве. Хацеў бы ён аказацца ў жывых, але няхай хаця б мёртвы стрымае рыцар сваё слова”. – “Праз гэтую ўмову мы з маім найлюбшым таварышам ледзь не пазабівалі адзін аднаго!” – сказаў Трышчан.

І паехалі пан Трышчан з Анцалотам. І стрэла іх, несучы пісаны пану Трышчану ліст, нейкая дзяўчына. Яна аддала Трышчану ліст, а ён, прачытаўшы яго, рассмяяўся. “З чаго ты смяешся?” – пытаецца ў яго Анцалот. “Вось з чаго я смяюся: ездзіць дзяўчына па людзях, так кажучы: “Кож-

ныя сем гадоў пры двары караля Перамонта Францэйскага збіраецца турнай. Хто хоча ўкаранаваць сваю сястру або каралеўскую дачку – едзь не марудзячы". Мы ж не можам туды паехаць, бо моцна параненыя",– адказаў Трышчан. "Рыцар, мы можам паехаць туды, каб пабачыць, з якое краіны рыцар пераможа ў тым турнаі – дзеля таго, каб потым узяць нам дзіду ў рукі і ўздзець гелм на галаву супраць таго рыцара",– сказаў Анцалот.

І заехалі яны ў нейкае сяло, а ў тым сяле было поўна рыцараў і паняў. І ні адзін рыцар не жадаў дзеля іх пацясніцца на двары, а іх жа ўжо застала ноч. Тады пабралі яны ў рукі дзіды, хочучы праз бітву заняць двор. І паехалі з таго сяла, і ўбачылі наперадзе заможныя двары, што ўжо прыходзілі ў заняпад. А перад тымі дварамі стаяла панна з невялічкай дружынаю. "Панна, ці ёсць дзе ў цябе спыніцца?" – спытаўся ў яе Трышчан. "Магчыма",– адказала тая і ўхапіла Трышчана за руку, а другою Анцалота, і павяла іх у нейкі палац. А той палац быў вельмі хораша ўпрыгожаны. Затым пайшлі ў другі палац – ён таксама быў усярэдзіне па-гаспадарску ўпрыгожаны. "Годныя рыцары, тут вам прытулак: для вас саміх – у тым палацы, а ў іншым – для вашых коней",– сказала панна. "Які харошы прытулак для нас і для нашых коней!" – мовілі Трышчан з Анцалотам.

І прынеслі ім есці дзве птушкі – адну смажаную, а другую вароную, віно і хлябец; коням задалі аброку. "Рыцары, частуйцеся, бо трэба вам паклапаціцца пра мяне і пра сябе",– сказала рыцарам панна. Яны ж зажурыліся, бо яна прасіла іх абраць сабе каралеву; а яны ж былі параненыя.

"Панна, не дзівіся з таго, пра што я пытацьму",– мовіць Трышчан. – "Рыцар, тут такі звычай, таму няма дзіва з таго, пра што спытае рыцар. Бо каб ведаў, то і не пытаўся б",– адказвае тая. "Гэта добры звычай. Прашу цябе, скажы мне, што гэта за птушачкі?" – пытаецца Трышчан. "Гэта два галубы. А я – дачка аднаго караля, які ваяваў з каралём Перамонтам, і Перамонт яго перамог, забраў зямлю і павыганяў усіх ягоных слугаў. Толькі мяне пакінуў яму з гэтымі двума галубамі. І я як магла карміла бацьку свайго: што заб'ю на абед – таго хапала і на вячэру, а што было на вячэру – таго хапала і на сняданак",– адказвае тая. "Панна, будзе табе вялікая нявыкрутка, калі ты забіла для нас тое, чым мелася пакарміць свайго бацьку",– кажа ёй пан Трышчан. "Рыцары, я не шкадую пра тое, што забіла двух галубоў для двух сокалаў, бо бачу, што вы харошыя сабою і прыгожыя абліччам. Рыцары, вам думаць пра мяне і пра сябе".

А назаўтра паехалі адтуль, не гаворачы між сабою. "Рыцар, пра што думаеш, што не гаворыш са мною?" – "А ты пра што думаеш?" – пытаецца Трышчан. "Але ж ты старшы, я павінен у вас пытацца",– кажа Анцалот Трышчану. "Я думаю, як нам тую панну зрабіць каралеваю",– адказаў Трышчан. "О годны рыцар Трышчан, хай жа Бог вам заплоціць, што за ейную пачцівасць думаеш ты пра пачэснасць тае панны! У нас абодвух адна думка".

І вярнуліся яны да тае панны. "Панна, убірайся і ўпрыгож сябе як мага – дасць Бог, станеш сёння каралеваю",– кажа ёй Трышчан. "Рыцар, ды ўспаможа мне Бог, не маю больш убораў, акрамя таго, што на мне, ды яшчэ вянка з цудоўных кветак кіпарысу, які прывезены мне з двара караля Артыюша",– адказвае панна. А затым бярэ вяночак і ўскладвае сабе на галаву. "Да твару табе гэты вянок",– сказалі рыцары.

Затым выправіліся яны з паннаю на той турнай. І дагналі рыцара, які ехаў у панцыры; а за ім везлі ўвабраную ў вельмі дарагія шаты панну. "Што гэта за рыцар?" – спытаўся Трышчан у слугаў. "Гэта рыцар Амадор, слуга пана Анцалота, дадзены яму слаўным рыцарам Трышчанам",– адказала панна. "Далібог,– сказаў Трышчан,– Трышчан і Анцалот зараз тут". Пачуўшы гэта, скочыў Амадор з каня, скінуў гелм з галавы, укленчыў перад імі і спытаўся: "Панове, куды вы едзеце?" – "Едзем на турнай да вашага пана караля Перамонта, бо хочам нашу сястру зрабіць каралеваю",– адказвае Трышчан.

"Дзеля Бога, вярніцеся, каб мог я зрабіць каралеваю сваю сястру. Я ведаю, што вы не маеце сястры",– сказаў ім Амадор. "Рыцар, ніхто яшчэ не разварочваў нас дзідаю, і просьбаю ніхто нас не зможа спыніць",– адказаў Трышчан. "Я ведаю, што пан Трышчан умее абыходзіцца з мячом на зямлі, а не толькі з дзідаю на кані. Я мушу вярнуцца",– сказаў Амадор. "Амадор, мы былі б табе ўдзячныя, каб ты паехаў з намі. Але, калі вырашыў вярнуцца, пазыч нам убору сваёй панны: наша панна не мае харошага ўбору",– папрасіў Трышчан. "Пане, бяры, што табе патрэбна",– сказаў Амадор.

Узяў пан Трышчан тыя строі, у якіх Амадорава сястра хацела зрабіцца каралеваю, і сказаў сваёй панне: "Убярыся ў шаты". Калі ж яны ўбачылі яе ў строі, вельмі ім спадабалася: нават калі б яна была іхняю сястрою, не пасаромеліся б яе. "Рыцар, дай мне адзін дар, пра які я ў цябе папрашу",– кажа Анцалот Трышчану. "Усё вольны ты атрымаць ад мяне, акрамя Іжоты",– адказвае Трышчан. "Будзь на сёння маім панам, а я буду тваім зброяносцам",– кажа Анцалот. "Кінь гэта, рыцару! Ты старшы і большы рыцар, чым я,– ты будзь маім панам, а я буду тваім зброяносцам",– адказвае Трышчан. "Не бываць таму",– мовіў Анцалот.

А быў у тым турнаі звычай: калі які рыцар прыедзе пасля пачатку турнаю, ён павінен пасадзіць сваю панну на ніжэйшае месца.

Пад'ехалі яны да варотаў таго турнаю, аж калаварот зачынены, і бітва паміж рыцарамі ўжо распачалася. Тады пераскочыў Анцалот праз калаварот і расчыніў вароты, і Трышчан з паннаю заехалі.

Аж сядзяць панны ў два шэрагі ад арэнавых варотаў да судзейскіх. Пасадзіў пан Трышчан сваю панну на самае высокае месца. Заўважыў Трышчана сын караля Перамонта і падумаў: “Хацеў бы я, каб панна гэтага рыцара была каралеваю”. Калі ж убачыла гэтую панну каралеўская дачка, то расхацелася ёй, каб ейны рыцар перамог у турнаі. І дзівячыся, усе казалі: “Гэта настырны рыцар: спазніўся на турнай і пасадзіў сваю панну вышэй за астатніх!”

“Дай мне гэты вянок”,– кажа Трышчан сваёй панне. Тая ўскочыла, зняла з сябе вянок, усклала яго сваімі белымі рукамі на светлы Трышчанаў гелм і сказала: “Годны рыцар, з гонарам насі яго на турнаі і, абараніўшы мяне, затым вярні яго”. Іншыя ж панны смяяліся з яе, кажучы: “О неразумная дзяўчына, як можна, не ў стане абараніць, вярнуць гэты цудоўны вянок?! Калі ён сядзе на каня, ягоны бледны твар і светлы гелм нашыя рыцары змяшаюць з пылам!”

Пачуў тое рыцар Дыўдан, які дзяўчынам быў удзячны больш, чым рыцарам, і захацелася яму сутыкнуцца з Трышчанам. Пан Трышчан скочыў на каня, а Анцалот стаў пры стрэмені. “Рыцар, сцеражыся майго ўдару!” – усклікнуў рыцар Дыўдан. “Як хочаш, то атрымаеш”,– адказаў Трышчан.

Бітва Трышчана з Дыўданам І як сутыкнуліся, упаў Дыўдан на адзін бок, а конь ягоны – на другі. І глядзелі панны, што ж адбудзецца паміж імі. Але не заўважылі, каб хоць нага Трышчанава зварухнулася ў стрэмені, не тое што каб сядло зрушылася.

Наляцеў Анцалот на Дыўдана і шпурнуў яго праз арэну, і мовіць: “Кажу да кожнага рыцара: мой пан вольна ездзіць па турнаю”. Убачыўшы гэта, павесялела іхняя панна і пачала смялей паглядаць на іншых паннаў. Бачылі рыцары, што былі там, як смела ездзіць Трышчан па турнаю, і баяліся ягонага ўдару. А Трышчан, раз’язджаючы, наносіў жорсткія ўдары направа і налева: да якога рыцара ні пад’ехаў – той апынуўся за канём. Анцалот жа хапаў іх і выкідваў з арэны; ды яшчэ прыгаворваў пры тым: “Рыцары, пан мой вольна ездзіць па турнаю”. І кажуць суддзі: “У турнаі перамагае той рыцар, пры якім ходзіць добры зброяносца”. А быў там адзін дужа стары кароль, і кажа ён: “Не такі, а той рыцар, які вольна ездзіць па турнаю”.

А вольна па турнаю раз’язджаў толькі Яшчор Мадэрым, брат Анцалотаў, сын Дамалота, караля Локвенскага. “Дзе розум, там і моц”,– сказала Трышчанава дзяўчына. І зноў кажуць суддзі: “Перамагае той рыцар, пры якім ходзіць добры зброяносец. Не дзіва, што рыцар выконвае рыцарскі абавязак, бо ён жа рыцар; але дзіва, што выяўляе вялікае рыцарства ягоны зброяносец – шпурляе праз арэну рыцараў у панцырах”. (А кароль вырашыў, што гэты рыцар перамагае, бо вольна раз’язджае па турнаю.) І кажа Трышчанава панна: “Ох, мой любы Божа, добры звычай у нашым краі: не дазволяць добрыя людзі размаўляць з сабою блазну, дадуць яму дуду – няхай іх пацяшае”.

Пачуў пан Трышчан, пра што гавораць суддзі, пачуў смелыя словы сваёй панны, ды кажа: “Рыцар, які вольна ездзіш па турнаю, сцеражыся майго ўдару!” – “Наблізься, і ўбачыш!” – адказаў Яшчор.

Бітва Трышчана з Яшчорам І калі сутыкнуліся яны, паляцеў Яшчор на адзін бок, а конь ягоны – на другі. “Ох, браце майго найлюбшага таварыша, не хацелася мне, каб сталася гэткае з табою! Але ж ты выбіты не якім іншым рыцарам, а Трышчанам, або панам Анцалотам”.

Ускочыў Яшчор на каня і далучыўся да іх. І раз’ехаліся тры гэтыя рыцары – Трышчан, Анцалот і Яшчор – па турнаю накрыж. І не магло быць ім раўні. Калі які рыцар бачыў іх трох – кідаў дзіду з рук і зрываў гелм з галавы і не хацеў з імі біцца.

“Мы, Трышчан і Анцалот, даем рыцарскае слова: пакуль не ўпадуць пад намі коні, не злезем з коней, каб дачакацца рыцара, які ехацьме здалёк і не паспее ў турнай”,– сказаў Трышчан. Убачыў тут Анцалот нейкага зёлачніка – а той нёс зёлкі – і кажа Трышчану: “Рыцару, вось едзе рыцарскім звычаем рыцар: конь ягоны б’е капытом, твой жа стаміўся”. І так хутка павярнуўся Анцалот, што аж конь ягоны паваліўся. А зрабіў Анцалот гэта дзеля таго, каб стрымаць слова рыцара.

“О годная панна, цяпер ты каралева ўсіх паннаў, якія смяяліся з нас – ты вольная адправіць кожную з іх куды пажадаеш”,– кажа пан Трышчан сваёй панне. І ўсклікнуў пан Трышчан, каб пачуў увесь турнай: “Панна, пасадзі на руку ястраба ды падыдзі й сядзь у пазалочанае крэсельца!” Тая села і была каранаваная на каралеву. А кароль Перамонт, які забраў у бацькі гэтае дзяўчыны маёмасць, вярнуў яму ўсё да рэшты, бо ўзяў тую панну за жонку свайму сыну.

Выявіўшы такое рыцарства, два гэтыя рыцары, пан Трышчан і пан Анцалот, паехалі праз чыстыя дубровы і выехалі да нейкага вельмі вялікага горада – вельмі багатага ў параўнанні з іншымі гарадамі. А была гэта бацькаўшчына трох братоў, дужых рыцараў, што да гэтага часу лічыліся самымі дужымі на зямлі рыцарамі. Імёны іхнія – Лібрун, Ігрун і Марк. Два з іх памерлі, а Лібрун быў жывы і трымаў той горад. А назва таму гораду – Кесарыя. І быў той горад вельмі даўні.

А калі гэтаму рыцару Лібруну споўнілася сорак гадоў, пакінуў ён праз старасць каня і прысланіў дзіду, і павесіў зброю. І абрасла дзіда імхом. А была ў Лібруна вельмі прыгожая жонка, імя якой было Цвітажыя.

Спыніліся Трышчан з Анцалотам пад горадам і паслалі да тае Лібрунавай пані перадаць: “Выйдзі з замка – адзін з нас мецьме з табою каханне”. Моцна засмуцілася з таго тая пані і пайшла да Лібруна; і гаворыць: “Прычакалі мы суму й ня-

шчасця: прыехалі два рыцары і спыніліся пад горадам, і шлюць да мяне са словамі: “Выйдзі з горада – адзін з нас мецьме з табою каханне!”. Паслаў да іх рыцар Лібрун перадаць: “Рыцары, паедзьце з Богам!” Але ж тыя не ўняліся – паслалі да пані зноў, загадваючы: “Выйдзі з замка!” Пасля гэтага паслаў да іх Лібрун перадаць: “Рыцары, паедзьце з Богам!” Яны ж зноў паслалі да пані.

“Дайце мне панцыр, дзіду і каня”,– кажа тут рыцар Лібрун. Узяў ён дзіду – аж яна абрасла імхом; і абвілі яе ручнікамі. Увабраўся Лібрун у панцыр, сеў на каня і выехаў у поле, да тых рыцараў. “Уцякайце, рыцары!” – крыкнуў ім Лібрун. Яны ж дамаўляліся паміж сабою: “Хто першы будзе біцца?” І захацеў Анцалот. “Клянуся, што не буду біцца з адным рыцарам, толькі з абодвума, бо я – першы сярод рыцараў!” – усклікнуў Лібрун.

Бітва Лібруна з Трышчанам і Анцалотам І кінуліся яны абодва разам на Лібруна, і абодва ўдарылі проста ў яго – аж паламалі дзіды на колькі кавалкаў. А Лібрун схапіў іх з коней – аднаго адною рукою, а другога другою – і паклаў іх перад сабою мітус на коней. Патрапаў Лібрун кожнага з іх па сківіцы і сказаў: “Паедзьце з Богам, вы абодва годныя рыцары”.

І паехалі яны, з аднаго боку сумуючы, а з другога – смеючыся. І ехалі праз дубровы, і напаткалі нейкага рыцара – а той едзе вельмі хораша. І сказалі яму: “Рыцар, не едзь, не біўшыся з намі”. – “Я не ўмею біцца”,– адказаў той. “Тады забярэм вашага каня”,– сказалі яны. “Але ж я не ўмею біцца”,– адказаў рыцар. І адабралі ў яго кяня і зброю. Тады й кажа рыцар: “Калі не можна інакш, дайце мне каня і зброю!”

Бітва Трышчана і Анцалота з Гальцам І сеў на каня. Сунуўся супраць яго Анцалот – ён збіў Анцалота. І вельмі шкада было таго Трышчану.

Імкліва наляцеў на яго Трышчан. Калі ж яны сутыкнуліся, абарваліся падпругі ў Трышчанавым сядле, і паляцеў ён на зямлю і, падаючы, выхапіў з похваў меч і стаў на ногі, як і не варухнуўся.

Пазнаў рыцар моцна ўзлаванага Трышчана і закрычаў: “Я – Галец Анцалотавіч!” І Трышчан, і Анцалот вельмі ўсцешыліся з таго. А Галец моцна засмуціўся, што адолеў свайго бацьку і Трышчана. І праз той вялікі смутак пастрыгся ён у манахі, і пасля не чулі мы пра яго аніякае весткі – ці жыве ён, ці памёр.

А Трышчан з Анцалотам паехалі да двара караля Артыюша, а як прыехалі, прыняў іх кароль з вялікаю радасцю. А потым папрасіў пан Трышчан у караля Артыюша прабачэння і з вялікай пышнасцю і вялікімі дарамі праводзіў яго кароль. І ўсе паны і добрыя людзі шляхетна адпраўлялі яго з пажаданнямі.

Трышчан з Іжотаю паехалі ў Карнаваль, да караля Марка. Калі ж прыехалі, аддаў Трышчан Іжоту каралю Марку і мовіў: “Кароль, ты павінен дзякаваць мне, што другі раз мячом здабыў яе для цябе”. Дзякаваў яму кароль Марк, кажучы: “Любы мой сястрынец Трышчан! Шмат добрага ты зрабіў. І я твой, і ўсё, што я маю,– тваё! Хай будзе так, як ты хочаш”. Укленчыў Трышчан і ўзнёс Богу хвалу, а потым з вялікай пакораю падзякаваў каралю Марку.

Сышлася тут разам уся Карнаваль. І не было ні старога, ні маладога, які б не граў і не таньчыў і не весяліўся. І так усе былі радыя, як быццам сам Бог да іх зышоў, бо так весяліліся – лепш, як тады, калі Трышчан першы раз прывёз Іжоту з Арляндэі.

Даведаўшыся пра вернасць і адданасць Брагіні, палюбіла яе Іжота больш, як раней. І кароль, і ўвесь двор ягоны вельмі цешыліся з таго.

Уручыў кароль Трышчану ключы ад свайго каралеўства і мовіў: “Сястрынец, ты вольны над маім каралеўствам, бо я ўбачыў тваю вернасць, бо ты засведчыў мне сваю вернасць і чэснасць”. І частаваў тут кароль Марк Трышчана; і ўсе добрыя людзі частавалі яго так, як і сам кароль. І так узвялічылася Карнаваль, што праз пана Трышчана баяліся яе ва ўсіх землях і ва ўсіх каралеўствах.

І сталася ў той час вядома, што збіраецца турнай у Пазаранскай зямлі пад горадам Барохам. Склікала яго адна панна па імені Іжота З Белымі Рукамі, дачка аднаго караля. Паехаў у той турнай і пан Трышчан.

Прыехалі ў турнай і ён; і мноства рыцараў з многіх земляў. Заняў тут нейкі рыцар адзін бок турнаю, а пан Трышчан – другі. І крыкнуў пан Трышчан рыцару Ільвінага Сцяга ў самыя зубы: “Біся са мною!”

Бітва Трышчана з Клімберкам І ўдарыліся так моцна і жорстка, што зламаў Клімберка сваю дзіду на некалькі частак. Ударыў яго Трышчан з усяе моцы, што меў у сабе – і Клімберка ўпаў з каня на зямлю, а Трышчан падскочыў да яго. “Рыцар, ты перамог у гэтай бітве!” – усклікнуў Клімберка.

Ускочыў Трышчан на каня і паехаў па турнаю, чынячы направа і налева вялікі цуд. І ніхто не адважыўся прычакаць яго, бо ён перамог пятнаццацёх пасвечаных рыцараў і васямнаццацёх банаў.

І крыкнуў Трышчан: “Калі яшчэ хто жадае, хай рыхтуецца да бітвы!” І азваўся адзін рыцар, вялікі годнасцю сваёй, па імені Ярдын, брат тае Іжоты, у якое былі белыя рукі: “Рыцар, чакай мяне!” Трышчан і яго дачакаўся.

Бітва Трышчана з Ярдынам Сутыкнуўшыся, паламалі яны дзіды і ўдарыліся тарчамі й плячыма, і абодва пападалі з коньмі. Падхапіўшыся, пачалі яны рубацца, як два ільвы. Вялікую адвагу выявіў Трышчан, нягледзячы на тое, што ад мноства ўдараў адкрыліся ў яго раны. Аднак жа не дбаў ён на тое. Аж нарэшце рубануў Трышчан Ярдына што моцы, і ўпаў Ярдын нежывы.

Выявіўшы тое рыцарства, паехаў годны рыцар пан Трышчан да царквы, у абацтва.

А ў гэты час прыйшоў яму ліст ад пекнае Іжоты, у якім тая пісала: “Пане, як рыба без вады

жывой быць не можа, так і я без цябе жыць не магу!” І самлеў Трышчан ад вялікага суму і ранаў. Дзіва было, як зносіў ён такія раны, бо моцна сыходзіў крывёю.

І паслаў Трышчан ліст да караля Марка: “Пане дзядзька, не магу ні ехаць, ні стрываць, каб мяне неслі! Паколькі служыў я вам добра, то яшчэ можа быць вам ува мне патрэба. Таму прышлі да мяне каралеву Іжоту, каб мяне ацаліла, бо яна добра знаецца на лекаванні. А я ляжу ў Пазаранскай зямлі пад горадам Барохам”.

З удзячнасцю адпусціў кароль Марк Іжоту, і паехала яна з вялікай радасцю ў сэрцы. А прыехаўшы, пачала лекаваць Трышчана, як толькі ўмела. І не ведаю, ці ачуняў ён ад тых ранаў, ці так памёр. Дагэтуль пра яго напісана.